Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

26 САКАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 56
(26414)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«УЛАСНАЕ ЖАДАННЕ» — БЕЗ АПЛАТЫ

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі распрацавала рэкамендацыі прафкамам па дзеяннях ва ўмовах пагаршэння фінансава-эканамічнага становішча арганізацый. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар ФПБ Вольга ЗУЁНАК.

У прыватнасці, у Федэрацыі прафсаюзаў мяркуюць: нягледзячы на магчымае пагаршэнне стану арганізацый, не варта ісці на перагляд зместу ранейшых калектыўных дагавораў, а таксама дапускаць зніжэння планкі гарантый у калдагаворах, якія заключаюцца зараз.

Пры гэтым прафкамам прапануецца дамагацца ўключэння ў калектыўныя дагаворы асобных палажэнняў аб памеры зарплаты, якая захоўваецца на перыяд часовага спынення работы арганізацыі. Да прыкладу, гаворка можа ісці аб выплатах у памеры бюджэту пражыткавага мінімуму ці мінімальнай зарплаты, аднак не ніжэй за 2/3 ад тарыфнай стаўкі ці акладу. Адначасова ФПБ лічыць неабходным заклікаць непасрэдна саміх работнікаў устрымацца ад падачы заяў са згодай пайсці ў водпуск без захавання зарплаты. Ісці на такі крок без згоды работніка наймальнік не мае права.

Не менш адметны момант — рэкамендацыі прадугледзець абмежаванні па часовым спыненні работы, скажам, вызначыць няпоўны працоўны дзень працягласцю не менш за 4 гадзіны, а няпоўны працоўны тыдзень — працягласцю не менш за 20 гадзін на тэрмін не больш за 6 месяцаў на працягу года. Плюс да таго прафсаюзы лічаць: нельга дапускаць пераводу на скарочаны рэжым адначасова мужа і жонкі, а таксама работніка, які мае на ўтрыманні непрацаздольных членаў сям'і і з'яўляецца іх адзіным карміцелем.

Асобная гаворка аб сітуацыі, калі прадпрыемства ўсё ж наважваецца на скарачэнне. На думку ФПБ, перш чым прыняць такое рашэнне, неабходна ліквідаваць усе вакансіі, выкарыстаць звальненні па ўласным жаданні, выхады на пенсію, магчымасці пераводу работнікаў на іншыя месцы «ўнутры» арганізацыі і ў яе філіялах, прадумаць варыянты стварэння працоўных месцаў, абмежаваць або цалкам забараніць звышурочныя работы, абмежаваць колькасць часовых работнікаў, прыпыніць прыём новых людзей, пашырыць выпуск тавараў народнага спажывання і аказанне паслуг, скараціць адміністрацыйна-кіраўніцкія выдаткі, правесці перанавучанне работнікаў іншым спецыяльнасцям, актуальным для гэтага суб'екта гаспадарання, галіны або рэгіёна.

Калі ж усе магчымыя меры вычарпаныя, і наймальнік на скарачэнне персаналу ўсё ж ідзе, ФПБ лічыць, што кожная кандыдатура на звальненне павінна разглядацца персанальна і абавязкова — з удзелам прафкама. Прычым Федэрацыя прафсаюзаў рэкамендуе прадугледзець у калектыўных дагаворах дадатковыя гарантыі па захаванні працоўных месцаў цяжарным жанчынам, жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, работнікам, што атрымалі працоўнае калецтва або прафесійнае захворванне, адзінокім маці і бацькам, якія маюць няпоўнагадовых або непрацаздольных дзяцей, сем'ям з двума і больш утрыманцамі, жанчынам, мужы якіх прызваныя на тэрміновую службу ў армію, работнікам з працяглым стажам у арганізацыі, двум работнікам з адной сям'і, а таксама работнікам, якія выбраныя ў прафкамы.

Апроч таго, ФПБ раіць прафкамам кантраляваць падачу паведамленняў аб скарачэнні ў службы занятасці і пазначэнне ў гэтых паведамленнях прафесій, спецыяльнасцяў, кваліфікацыі і памераў зарплаты супрацоўнікаў, якія будуць звольненыя. У Федэрацыі нагадваюць: паводле заканадаўства ў выпадку масавага вызвалення работнікаў і цяжкасцяў з іх наступным працаўладкаваннем рашэнне аб скарачэнні можа перапыняцца на тэрмін да 6 месяцаў або скарачэнне можа праводзіцца паэтапна на працягу года з фінансаваннем гэтых мерапрыемстваў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і сродкаў садзейнічання занятасці. Нарэшце, у выпадку вызвалення ФПБ рэкамендуе таксама вызначыць у калектыўных дагаворах дадатковыя сацыяльныя гарантыі для работнікаў рэальнага сектара. Сярод прапаноў — магчымасць вяртання работніка на ранейшае месца пры з'яўленні ў арганізацыі вакансіі па адпаведнай спецыяльнасці, захаванне да працаўладкавання на новым месцы чаргі на жыллё і жылплошчы ў інтэрнаце, выдача аднаразовай матэрыяльнай дапамогі і выплата работнікам 25-працэнтнай прыбаўкі да дапамогі па беспрацоўі на працягу 6 месяцаў.

Сяргей ГРЫБ.

Кантракт або бестэрміновы дагавор?

Федэрацыя прафсаюзаў настойвае на тым, каб з чалавекам, які адпрацаваў па кантракце 5 гадоў і пры гэтым не меў дысцыплінарных спагнанняў, мог заключацца або новы кантракт, або бестэрміновы працоўны дагавор на яго выбар. Пра гэта заявіў старшыня ФПБ Леанід Козік.

Як адзначыў старшыня ФПБ, за апошні час удалося дасягнуць многага ва ўдасканаленні кантрактнай формы найму. У заканадаўстве з'явіліся дадатковыя гарантыі для асобаў перадпенсійнага ўзросту, вызначана, што наймальнік абавязаны працягваць кантракты з маці або бацькам да часу, пакуль дзіця не дасягне 5-гадовага ўзросту. Павялічыўся і сам сярэдні тэрмін кантрактаў — як правіла, раней яны заключаліся толькі на год. Прычым Леанід Козік лічыць, што сама па сабе сістэма кантрактаў не нясе пагрозы прафсаюзнаму руху. Аднак разам з тым прафсаюзы мяркуюць, што надалей гэту форму найму трэба захаваць толькі для некаторых катэгорый работнікаў — да прыкладу, дзяржслужачых, вайскоўцаў, супрацоўнікаў міліцыі.

Адначасова застаецца актуальнай тэма парушэння заканадаўства, і асабліва ў прыватным сектары эканомікі. Як зазначыў Леанід Козік, тут сустракаюцца выпадкі, калі кантракт з работнікам заключаецца тэрмінам на месяц і пры гэтым увогуле не прадугледжваецца ніякіх мераў матэрыяльнага стымулявання.

Сяргей ГРЫБ.

15 гадоў таму «Звязда» стала сведкай масштабнай акцыі па захаванні папуляцыі белавежскіх зуброў. Больш за тое, была непасрэднай удзельніцай перасялення групы рэліктавых жывёл у Валожынскі лясгас. Журналісты «Звязды» суправаджалі «рагаты рэйс» працягласцю амаль у 300 кіламетраў і назіралі, як зуброў у спецыяльных скрынях-кантэйнерах аўтакранам грузілі на кузавы «мазаў», як выпускалі потым у лес за вёскай Рум. Па сутнасці гэта было вяртанне зуброў на сваю спрадвечную радзіму — у Налібоцкую пушчу. Падзея была незвычайнай, бо ўпершыню лясгас браў на сябе гістарычны абавязак па захаванні суветнай спадчыны. Які працяг у гэтай прыродаахоўнай акцыі і як складваўся далейшы лёс незвычайных перасяленцаў? Адным з першых егераў, прызначаных даглядаць за зубрамі-навасёламі, быў **Юрый РУДОВІЧ** *(на фотаздымку).* Пятнаццаць экзатычных жывёлін трэба было адаптаваць да новых умоў у невялікім вальеры пад хвоямі, «падрыхтаваць да самастойнага жыцця». Егерскія клопаты не былі дарэмнымі. За паўтара дзясятка гадоў зубрыная сям'я павялічылася ў шмат разоў і рассялілася па розных куточках Налібоччыны. Юрый Рудовіч па-ранейшаму з'яўляецца старшым егерам лясгаса і адказным за зубрагадавальнік за вёскай Рум. Як і раней, у зімовы час гэты спецыяліст напаўняе кармушкі духмяным сенам, назірае за паводзінамі жывёл, сочыць за іхнім выглядам і станам. І як узнагарода — жывёлы, пачуўшы прыезд свайго апекуна, спяшаюцца на смачную пляцоўку.

У сённяшнім нумары «Звязды» яшчэ адзін непасрэдны ўдзельнік незвычайнага перасялення дзеліцца сваімі назіраннямі. Чытайце пра гэта на старонцы 6.

РАДАВОД НАЛІБОЦКІХ ЗУБРОЎ

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандр Лукашэнка і Патрыярх Кірыл пагутарылі ў нефармальнай абстаноўцы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які знаходзіцца з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі, 25 сакавіка ў Сочы сустрэўся са Святейшым Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам.

Размова праходзіла ў нефармальнай абстаноўцы. Бакі абмяняліся думкамі па пытаннях, якія маюць узаемную цікавасць для свецкай і духоўнай уладаў. Прэзідэнт Беларусі і Святейшы Патрыярх дамовіліся правесці ў бліжэйшы час афіцыйную сустрэчу. Нагадаем, што некалькі дзён таму Патрыярх Кірыл паведаміў аб сваім намеры ў бліжэйшы час наведаць з пастарскім візітам Мінск.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прамыя лініі

АНКАЎРАЛОГІЯ І АНКАГІНЕКАЛОГІЯ

Дыягностыка і лячэнне анкалагічных захворванняў, у прыватнасці, анкаўралагічных (прастата, мачавы пузыр, ныркі) і анкагінекалагічных (рэпрадуктыўная сістэма жанчын) будуць у цэнтры ўвагі нашай чарговай «прамой лініі» па медыцынскай тэматыцы. На вашы пытанні адкажуць спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава — **намеснік дырэктара па навуковай працы, доктар медыцынскіх навук Сяргей Анатольевіч КРАСНЫ** і **загадчыца аддзела анкагінекалогіі, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА.** «Прамая лінія» адбудзецца 30 сакавіка, у панядзелак, з 14.00 да 15.00 па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

УСЁ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

Размеркаванне — не менш адказны час у жыцці маладых людзей, чым прыёмная кампанія. Ці абавязана камісія па размеркаванні задавальняць персанальныя заяўкі арганізацый на выпускнікоў? Ці павінна брацца пад увагу сямейнае становішча выпускніка? Якія прывілеі дае выпускнікам статус маладога спецыяліста? Якія могуць быць падставы для пераразмеркавання? Ці можна апратэставаць вынікі размеркавання? Як размяркоўваюцца выпускнікі магістратуры? На ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе завочную «прамую» лінію.

З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТРАГЕДЫЯ НА ДАРОЗЕ: ТРОЕ ЗАГІНУЛЫХ, ШЭСЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫХ

Буйное дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі трое пасажыраў мікрааўтобуса, каля адзінаццаці гадзін вечара ў аўторак адбылося ў Івацэвіцкім раёне.

Паводле звестак УДАІ МУС Беларусі, трагедыя здарылася на дарозе паблізу пасёлка Нехачава, дзе 25-гадовы жыхар Талачына, які кіраваў мікрааўтобусам «Фольксваген» і рухаўся ў напрамку на Брэст, не змог размінуцца з аўтамабілем «ЗіЛ». Апошняя машына, дарэчы, стаяла на ўзбочыне з уключанымі аварыйнай сігналізацыяй і габарытнымі агнямі. На жаль, гэтае сутыкненне стала фатальным для трох грамадзян Украіны, якія знаходзіліся ў мікрааўтобусе, — яны загінулі. Яшчэ пяцёра ўкраінцаў разам з кіроўцам мікрааўтобуса з цялеснымі пашкоджаннямі былі змешчаны ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

КАЗАХСТАН—БЕЛАРУСЬ — У ПРАМЫМ ЭФІРЫ

Адборачны матч чэмпіянату свету па футболе паміж зборнымі Беларусі і Казахстана пакажа Першы нацыянальны тэлеканал. Аб гэтым паведамілі ў галоўнай дырэкцыі спартыўнага вяшчання Белтэлерадыёкампаніі.

Беларускія аматары спорту змогуць убачыць гэту гульню 1 красавіка ў прамой трансляцыі, пачынаючы з 17.25. Для абедзвюх камандаў вынік гэтага паядынку мае вельмі вялікае значэнне. Пераможца захавае шанцы на выхад у фінальную стадыю чэмпіянату свету, а каманда, якая прайграе, наўрад ці зможа прэтэндаваць на пуцёўку ў ПАР.

БЕЛТА.

МАНЕТЫ ПАПОЎНІЛІСЯ «БЛІЗНЯТАМІ»

Нацыянальны банк Беларусі з сённяшняга дня ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Блізняты» серыі «Знакі задыяка», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Сярэбраная манета выпушчана наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 г, медна-нікелевая — наміналам 1 рубель.

Манеты адчаканены на АТ «Манетны двор Польшчы»: сярэбраная — якасцю «анцыркулейтэд, аксідзіраваная», медна-нікелевая — якасцю «брыльянт-анцыркулейтэд». Тыраж першай манеты — да 25000 штук, медна-нікелевай — 10000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

СМЕРЦЬ ПАД БЕРВЯНОМ І СТРАЛОЙ

На піларараме, якая знаходзіцца ў в. Сялец Бярозаўскага раёна, ішла разгрузка драўніны з аўтамашыны «ЗіЛ». Адно бервяно ўпала з прычэпа і смяротна параніла 52-гадовага мужчыну.

У гэты ж дзень 24 сакавіка ў Пінску загінуў кранаўшчык БМУ. На будаўнічай пляцоўцы па вул. Брэсцкай рамантавалі вежавы кран. Страла нечакана ўпала на чалавека і смяротна траўмавала яго.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАТРЫМАЛІ П'ЯНАГА МАТАЦЫКЛІСТА-БРАКАНЬЕРА

У пойме Ясельды супрацоўнікі Пінскай міжрайінспекцыі спынілі для праверкі матацыкліста.

Па-першае, высветлілася, што кіроўца быў «пад мухай», па-другое, у яго былі знойдзены сеткі. Далей — больш: затрыманы грамадзянін паводзіў сябе задзірліва, правакаваў дзяржінспектараў на супрацьзаконныя дзеянні, ад дачы тлумачэнняў і подпісаў адмовіўся, брыдкасловіў, спрабаваў уцячы. Для высвятлення асобы парушальнік быў дастаўлены ў Іванаўскі РАУС, дзе ў дачыненні да яго былі складзены тры адміністрацыйныя пратаколы: за кіраванне транспартным сродкам без дакументаў і ў стане алкагольнагаап'янення, а таксама за парушэнне Правілаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

І БЕТОНАЗМЯШАЛЬНІК — ТАКСАМА

Калі работнікі адной з арганізацый Рагачоўскага раёна раніцай з'явіліся на працу, то выявілі прапажу зварачнага апарата, перфаратара і шліфавальнай машынкі. Прыназіраўшы ахову з тэрыторыі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белшклапрам» знік бетоназмяшальнік. Дарэчы, кошт яго — 739 тысяч рублёў з хвосцікам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

БЕРАЖЫ МАШЫНУ ЗНОВУ, А ПРАВІЛЫ ВУЧЫ ЗМОЛАДУ

Даўжэзныя чэргі ў аўташколах, да бессаромнага запруджаныя машынамі двары і працяглыя заторы на дарогах — найлепшыя сведчанні таго, што чатырохколыя бегуны для беларусаў нарэшце сталі не раскошай, а сродкам перамяшчэння. Праблемы з паркоўкамі, зручнымі развязкамі, а галоўнае, бяспекай руху набываюць пры гэтым нябачаныя дасюль маштабы. Іх прававыя, экалагічныя, медыцынскія, выхаваўчыя ды іншыя аспекты абмяркоўвалі ўчора ў верхняй палаце парламента прадстаўнікі зацікаўленых структур. Ініцыятары «круглага стала» — пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні на чале з Генадзем НАВІЦКІМ. Якія пытанні апынуліся ў цэнтры ўвагі?

— Кожныя суткі ў выніку ДТЗ мы губляем да пяці чалавек, і каля 20 атрымліваюць раненні — падкрэсліў **міністр унутраных спраў Уладзімір НАВУМАЎ.** Рызыка стаць удзельнікам дарожна-транспартнага здарэння і загінуць у ім у жыхара Беларусі амаль у тры разы вышэйшая, чым у жыхара Швецыі. Апошнія гады дарожна-транспартны траўматызм увахо-дзіць у першую тройку прычын гібелі людзей у рэспубліцы па прычынах некрымінальнага характару. На цяперашні момант зарэгістравана больш за 3 млн механічных транспартных сродкаў. Колькасць аўтамабіляў у асабістым карыстанні перавышае 2,3 млн адзінак. На чатырох жыхароў рэспублікі прыпадае сёння адзін аўтамабіль, а ў горадзе Мінску — на трох.

Ёсць кірунак, які дазваляе істотна зменшыць колькасць загінулых і без укладання бюджэтных сродкаў. «Для гэтага дастаткова было ўсім кіроўцам летась сесці за руль аўтамабіля ў цвярозым стане, і 271 чалавек застаўся б жывы. Без рубля інвестыцый — амаль тры праграмы «мінус 100». Пазіцыя міністэрства ў тым, каб узмацніць ступень крымінальнай адказнасці за такія парушэнні.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Пазбаўленне волі перастала пераважаць у сістэме крымінальных пакаранняў

Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні Вярхоўнага суда Беларусі Валерый КАЛІНКОВІЧ.

Ён падкрэсліў, што Вярхоўны суд адзначае нізкую эфектыўнасць такога віду пакарання, як пазбаўленне волі. «Знаходжанне асобы ў папраўчых установах становіцца школай крымінальных паводзінаў. У выніку грамадства атрымлівае чалавека са сфарміраванымі антыграмадскімі ўстаноўкамі, які з цяжкасцю адаптуецца да жыцця на волі і нярэдка ўчыняе паўторнае злачынства», — адзначыў Валерый Калінковіч.

Практычна палавіна асуджаных адбываюць пакаранне за крадзеж маёмасці. Пацярпелых ад такіх злачынстваў у першую чаргу цікавяць не найбольш суровыя пакаранні злачынца ў выглядзе пазбаўлення волі, а кампенсацыя нанесенай шкоды. Гэтага не заўсёды можна дасягнуць шляхам ізаляцыі злачынца, які павінен прымаць меры па кампенсацыі шкоды, адзначыў Валерый Калінковіч.

Акрамя таго, утрыманне большай колькасці асуджаных у папраўчых установах цяжарам кладзецца на бюджэт дзяржавы. Такое ўтрыманне складае Br15 млрд у месяц.

Тым не менш, як заявіў Валерый Калінковіч, судамі не дапускаліся і не будуць дапускацца неапраўданыя паслабленні адносна асобаў, якія ўчынілі цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы. «Эру неапраўданай міласэрнасці ніхто аб'яўляць не будзе», — сказаў ён. У 2008 годзе за цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы асуджаны 5,7 тыс. чалавек. Сярод іх амаль 600 забойцаў, больш як 1600 людзей, якія наўмысна нанеслі цяжкія цялесныя пашкоджанні, 692 гандляры наркотыкамі, 530 асабліва злосных хуліганаў, 253 гвалтаўнікі, 161 хабарнік.

На 1 студзеня гэтага года ў месцах пазбаўлення волі знаходзілася 36,7 тыс. чалавек. З іх больш як 6 тыс. адбываюць пакаранне другі раз, амаль 8 тыс. — трэці, 17 тыс. — упершыню.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЫБАЛТЫКУ ЧАКАЕ ЭКАНАМІЧНЫ КРАХ

Эканоміку краін Балтыі можа разбурыць цвёрдая прывязка нацыянальных валют да курсу еўра. Уплывовы брытанскі банк Royal Bank of Scotland прадракае ёй крах і наступную буйную дэвальвацыю мясцовых валют.

Па меркаванні банкіраў, захаванне цвёрдай прывязкі валют краін Балтыі да курсу еўра ва ўмовах цяжкага крызісу з'яўляецца «ўнікальным і экстрэмальным» феноменам, які можа выклікаць падзенне нацыянальных ВУП. Сітуацыя, якая стварэцца, можа завяршыцца небяспечным сацыяльным і палітычным крызісам, калі насельніцтва Літвы, Латвіі і Эстоніі зададзь сваім уладам пытанні адносна «кошту» падобнай палітыкі. У пачатку сакавіка кіраўніцтва Еўрасаюза адмовіла Латвіі, Літве і Эстоніі ў неадкладным прыняцці ў зону еўра, матываваўшы гэта тым, што краіны Балтыі не прайшлі пакуль што працэс падвядзення сваіх эканомік пад стандарты еўразоны.

У АФГАНІСТАНЕ ПАДАРВАЛІ АЎТОБУС

Сем чалавек загінулі і дзевяць былі параненыя ў выніку выбуху мікрааўтобуса на ўсходзе Афганістана ў правінцыі Хост.

Бомба была закладзеная каля дарогі. Загінулыя і параненыя — мірныя жыхары. Сярод загінулых — адна жанчына. Па словах прадстаўніка міністэрства ўнутраных спраў, выбуховае прыстасаванне было самаробным. Правінцыя Хост знаходзіцца на мяжы з Пакістанам, і ў гэтым раёне часта адбываюцца сутыкненні паміж баявікамі і амерыканскімі войскамі.

«НАТА, ГОЎ ХОЎМ!»

У порт Севастопаля зайшоў фрэгат ЗША Klakring, які жыхары горада сустрэлі масавай акцыяй пратэсту.

На прычале Графскай прыстані сабралася каля 500 праціўнікаў уступлення Украіны ў Паўночнаатлантычны альянс. Яны выстаўлялі лозунгі «НАТА, гоў хоўм», у бок судна ляцелі паветраныя шары з надпісам «НАТА — не». Падчас заходу карабля ў порт паміж фрэгатам і прыстанню пастаянна курсіраваў катэр з украінскімі спецназаўцамі, якія наставілі зброю на людзей. Па іх словах, гэта рабілася, каб пазбегнуць правакацый.

АМЕРЫКАНСКІ ВІРУС — ПРЫЧЫНА КРЫЗІСУ

Прэм'ер-міністр Італіі Сільвіа Берлусконі назваў сусветны фінансавы крызіс «амерыканскім грыпам». Паводле яго слоў, гэты «вірус пашкодзіў здаровае цела» італьянскай эканомікі.

Берлусконі параўнаў тое, што адбываецца ў свеце, з цяжкай інфекцыяй, прычынай якой стаў «невядомы грып з ЗША». «Дакладнае лячэнне новай хваробы дагэтуль не вынайдзена», — сказаў ён, дадаўшы, што ў Італіі сімптомы таксама пачынаюць адчувацца. Аднак, па меркаванні Берлусконі, яго краіна хутка акрыяе ад крызісу дзякуючы сваёй здаровай банкаўскай сістэме і нізкаму ўзроўню запазычанасці.

Глен ХЭНЛАН:

«БЕЛАРУСЬ — МАЯ ДРУГАЯ РАДЗІМА, Я ЗАДАВОЛЕНЫ, ШТО ВЯРНУЎСЯ»

Учора галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па хакеі, які пасля выбывання з плей-оф чэмпіянату Фінляндыі яго клуба «Йокерыт», вярнуўся ў Беларусь, быў афіцыйна адрэкамендаваны журналістам і ў якасці галоўнага трэнера хакейнага клуба «Дынама», які выступае ў Кантынентальнай хакейнай лізе.

Фота БЕЛТА.

Старшыня федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў пацвердзіў, што з паўночнаамерыканцам заключаны кантракт, які пачне дзейнічаць з ліпеня, на нявызначаны тэрмін — да той пары, пакуль клуб будзе паказваць добрую гульню. У выніку правалу кантракт будзе скасаваны — гэта таксама прадугледжана. Задача для «Дынама» на наступны сезон — заняць месца, не ніжэйшае за дзясятае, і прайсці, як мінімум, два кругі ў плей-оф. Уладзімір Навумаў мяркуе, што той камандзе, якая будзе створана да пачатку новага сезона ў КХЛ (яе фарміраванне завершыцца да 1 ліпеня) будзе па сілах выканаць намечанае. Кандыдатура Глена Хэнлана на гэту пасаду была адзінай, прызнаўся старшыня федэрацыі хакея. «Былі прапановы ад іншых трэнераў, яны прымаліся да ўвагі, але не абмяркоўваліся».

У канцы лета Глен Хэнлан перабярэцца ў Беларусь з сям'ёй. Яго жонка будзе працаваць настаўніцай у сталічнай школе, сын таксама будзе наведваць школу ў Мінску. Пакуль паўночнаамерыканскі спецыяліст спыніўся ў гасцініцы, і як сам прызнаўся ў размове з Уладзімірам Навумавым, ён там адразу пазналі, ва ўсялякім выпадку пашпарт патрабаваць не сталі, а адразу далі ключы ад нумара. Глен Хэнлан сказаў, што вельмі задаволены бытавымі ўмовамі ў Мінску. «Дырэктар «Дынама» па хакейных аперацыях Шон Сімпсан на днях засяліўся ў кватэру, якую яму знайшлі ў Мінску. Ён застаўся вельмі задаволены і падзяліўся са мной уражаннямі. «Мы хочам, каб усе замежныя трэнеры прывозілі сюды свае сем'і — тут выдатныя бытавыя ўмовы. Мінск, на мой погляд, самы лепшы горад на тэрыторыі КХЛ».

Паводле слоў трэнера, некаторыя выразы на рускай мове ён забыў, некаторыя словы дагэтуль памятае, і вельмі быў уражаны, калі пазаўчора ўпершыню зайшоў у распранальню да гульцоў нацыянальнай зборнай. Сярод іх ёсць і ветэраны, якія выступалі пад яго кіраўніцтвам у 2005 і 2006 гадах. З тым жа Андрэем Мезіным, які ў трэніровачны лагер зборнай паехаць не прыбыў, Хэнлан, паводле яго прызнання, у выдатных адносінах, і варатар далучыцца да нацыянальнай камандны. Увогуле сёлета трэнерскі штаб не атрымаў ніводнай адмовы ад гульцоў, якім былі дасланы выклікі ў нацыянальную зборную. Чакаецца прыезд Аляксея Калюжнага і Канстанціна Кальцова (дарэчы, ёсць намер запрасіць апошняга ў мінскае «Дынама», яму нават прапануюць быць капітанам), якія выступаюць у расійскіх клубах, а таксама Руслана Салея, які гуляе ў НХЛ, Сяргея Коласава і Уладзіміра Дзянісава, якія выступаюць за клубы АХЛ. Задача, якая стаіць перад нашымі хакеістамі на чэмпіянаце свету — заняць сама меней сёмае месца, а на найбліжэйшай Алімпіядзе пазмагацца за медалі.

Сваёй галоўнай задачай у Беларусі Глен Хэнлан бачыць развіццё не толькі мінскага «Дынама», а ўсяго хакея ў цэлым. «І не называйце мяне паўночнаамерыканскім спецыялістам, — звярнуўся ён да журналістаў. — У мяне няма пашпарта, я беларускі трэнер. Беларусь стала маёй другой радзімай, і я задаволены, што вярнуўся».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении 31 марта 2009 года 84-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 20 марта 2009 г.) вносятся следующие изменения: в строке 25 (лот № 25) во второй графе вместо «…(под непроизводственное – офис» – **читать «производственное использование – ремонт обуви)».**

Телефон для справок 227 40 22.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 26.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 811,00
▼ 1 еўра	3 776,02
1 латвійскі лат	5 335,48
1 літоўскі літ	1 096,01
1 чэшская крона	138,48
1 польскі злоты	829,80
▼ 1 расійскі рубель	83,35
1 украінская грыўня	349,19

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,7268
10 UAH	41,8966
1000 BYR	12,0971
EUR	45,3963

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Антыкрызісная эканоміка

Крызіс абышоў Наваполацк

— Што датычыцца работы прамысловасці Наваполацка, то па яўных паказчыках няма ні стагнацыі, ні рэцэсіі, — расказвае «Звяздзе» галоўны спецыяліст аддзела эканомікі наваполацкага гарвыканкама Таццяна ГЛАЗКІНА. — Такім чынам, сусветны фінансавы крызіс не паўплываў на аб'ём вытворчасці. У прыватнасці, у студзені апошні склаў 111,3 працэнта ў супастаўных цэнах пры заданні 110,5 працэнта.

Тэмп росту тлумачыцца наступнымі фактарамі: якасцю і абнаўленнем прадукцыі. Толькі за першыя два месяцы гэтага года доля новай прадукцыі ў агульным аб'ёме — 37,8 працэнта. Экспарт наваполацкія прадпрыемствы ажыццяўляюць у 50 краін свету. У студзені — лютым рост прадукцыйнасці працы склаў 9,5 працэнта.

Безумоўна, вялікая заслуга ў дасягненні добрых паказчыкаў у знакамітага прадпрыемства «Нафтан» — найбуйнейшага прадпрыемства ў гэтай галіне ў Еўропе. Нагадаю, што летась «Нафтан», згодна з указам Прэзідэнта, аб'ядналі з не менш вядомым «Палімірам». У выніку ў аб'ёме вытворчасці ўсяго Наваполацка на долю аб'яднанага прадпрыемства прыпадае 98,6 працэнта. Тут, на горадаўтваральным прадпрыемстве, працуюць больш за 12 тысяч чалавек. А ўсяго насельніцтва горада — каля 107 тысяч чалавек. На «Нафтане» працягваецца рэканструкцыя, што дазволіць нават улічваць перспектыўныя еўрапейскія стандарты. Глыбіня перапрацоўкі нафты вельмі высокая.

Калі сярэдняя зарплата ў горадзе ў цэлым па звестках на пачатак студзеня — 1 мільён 250 тысяч рублёў, у прамысловасці яшчэ больш — 1 мільён 750 тысяч.

Тут у апошнія гады шмат надаецца ўвагі ўкараненню сучасных тэхналогій. Клапоцяцца паралельна і пра захаванне экалогіі.

Наваполацк у аб'ёме вытворчасці ўсяго Прыдзвінскага краю вырабляе 71,8 працэнта прадукцыі. Кансалідаваны бюджэт Віцебскай вобласці за кошт прадпрыемстваў Наваполацка папаўняецца ажно на 50,7 працэнта, а рэспублікі — на 4,2 працэнта.

Вельмі развітыя ў Наваполацку паліўная галіна — у агульным аб'ёме — 98,6 працэнта, нафтахімічная. А яшчэ такія галіны, як машынабудаванне, металаапрацоўка, харчовая прамысловасць. Мясцовы хлебазавод нават у Расію ажыццяўляе пастаўкі, на 28,2 працэнта абнавілі прадукцыю. Дзейнічае ўнікальнае ў Беларусі РУП «Наваполацкі завод БВК», дзе вырабляюць кармавы мікрабіялагічны бялок — правід.

Ёсць дасягненні і ў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Вельмі добрыя, у прыватнасці, вынікі ў рабоце сумесных беларуска-італьянскіх прадпрыемстваў «Любава — люкс» і «Любава — інвест». Яны адны з лідараў па вырабе верхняга і ніжняга трыкатажу як для дзяцей, так і дарослых. Прадпрыемствы гэтыя працуюць пад вельмі паказальным дэвізам: «Найлепшае павінна быць даступным беларускім спажыўцам!»

Актыўна займаецца экспартам сумеснае беларуска-нідэрландскае прадпрыемства, што вырабляе прысадкі для аўтамабільных масел.

Плённа дзейнічае РУП «Наваполацкжалезабетон», дзе вырабляюць прадукцыю высокай якасці — больш за 1,5 тысячы найменняў. Зборны жалезабетон у ліку іншага выкарыстоўваецца і для рэканструкцыі аб'яднанага «Нафтана», і для будаўніцтва, рэканструкцыі гарадскіх забудоў, дамоў.

Наваполацку, што па суседстве са старажытным Полацкам, летась споўнілася 50 гадоў. Да свята пастараліся прывесці горад у парадак. Стварылі цэнтральную плошчу, адрамантавалі будынкі і дамы.

Задаволены гараджане і тым, што ў мясцовых бальніцы і паліклініках з'яўляецца новае абсталяванне. Адкрываюцца новыя крамы. Наваполацк — адзін з нямногіх гарадоў, дзе ходзяць трамваі. Задумана, дарэчы, для зручнасці пасажыраў працягнуць лінію. Наогул, цікавы планаў па развіцці і ўпрыгожванні горада ў мясцовых уладаў шмат.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Спецаперацыя

НАРКАГАНДЛЯРОЎ СПЫНІЛІ СТРЭЛАМІ

Упраўленнем КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці ліквідавана буйная партыя асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва — метамфетаміну.

Падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў сталічным упраўленнем Камітэта дзяржбяспекі была праверана аператыўная інфармацыя ў дачыненні да жыхара сталіцы, які шукаў магчымасць збыту буйной партыі метамфетаміну. Было вызначана, што да здзелкі можа далучыцца грамадзянін Літвы, які раней трапляў пад увагу дзяржбяспекі як адзін з арганізатараў канала паступлення ў Беларусь наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. У поле зроку згаданага мінчаніна ў якасці патэнцыйнага пакупніка наркотыкаў быў уведзены супрацоўнік УКДБ.

У населеным пункце Тарасава Мінскага раёна жыхар Мінска перадаў аператыўніку пакет з псіхатропным рэчывам, за што атрымаў 8100 долараў для наступнай перадачы літоўскаму хаўрусніку. Па завяршэнні здзелкі аўтамашына апошняга была блакіравана байцамі групы «Альфа» КДБ Рэспублікі Беларусь, аднак грамадзянін Літвы з саўдзельнікам паспрабавалі ўцячы на хуткасці звыш 180 км/г з выездам на сустрэчную паласу. Аўтамабіль удалося спыніць стрэламі па колах і кузаве. Падчас спецаперацыі ў затрыманых былі адабраны 499,11 г метам-фетаміну, каля 1 г какаіну і 5 г марыхуаны.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Канфіскаваны ў парушальнікаў закона «прадмет» здзелкі.

Уласна той аўтамабіль, на якім зламыснікі спрабавалі ўцячы.

Урон ад незаконнай дзейнасці службовых асобаў Віцебскага райпа склаў каля Br400 млн

Паведаміў намеснік пракурора Віцебскай вобласці Аляксандр СІДАРОВІЧ.

Для гэтага па фіксаваных дзяржаўных закупачных цэнах яны набывалі ў адным з мясцовых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў кароў і цялят быццам для далейшай перапрацоўкі і рэалізацыі ў Беларусі. Затым адразу ж, без дакументальнага афармлення, перадавалі жывёлу нелегальнаму індывідуальнаму прадпрымальніку, жыхару Беларусі. Ён, у сваю чаргу, перапрадаваў жывёлу перапрацоўчым прадпрыемствам Расіі. Для ўтойвання парушэнняў кіраўнікі афармлялі фіктыўныя справаздачныя дакументы аб прасоўванні жывёлы пасля яе афармлення і наступнай рэалізацыі праз рознічную гандлёвую сетку крамаў Віцебскага райпа. З 2005 па 2008 год пяць службовых асобаў Віцебскага райпа незаконна рэалізавалі 2,4 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы. Урон, нанесены дзяржаве, склаў каля Br400 млн. Даход махінатараў быў у разы меншы — некалькі дзясяткаў мільёнаў.

Вольга БАГАЧОВА, БЕЛТА.

ПАРУШЭННЕ ТЭХНІКІ БЯСПЕКІ,

хутчэй за ўсё, стала прычынай гібелі рабочага СУ-257 Светлагорскага ААТ «Будтрэст-20». 34-гадовы мужчына займаўся дэмантажом даху адміністрацыйнага будынка нядзейнага дзіцячага аздараўленчага цэнтра ў вёсцы Чыркавічы Светлагорскага раёна. Пры правядзенні гэтых работ дах абваліўся і накрыў будаўніка. Па факце трагічнай смерці на вытворчасці органамі пракуратуры зараз праводзіцца следства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Спорт-тайм

«Юнацтва» — «Гомель»: пакуль 1:1



Фота БЕЛТА.

У фінальнай серыі адкрытага чэмпіянату Беларусі «Юнацтва» — «Гомель» лік стаў роўным — 1:1. 24 сакавіка гамяльчане выйгралі ў сталіцы 2:0. Першая сустрэча супернікаў 23 сакавіка завяршылася ў Мінску перамогай гаспадароў у авертайме з лікам 3:2. Наступныя паядынкі пройдуць 27 і 28 сакавіка ў Гомелі. Серыя правядзіцца да чатырох перамог адной з каманд.

Без Цылінскай

Учора ў польскім Прушкуве стартаваў чэмпіянат свету па веласпорце на трэку, дзе выступяць і сем беларускіх гоншчыкаў. У складзе беларускай каманды не будзе васьміразовай чэмпіёнкі свету і бронзавай прызёркі Алімпіяды-2004 Наталлі Цылінскай. Яна прапускае гэты сезон і паціху рыхтуецца да наступнага. Такое рашэнне спартсменка прыняла з-за праблем са здароўем і псіхалагічнай стомленасці. На трэку ў Прушкуве свае тытулы будуць абараняць мінулагоднія чэмпіёны свету Васіль Кірыенка і Аляксандр Лісоўскі. Кірыенка выступіць у індывідуальнай гонцы па ачках на 40 км, Лісоўскі — у дысцыпліне скрэтч, а таксама, магчыма, і ў омніўме, дзе летась заваяваў бронзу. Праўда, Аляксандра турбуе траўма калена, і выступаць яму давядзецца «на ўколах». У жаночай камандзе 4 гоншчыцы: Таццяна Шаракова, Алена Амелюсік, Аксана Папко і Вольга Панарына. У Прушкуве зборная Беларусі разлічвае на тры медалі.

МТЗ-РІПА дапусцілі

Пазаўчора мінскі ФК МТЗ-РІПА атрымаў ліцэнзію за нумарам 14 на ўдзел у чэмпіянаце Беларусі сярод каманд вышэйшай лігі ў сезоне 2009/2010 г. Нагадаем, што сталічны клуб быў апошнім, чый удзел у нацыянальным першынстве быў пад пытаннем да апошняга моманту.

Адным канкурэнтам менш

У швейцарскім Цюрыху прайшло пасяджэнне заявачнага камітэта Міжнароднай федэрацыі хакея, які разглядаў прэзентацыі краін-прэтэндэнтак на права правядзення чэмпіянату свету 2014 года. На аднаго канкурэнта ў Беларусі стала менш — Чэхія зняла сваю кандыдатуру, магчыма, для таго, каб сканцэнтравацца для ўдзелу ў спрэчцы за чэмпіянат свету 2015 года. Такім чынам, засталося чатыры прэтэндэнты на планетарны форум 2014 года — Беларусь, Венгрыя, Латвія і Украіна. Усе краіны працягнуць працу над матэрыяламі заяўкі. Канчатковае рашэнне аб выбары краіны-гаспадыні будзе прынята на кангрэсе IIHF, які пройдзе 7-9 мая ў Швейцарыі.

БЕРАЖЫ МАШЫНУ ЗНОВУ, А ПРАВІЛЫ ВУЧЫ ЗМОЛАДУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У Крымінальны кодэкс, на наш погляд, павінен быць уведзены артыкул, які прадугледжвае крымінальную адказнасць асобна за здзяйсненне ДТЗ у п'яным выглядзе, якое пацягнула цяжкія наступствы. На сёння нецвярозы стан кіроўцаў разглядаецца толькі як абставіны, якія абцяжарваюць віну. Звычайны кіроўца, які па несцярожнасці здзейсніў ДТЗ з гібеллю людзей, можа атрымаць тэрмін пазбаўлення волі да сямі гадоў. П'яны, які наўмысна сеў за руль аўтамабіля ў такім стане і загубіў пры гэтым не адно чужое жыццё, можа атрымаць такі ж тэрмін».

Асобна спыніўся міністр на практыцы аказання дапамогі пацярпелым у ДТЗ. На месцы здарэння і ў дзень здзяйснення ДТЗ гіне 82 працэнты ад агульнай колькасці, астатнія 18 працэнтаў паміраюць ужо ў лячэбных установах. Гэта ні многа ні мала — каля 300 чалавек. З іх каля 100 памірае, знаходзячыся ў стацыянары больш за адзін тыдзень. Сёння трэба думаць пра тое, як у самыя кароткія тэрміны дастаўляць пацярпелага да месца аказання кваліфікаванай медыцынскай дапамогі. Навыкамі даўрачэбнай дапамогі павінны ўпэўнена валодаць самі кіроўцы, супрацоўнікі МНС, МУС і іншых службаў, якія першымі прыбываюць да месца аварыі».

У сваім выступленні **Роберт ЧАСНОЙЦЬ, першы намеснік міністра аховы здароўя,** зрабіў акцэнт на неабходнасці ўдасканалення сістэмы выклікання дапамогі (гэтаму, напрыклад, магло б паспрыяць увядзенне адзінага нумару для экстранных выпадкаў) і аказання першай дапамогі пацярпелым у ДТЗ. «Кожны дарослы чалавек павінен умець накладаць жгут, незалежна ад роду заняткаў».

Закраналася падчас дыскусіі і праблема ранняй падрыхтоўкі да ўдзелу ў дарожным руху, маўляў, знаёміць з гэтым трэба ўжо дашкольнікаў. А ў школе адпаведнае навучанне, на думку міністра ўнутраных спраў, трэба паглыбіць, варта таксама дапоўніць праграму падрыхтоўкі студэнтаў педагагічнай спецыялізацыі дысцыплінамі па выкладанні асноў бяспекі паводзінаў на дарогах. Пералічаныя меры, паводле меркавання Уладзіміра Навумава, будуць садзейнічаць «павышэнню ўзроўню падрыхтаванасці кандыдатаў у кіроўцы механічных транспартных сродкаў, якія праходзяць навучанне ў аўташколах, — тое, што сёння выклікае дастаткова шмат крытыкі. Працэс навучання ў такім выпадку будзе будавацца на аснове ведаў, атрыманых у агульнаадукацыйных навучальных установах».

Казімір ФАРЫНО, намеснік міністра адукацыі, прызнаў, што ў асобных дашкольных установах пры правядзенні рамонтных работ, змяненні тэрыторый колькасць пляцовак для практычнага навучання малых паводзінам на дарозе зменшылася. І дадаў, што давядзецца іх аднаўляць. «І мы такую задачу ставім перад усёй сістэмай дашкольнай адукацыі». Намеснік міністра паведаміў: «Мы яшчэ раз правялі рэвізію зместу адукацыі і дамовіліся з ДАІ рэспублікі, што павялічым на 10 гадзін абавязковы складнік вывучэння правілаў дарожнага руху».

Ёсць таксама дамоўленасць аб штомесячным наведванні супрацоўнікамі ДАІ навучальных устаноў з тым, каб праводзіць профілактычную работу. Дамовіліся і аб залiках па выніках навучання школьнікаў перад зімнімі і летнімі канікуламі. У Міністэрстве адукацыі палічылі магчымым спалучыць прыемнае з карысным — выкарыстоўваць інтэрактыўныя метады навучання. Маўляў, дзеці любяць пагуляць за камп'ютарам — чаму б ім не вывучаць правілы паводзінаў на дарозе ў займальнай форме пры дапамозе мультымедыйных навучальных матэрыялаў.

Аляксандр АПАЦКІ, першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, звярнуў увагу ўдзельнікаў «круглага стала» на экалагічныя аспекты дарожнага руху. Праведзены маніторынг прыдарожжа несуцяшальны — у зоне 10 — 15 метраў ад дарогі з актыўным рухам нельга вырошчваць сельгаспрадукцыю. Паводле яго інфармацыі, доля транспарту ў выкідах у атмасферу забруджвальных рэчываў у гарадах дасягае 65 — 80 працэнтаў. У міністэрстве падлічылі, што пры захаванні наяўных тэмпаў росту аўтапарка колькасць забруджвальных рэчываў можа павялічыцца на 10 працэнтаў да 2013 года. У заторах колькасць выкідаў у сярэднім у дзясятак разоў перавышае аналагічны паказчык пры звычайным руху. Сярод пазітыўных тэндэнцый і тое, што ў руху ўдзельнічае ўсё больш машын, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі не даўжэй за тры гады.

Ала МАЧАЛАВА.

Дубль пяць

Хто ўздымецца на «Тэлевяршыню»?

Адказ на гэта пытанне гледачы і самі беларускія тэлевізійнікі атрымаюць 29 сакавіка. Менавіта ў гэты дзень адбудзецца цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў V Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня».

Але яшчэ да гэтага моманту можна адзначыць некалькі адметнасцяў сёлетняга конкурсу. Па-першае, пятая «Тэлевяршыня» ў параўнанні з мінулымі стала самай вялікай па колькасці дасланых заявак — 253, з якіх пераважная большасць — 140 — ад рэгіянальных тэлекампаній і аб'яднанняў. Апошні факт з прыемнасцю адзначалі ўсе члены журы, у тым ліку яго сустаршыня, намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук. «Па некаторых работах упершыню рэгіянальныя тэлеканалы лідзіруюць у спаборніцтве з «тэлекітамі» — Белтэлерадыёкампаніяй, АНТ, СТБ», — адзначыў намеснік міністра. Асабліва члены адборачнай камісіі і прафесійнага журы адзначылі тэлеканалы з Ліды, Брэста, Гомеля, Магілёва, Паставаў, Маладзечна, Пінска; увогуле сярод удзельнікаў сёлета больш за 30 рэгіянальных тэлекампаній як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формы ўласнасці.

Па-другое, сёлета як ніколі папулярнай была намінацыя «Лепшы дакументальны фільм», у якой разглядалася 31 заяўка, прычым як мінімум 9 работ, на думку прафесіяналаў, былі вартыя найвышэйшай узнагароды. А вось у намінацыі «Сацыяльная рэклама» хоць і было прадэманстравана таксама многа работ — 21 заяўка — але іх якасць журы не парадавала.

Нагадаем, заснавальнікамі нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу выступаюць міністэрства інфармацыі РБ, Белтэлерадыёкампанія, ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» і ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне». Рэспубліканскія каналы-арганізатары па чарзе праводзяць і трансляюць цырымонію. Сёлета ўжо ў другі раз гэта робіць Белтэлерадыёкампанія, якой упершыню давядзецца прыстасоўвацца да іншага памяшкання — «Тэлевяршыня» са звыклага Палаца Рэспублікі перабярэцца ў Белдзяржфілармонію. Арганізатары не хаваюць — гэта выклікана ў тым ліку і фінансавымі прычынамі, але абяцаюць, што ні значнасць цырымоніі, ні якасць «карцінкі» не зменшацца. Наадварот — абяцаецца мерапрыемства «ў лепшых традыцыях свецкай урачыстасці», намінантам і гасцям прадпісаны строга вячэрні дрэс-код, а адпаведную атмасферу дапаможа стварыць класічная музыка...

— Так, сапраўды, філармонія — гэта даволі складаная сцэна, не прыстасаваная ні для трансляцыі намінацый на экране, ні для паказу людзей у зале — а нашых герояў, твары розных каналаў трэба паказваць, — згаджаецца галоўны рэжысёр Белтэлерадыёкампаніі, рэжысёр-пастаноўшчык цырымоніі Валерый Пестаў. — Давялося канструктарам усё дэталёва пралічваць, заказваць спецыяльнае абсталяванне для асвятлення, падвесу камер і г.д. Спадзяюся, мы справімся. Што датычыцца «іскрынак» цырымоніі — паколькі гэта філармонія, павінна гучаць добрая музыка, класіка. Тым больш, у БТРК ёсць такое багацце, як уласны сімфанічны аркестр. Але цалкам яго размясціць складана, таму ў нас будзе працаваць струнная група. Самая вялікая, я лічу, знаходка — кампазітар Далгалёў спецыяльна напісаў 12 гімнаў для выхаду намінантаў і ўзнагароджання, і гэтыя гімны будуць выконвацца на аргане Белдзяржфілармоніі. У фае, сустракаючы гасцей, будзе працаваць ансамбль камернай музыкі «Сімфаніета», які таксама створыць адпаведную атмасферу. І ў фінале, безумоўна, прагучыць гімн «Тэлевяршыні», напісаны Л. Захлеўным, — «Яго вялікасць эфір». Бо для нас усіх, хто працуе на тэлебачанні, сапраўды эфір — гэта святое.

Статуэткі «Тэлевяршыні» будуць уручаныя ў 20 асноўных намінацыях (12 — тэлепраекты, 8 — персаналіі) і дзвюх дадатковых — прыз журы «За ўнёсак у развіццё айчыннага тэлебачання» і прыз глядачоў сімпатый лепшаму тэлевядучаму, на званне якога прэтэндуюць Дзяніс Кур'ян (Першы), Аляксандра Снегіна (ЛАД), Сяргей Дарафееў (АНТ), Ларыса Грыбалёва і Юрый Нікалаеў (РТР-Беларусь). Зрэшты, колькасць саміх статуэтак, прыадкрылі сакрэт арганізатары, будзе крыху большая за 22 — некалькі намінантаў набралі аднолькавую колькасць галасоў журы, таму ўзнагароды давялося дазаказваць.

...Колькі існуе конкурс, столькі прафесіяналы спрачаюцца наконт яго намінацый — што трэба дадаць, што прыбраць, дзе падкарэктаваць назву. Напрыклад, «Лепшага сцэнарыста» выбіралі толькі першыя два гады, а работа спецыялістаў па гуку ўвогуле засталася па-за межамі конкурсу.

— Ці будзе пазней перагледжаны, пашыраны спіс намінацый? — удакладнілі мы ў намесніка міністра інфармацыі Аляксандра Слабадчука.

— З першай па трэцюю «Тэлевяршыню» ішла шліфоўка асноўных намінацый — напрыклад, аб'ядналі ў адну намінацыю дзіцячыя і моладзевыя праграмы, унеслі іншыя карэкціроўкі. Апошнія два гады нічога не мянялі. Але ўвогуле гэты працэс няспынны — у працэсе развіцця конкурсу прапановы прафесіяналаў будуць улічвацца.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Абзац

■ Брэсцкая міліцыя расследуе факт крадзяжу грошай у адным з банкаматаў абласнога цэнтра. Рабаванне адбылося ноччу, не выключана, што скрадзена дастаткова вялікая сума грошай. Аб факце ўзлому банкамата і крадзяжы грошай у міліцыю паведамілі супрацоўнікі банка. У будынак зламыснікі прабраліся праз акно. На месцы здарэння аператыўнікі знайшлі сарваны навясны замок металічных кратаў, узламаныя ралеты. Замок банкамата выкрадальнікі ўскрылі пры дапамозе газазваркі. Узбуджана крымінальная справа, вызначана кола падазроных, праводзіцца комплекс следчых дзеянняў.

■ Раней судзімы 22-гадовы мінчанін за разбітае акно ў сваёй кватэры забіў патэльняй 21-гадовага беспрацоўнага. Пацярпелы позна ўвечары ішоў у госці ў адну з кватэр у Серабранцы. Пад'езд быў зачынены, ён пачаў званіць па домафоне ў кватэру на першым паверсе, дзе кампанія распівала спіртное. Упусціць яго не захацелі, і тады пацярпелы разбіў акно кватэры. Пасля гэтага яго ўпусцілі не толькі ў пад'езд, але і ў кватэру. Падчас бойкі ён атрымаў удары патэльняй па галаве і памёр ад чэрапна-мазгавой траўмы. Узбуджана крымінальная справа.

■ Былы намеснік галоўурача па арганізацыйна-метадычнай і ідэалагічнай рабоце Гродзенскай абласной бальніцы асуджаны за махлярства і хабар. Такім было канчатковае рашэнне Гродзенскага абласнога суда. Сёлета ў лютым Д. Лучына быў асуджаны Ленінскім судом г. Гродна да 6,5 года пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці за падбухторванне да дачы хабару, завалоданне грашыма грамадзян у суме звыш Br10 млн шляхам махлярства і неаднаразовае атрыманне хабару ад падначаленых за падаўжэнне працоўных кантрактаў. Лучына падаў касацыйную скаргу, аднак абласны суд пакінуў рашэнне ў сіле.

■ Непрацуючы жыхар Баранавічаў 1965 г.н. затрыманы за незаконныя валютныя аперацыі. Пры сабе ён меў $13 тыс. і Br36,5 млн. На яго складзеныя адміністрацыйныя пратаколы, яму пагражае штраф ад 50 да 300 базавых велічыняў з канфіскацыяй грашовых сродкаў.

■ Пяць гадоў пазбаўлення волі пагражае «тэлефоннаму тэрарысту» з Лунінецкага раёна. Жыхар пасёлка Палескі абвінавачваецца ў тым, што ў стане алкагольнага ап'янення ў гадзіну ночы ён патэлефанаваў па нумары «102» і зрабіў заведама ілжывае паведамленне аб выбуховай прыладзе, закладзенай у Палескай СШ. Падазроны затрыманы.

■ Падчас аперацыі па выдаленні ракавай пухліны мозгу хірург з Неапаля перанёс інфаркт. Асістэнты прапанавалі яму тэрмінова спыніць аперацыю і самому накіравацца ў бальнічную палату. Аднак доктар катэгарычна адмовіўся кінуць пацыента недалечаным, бо гэта паменшыла б яго шанцы на паспяховае выздараўленне. Нягледзячы на вельмі моцны боль, хірург зрабіў усё, што было патрэбна, і толькі пасля гэтага згадзіўся прыняць дапамогу. Зараз абодва — урач і пацыент — ідуць на папраўку, бо, нягледзячы на дрэннае самаадчуванне, хірург найлепшым чынам зрабіў маніпуляцыі, якія патрабуюць ювелірнай дакладнасці.

Поўны абзац

■ Кітайскія марксісты маюць намер паставіць мюзікл па самым вядомым камуністычным трактаце — «Капіталу» Карла Маркса. Па меркаванні аўтараў ідэі, тэорыя Маркса, надрукаваная яшчэ ў 1867 годзе, вельмі актуальная ва ўмовах цяперашняга эканамічнага крызісу. Рэжысёр пастаноўкі ўзбагачае твор сучаснымі элементамі шоу. Сюжэт мюзікла будзе разгортвацца вакол групы офісных працаўнікоў, якія даведваюцца, што іх бос эксплуатуе іх. На думку пастаноўшчыкаў, модная і цікавая пастаноўка верне да жыцця эканамічная тэорыя Маркса. Прэм'ера шоу адбудзецца налета ў Шанхайскім цэнтры драматычнага мастацтва.

■ У Сан-Дыега (амерыканскі штат Каліфорнія) п'яны вадзіцель выпадкова дапамог паліцыі выявіць хатнюю плантацыю марыхуаны. Знаходзячыся за рулём пазадарожніка, мужчына ўрэзаўся ў дом свайго суседа і прабіў у сцяне дзірку. Паліцэйскія, якія прыехалі на месца здарэння, выявілі ў памяшканні больш за 20 гаршчкоў з кустамі марыхуаны. У доме ў гэты час нікога не было. Па словах суседзяў, гаспадары паехалі на некалькі дзён катацца на горных лыжах.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Погляд

НЕ ТРЭБА САРОМЕЦЦА... БЫЦЬ ЭКАНОМНЫМІ

Істотнае паляпшэнне ў Беларусі інвестыцыйнага клімату, а значыць і магчымасць атрымання нашай краінай самай сур'ёзнай інвестыцыйнай падтрымкі, — гэта галоўнае антыкрызіснае лякарства на сённяшні дзень, зазначыў падчас гутаркі з карэспандэнтам «Звязды» ганаровы старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў, прафесар Аляксандр ПАТУПА. Эксперт, які возьме ўдзел у пасяджэнні грамадска-кансультацыйнага Савета, створанага пры Адміністрацыі Прэзідэнта, лічыць, што наспела неабходнасць вырашаць пытанне аб інвестыцыйнай бяспецы краіны.

— Мы змаглі для краіны пазычыць грошы і заблакіравалі першыя ўдары крызісу. Гэта нядрэнна. Але што рабіць далей? — разважае вядомы беларускі эксперт. — Прадаваць зараз аператыўна ўласнасць — насамрэч гэта вялікая праблема. Па-першае, у нас няма фондавага рынку, і мы не можам ёй даць сапраўдную рынкавую ацэнку. А па-другое, пад час крызісу, як вядома, грошай няма, і ўсе імкнуцца набываць маёмасць як мага больш танна, за капейкі. У такім выпадку прадаваць уласнасць сэнсу не будзе.

— Што ў такім разе рабіць, каб не толькі не трапіць у даўгавую яму, але і неяк выкарасквацца з крызісу?

— У першую чаргу, арыентавацца на істотны прыток інвестыцый. Без гэтага мы нікуды не дзенемся. Інвестыцыйныя грошы — гэта не крэдытныя сродкі, галоўнае, што гэта зарыентуе прадпрыемствы рэспублікі на вытворчасць больш канкурэнтаздольных тавараў, таму што ў неканкурэнтаздольныя тавары нікто інвестыцый не ўкладае. Наша задача ў гэтым плане — дапамагчы дзяржаве стварыць пазітыўны інвестыцыйны клімат. На жаль, у нас пакуль тут ёсць пэўныя недапрацоўкі.

— І чаго, на ваш погляд, не хапае патэнцыйным інвестарам? Мажліва, гутарка ідзе пра пэўныя гарантыі?

— Сутнасць у тым, што заканадаўча інвестар усур'ёз не абаронены. Трэба прыняць дакумент, які абмяжуе магчымасці нападу дзяржавы на ўласнасць і павысіць узровень абароны бізнэсу: гэтае пытанне даўно абмяркоўваецца і, па вялікім рахунку, быццам бы па ім не было пярэчанняў, але яго неабходна прымаць. У абавязковым парадку трэба ўводзіць значна ўзмоцненае абгрунтаванне эканамічных дакументаў, нарматыўна-прававых актаў. Не будзе ў чыноўнікаў сур'ёзнага абгрунтавання эканамічнага дакумента — значыць, ён не павінен прымацца. Абгрунтаванне актаў — вельмі важны антыкарупцыйны захад. Гэта дазваляе заблакіраваць праекты, якія не тоячыся лабіруюць інтарэсы пэўных нядобрасумленных груп, што накіраваныя супраць агульных мэтаў эканомікі. Нарэшце, праекты актаў павінны абавязкова абмяркоўвацца ў пэўным коле экспертаў. У першую чаргу, гэта грамадскае аб'яднанне прадпрымальнікаў, у абмеркаванні могуць удзельнічаць незалежныя эксперты і эксперты якіх-небудзь эканамічных арганізацый.

У сваіх прапановах мы будзем выказвацца і за актыўную «халдынгізацыю», іншымі словамі, каб былі выдзелены холдынгі, карпарацыі, агенцтвы, якія б кіравалі дзяржаўнай маёмасцю і не ўваходзілі ў склад міністэрстваў і ўстановаў. Апошнія павінны займацца эканамічнай палітыкай. Што датычыцца холдынгаў, карпарацый і агенцтваў, то менавіта праз іх мы зможам правільна весці гутарку аб продажы буйных пакетаў акцый.

Неабходна вельмі ўважліва перагледзець і сацыяльную кампаненту, я маю на ўвазе пытанні беспрацоўя. У многіх выпадках нам усё ж такі больш выгадна мець беспрацоўных з якойсьці мінімальнай аплатай, а не з той дапамогай, якой хапае толькі на адзін паход у краму.

— Аляксандр Сяргеевіч, а што датычыцца рэальнага сектара, якія тут магчымыя карэктывы?

— Зараз неабходна стварыць нейкія захады для інавацыйных укараненняў. Пакуль справа з навукаёмістай прадукцыяй ідзе не вельмі, таму ў нас на гэты конт ёсць сур'ёзныя прапановы. Мы жывём не апошні дзень, заўтра крызіс скончыцца і ўсё будзе па-іншаму. Тыя тавары і паслугі, якія выцягвалі свет у апошні перыяд страшнага росту, сыдуць. Вызначальная роля будзе за новымі: гэта ўзмацненне высокатэхналагічных рэчаў, у першую чаргу, безумоўна, нанатэхналогіі, акрама таго, на парозе эпоха біятэхналогій. Гэта трэба мець на ўвазе.

Зазначу і наступнае: у перыяд крызісу не трэба саромецца паўтараць, што эканоміка павінна быць эканомнай. І не проста паўтараць, а праводзіць гэты лозунг у жыццё: да прыкладу, сыходзячы, гасіць святло, менш купляць, каб потым не выкідваць на сметнік рэшткі ежы. Эканоміць неабходна на ўсім. У свой час жонкі прэзідэнтаў Злучаных Штатаў не саромеліся цыраваць шкарпэткі, і іх лічылі сусветным узорам дабрачыннасці. Зараз Мішэль Абама, якая разбіла горад ля Белага дома, дэманструе амерыканцам, як у цяжкія часы можна пры дапамозе натуральнай гаспадаркі забяспечыць прадуктамі сваю сям'ю. Гэта добры жэст.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Воложине:

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб.
2	ул. Горецкого, 17	622050100021000006	0,15	2 199 120	1 247 668

* - в непосредственной близости имеются линии электроснабжения, газоснабжения, водопровода.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2008 г. Аукцион состоится **09.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **08.04.2009 г.** по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Организация:

Открытое акционерное общество
«АБРАЗИВХИМСБЫТ»

Учетный номер плательщика: 191046462
Вид деятельности: Оптовая торговля
Организационно-правовая форма: Открытое акционерное общество
Орган управления: Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн. руб.
Адрес: 220079, г. Минск, ул. Кальварийская, 33-18

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2009 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	—	27
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	—	4
Денежные средства	260	—	17
ИТОГО по разделу II	**290**	**—**	**48**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**—**	**48**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	—	21
ИТОГО по разделу III	**490**	**—**	**21**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	620	—	27
ИТОГО по разделу V	**690**	**—**	**27**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**—**	**48**

ПАВЕДАМЛЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

19 сакавіка 2009 г. рашэннем Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі № 32 зарэгістраваны кандыдатамі ў члены НАН Беларусі, выбары якіх адбудуцца 24 красавіка 2009 г., на вакансіі:

1. Правадзейных членаў (акадэмікаў) НАН Беларусі:

А

ФІКТЫЎНАЯ ТЫ, ФІКТЫЎНЫ Я...

Праблема, з якой звярнуўся гэты чалавек у рэдакцыю, мае пачатак у 1995 годзе. Калі ён, дзеля таго, каб прадаць пакой у камунальнай кватэры, заключыў фіктыўны шлюб. Па дамоўленасці з будучай фіктыўнай жонкай яны павінны былі развесціся пасля таго, як ён прапіша яе на сваю жылплошчу. Аднак жанчына, пасяліўшыся з першым сваім мужам і двума іх агульнымі няпоўнагадовымі дзецьмі па новым адрасе, падаваць дакументы на развод адмовілася. Прадавец камунальнай кватэры дамогся прад суд прызнання шлюбу несапраўдным. У выніку была ануляваная і прапіска жанчыны. Сама яна і ўсе, хто з ёй пражываў, падлягалі высяленню без выдзялення жылля.

У гэтай гісторыі цяжка зразумець, хто вінаваты і хто пацярпеў. А таксама — хто выйграў. Нягледзячы на рашэнне суда аб прымусовым высяленні, жанчына жыве ў той самай кватэры дагэтуль. Мужчына, які заключаў з ёй фіктыўны шлюб, застаўся там прапісаны. Цяпер, праз 14 гадоў, яна праз суд дамагаецца, каб яго выпісалі і пазбавілі права на гэту жылплошчу. Галоўная яго праблема ў тым, што яму няма куды прапісацца. Дом, які планаваў пабудаваць з дапамогай атрыманых ад здзелкі грошай, ён так і не пабудаваў. Жыве ў часовым збудаванні. Новую сям'ю не стварыў. Мужчына гэты пакідае ўражанне чалавека стомленага і не вельмі здаровага, які заблытаўся і ўсіх навокал падазрае.

Але не столькі ён сам і яго праблемы выклікалі цікавасць, колькі адкрыццё: наколькі доўгімі ў часе і нечаканымі могуць стацца наступствы фіктыўнага шлюбу. Сустрэча ў рэдакцыі стала нагодай для разважанняў на гэту тэму і спробы журналісцкага расследавання.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Патрэбны фіктыўны шлюб, каб жыць з каханым

«Беларуска Аляксандра шукае мужчыну — грамадзяніна Расійскай Федэрацыі, які пражывае ў Маскве альбо Маскоўскай вобласці, для заключэння камерцыйнага шлюбу на 6 месяцаў. Неабходна таксама пастаянная рэгістрацыя на вашай жылплошчы. Усё аформім натарыяльна (адмова ад прэтэнзій на жылплошчу і пакрыццё камунальных плацяжоў). Цана дагаворная».

«Алег з Беларусі, 39 гадоў. Патрэбны шлюб з грамадзянкай Еўрапейскага Саюза, якая пражывае альбо працуе ў Англіі, Ірландыі. Прыстойнасць гарантую. Цана — 5 000 еўра».

«Лена, грамадзянка Беларусі. Знаходжуся на вучобе ў Аўстрыі. Шукаю мужчыну да 40 гадоў для фіктыўнага шлюбу ў Аўстрыі. Падрабязнасці пры перапісцы. Разгледжу любыя прапановы».

На гэтай рускамоўнай інтэрнэт-старонцы пад рубрыкай «Фіктыўны шлюб» штодня з'яўляецца 6-8 новых аб'яў ад адрасатаў з усіх куткоў свету. Адны прапануюць, іншыя шукаюць магчымасць заключэння фіктыўнага шлюбу дзеля таго, каб легалізавацца, атрымаць візу, прапіску, скасаваць працоўны дагавор, выехаць за мяжу, уладкавацца на працу... альбо зарабіць адносна лёгкім спосабам грошы. Ад беларусаў з пачатку мінулага года зарэгістравана каля 20 аб'яў, падобных на працытаваныя вышэй. Ёсць, праўда, і незвычайныя.

«Тэрмінова патрэбны фіктыўны шлюб з грамадзянінам Вялікабрытаніі толькі для таго, каб з'ехаць і жыць з каханым. Сутнасць у тым, што ў майго жаніха пакуль няма грамадзянства, дакументы ў Home Office (дзяржаўная ўстанова, якая адказвае за іншаземцаў, якія пражываюць у Вялікабрытаніі. — **Аўт.**) *і не вядома, калі атрымае, а чакаць так доўга мы не можам. Прашу ўсіх, хто можа дапамагчы, адгукнуцца»,* — напісала ў роспачы беларуска Алена.

Цікавы спосаб уз'яднацца з каханым — з дапамогай шлюбу з іншым. А калі «сапраўдны» грамадзянства Вялікабрытаніі так і не атрымае?..

Нашы суграмадзяне гатовыя рызыкнуць і абмяняць штамп у пашпарце на дакументы, якія б дазволілі ім жыць у Літве, Аўстраліі, Польшчы, Латвіі, Канадзе, ЗША, Расіі (Калінінград і Маскоўская вобласць у прыватнасці), Германіі.

Па гэтай дошцы аб'яў можна меркаваць, што і сама Беларусь як месца пастаяннага жыхарства з'яўляецца цікавай для грамадзян, напрыклад, Азербайджана, Узбекістана, В'етнама... А нейкі Дзмітрый шукае ў Штатах дзяўчыну з Беларусі, якая знаходзіцца там да года, жадае атрымаць статус бежанкі і пагадзілася б дапамагчы і яму.

Беларусы і беларускі выступаюць і на іншым баку — прапануюць фіктыўны шлюб у нашай краіне за ўзнагароджанне. Яны не пішуць, колькі разлічваюць за гэта атрымаць, але, для прыкладу, за прапіску праз шлюб у Краснадарскім краі просяць каля 1,5 тысячы долараў, за дзелавы шлюб з масквічкай альбо масквічом (без рэгістрацыі) — 100 000 —150 000 тысяч расійскіх рублёў, з канадкай — 20 тысяч долараў, з грамадзянінам Швецыі — 25 тысяч еўра.

Можа скласціся ўражанне, што сёння фіктыўны шлюб патрэбны толькі для вырашэння міграцыйных праблем, але гэта не так.

«Ажанюся з дзяўчынай за невялікую ўзнагароду з яе боку. Сам я служу — курсант. Шлюб заключу на тэрмін да аднаго года. Развод гарантую. Ні на што не прэтэндую. Мне гэта патрэбна для атрымання свабоднага выхаду з часці, а па выпуску каб адразу далі кватэру. Нежанатым не даюць», — шчыра напісаў Макс, забыўшы патлумачыць, за што, уласна, павінна плаціць дзяўчына.

Напэўна, за гонар мець на старонцы свайго пашпарта штампік з яго прозвішчам. Можа, курсанты думаюць, што пабыць хаця б фіктыўнай іх жонкай для дзяўчыны — такое шчасце, што некаторыя нават гатовыя за гэта заплаціць?

Такая высокая самаацэнка характэрная не толькі для нашых курсантаў, але і для амерыканцаў. Адзін з іх напісаў сцісла, але змястоўна:

«Прыстойны, малады, цікавы. Вельмі патрэбны грошы... 20 000 еўра».

А можа, гэты таксама — наш?

З гісторыі пытання

У Сямейным Кодэксе Рэспублікі Беларусь пазначана, што фіктыўны шлюб — гэта «рэгістрацыя заключэння шлюбу без мэты стварэння сям'і». Аднак калі шукаць прыклады гэтай з'явы ў гісторыі, то кіравацца такім азначэннем даволі складана. Напрыклад, у III стагоддзі сын рымскага сенатара Палемія Хрысанф пагадзіўся на настойлівыя ўгаворы бацькі і ажаніўся са жрыцай Афіны Палады — прыгажуняй Дарыяй. Напярэдадні цырымоніі маладыя людзі дамовіліся, што будуць захоўваць цноту і пасля шлюбу. Так і адбылося. Яны нават пасяліліся ў двух розных дамах. Гараджане пазней абвінавацілі іх у пропаведзі бяс-шлюбнасці і патрабавалі ад ўладаў іх пакараць. З пункту гледжання літары сённяшняга закона Хрысанф і Дарыя заключылі фіктыўны шлюб: яны не стварылі сям'і, нават пражывалі асобна. Аднак яны не толькі не мелі за мэту матэрыяльную альбо іншую карысць, але і свядома пацярпелі. Таму ставіць святых хрысціянскіх пакутнікаў у адзін шэраг з сённяшнімі ўдзельнікамі фіктыўнага шлюбу было б блюзнерствам.

Яшчэ адзін яскравы і неадназначны гістарычны прыклад — замужжа ў другой палове XIX стагоддзя 17-гадовай Соф'і Корвін-Крукоўскай з таленавітым маладым чалавекам Уладзімірам Кавалеўскім. Гэтыя двое таксама дамовіліся загадзя, што шлюб іх будзе толькі намінальным. На гэты раз і мэта можа падацца нам даволі блізкай — магчымасць выезду Соф'і за мяжу дзеля атрымання ўніверсітэцкай адукацыі. Дарэчы, гэта дазволіла ёй потым стаць першай у свеце жанчынай — прафесарам. (Ёсць меркаванне, што фіктыўны шлюб насамрэч не быў адзінай магчымасцю для Соф'і Кавалеўскай прысвяціць сябе матэматыцы). Аднак з пункту гледжання цяперашніх законаў шлюб гэты быў з самага пачатку не такім ужо і фіктыўным. Так, доўгі час Кавалеўскія не мелі шлюбных адносінаў (у самым вузкім сэнсе слова), аднак яны жылі на агульныя сродкі, у адным доме і першы час увогуле былі неразлучныя. Пазней іх шлюб з фіктыўнага ператварыўся ў фактычны, аднак так і не стаў шчаслівым.

Спроба зарабіць лёгкія грошы з дапамогай запісу ў актавай кнізе маладой савецкай дзяржавы апісана ў 1931 годзе Міхаілам Зошчанкам у гумарэсцы «Не трэба спекуляваць». Там, праўда, прыводзіцца прыклад, выбачайце за каламбур, фіктыўна фіктыўнага шлюбу. Да таго ж яшчэ і «аднабакоага» — такое таксама бывае. Малочніца, каб атрымаць ад сваёй заможнай кліентки 50 рублёў за знаёмства з кандыдатам у жаніхі, прапануе ўласнага мужа. Яна дамаўляецца з апошнім, што ў крайнім выпадку ён можа і распісацца, а на другі дзень — шлюб скасаваць. У выніку малочніца свае грошы атрымлівае, але мужа страчвае. Новая жонка таму спадабалася больш.

У Савецкім заканадаўстве тэрмін «фіктыўны шлюб» з'явіўся толькі ў 1968 годзе. Аднак з'ява гэта, безумоўна, існавала і раней. Правазнаўцы кажуць, што шлюб, які па форме цалкам адпавядае патрабаванням закона, але па змесце яму супярэчыць, нароўні негатыўнымі рэаліямі тагачаснага жыцця. А некаторыя лічаць, што гэта выказванне справядліва для ўсіх часоў і эпох. Напрыклад, у Савецкім Саюзе фіктыўны шлюб мог быць адзінай магчымасцю вырвацца з калгаса, вырашыць праблему жылля, выехаць за мяжу. Звычайна такія шлюбы заключаліся ў гарадах з абмежаванай прапіскай (што актуальна і для дня сённяшняга). Сярод матываў яшчэ не такога далёкага часу сустракаюцца і такія, што сённяшняму маладому пакаленню могуць падацца зусім дзіўнымі.

У студзені 1979 года ў газеце «Правда» была апісана сітуацыя, калі масквічка «саступіла» свайго мужа сяброўцы за тое, што тая даравала ёй буйны доўг. Сяброўка, якая атрымала «напракат» мужа, тым самым забяспечыла сабе стан афіцыйнай утрыманкі, што дазволіла ёй, не працуючы, траціць грошы, якія ў яе былі, і жыць на шыракую нагу.

Дзень сённяшні

Знайсці ў Беларусі якую-небудзь статыстыку фіктыўных шлюбаў было справай няпростай. Начальнікі ЗАГСаў і дырэктарскі шлюбных агенцтваў у адзін голас запэўніваюць, што пытанне гэта цяпер зусім не актуальнае. Супрацоўнікі Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, наадварот, сцвярджаюць, што сутыкаюцца з фіктыўнымі шлюбамі і раводамі ледзь не штодня, але ад размовы з журналістам на гэту тэму чамусьці адмаўляюцца.

— Не бачу ў гэтым нічога кепскага, людзі такім чынам паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы, вырашаюць іншыя праблемы, — абмежаваўся меркаваннем адзін з юрыстаў.

У міграцыйнай службе прызналіся, што праблема фіктыўных шлюбаў існуе, аднак каментаваць яе з іх боку — значыць «яшчэ больш распаўсюджваць гэту ганебную практыку».

І як гэта нярэдка ў нас бывае, з-за недахопу інфармацыі ў Беларусі даводзіцца звяртацца да крыніц інфармацыі суседніх дзяржаў. І праводзіць адпаведныя аналогіі.

Супрацоўнікі маскоўскіх ЗАГСаў, напрыклад, лічаць, што кожны трэці шлюб у расійскай сталіцы — фіктыўны. Больш за ўсё іх шакіраваў выпадак, калі ў лістападзе 2006 года пад вянец адправіліся 30-гадовы жыхар Узбекістана і масквічка 1919 года нараджэння.

Акрамя рашэння міграцыйных і жыллёвых праблем, для нашага часу характэрна выкарыстанне несапраўднага шлюбу асобамі з нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыяй (для тых, хто на гэтым зарабляе грошы, яны самыя пажаданыя клиенты) і ўдзельнікамі выбарчых кампаній. Больш за тое, па выніках апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам грамадскага меркавання, фіктыўныя шлюбы дзеля вырашэння бытавых праблем лічыць дапушчальнымі палова расіян.

Дарэчы, фіктыўнымі могуць быць не толькі шлюбы, але і разводы. А таксама ўсынаўленне, прызнанне бацькоўства, падзел маёмасці і нават спагнанне аліментаў. Некаторыя з гэтых незвычайных адносінаў заслугоўваюць асобнай размовы. Як і тэма небяспекі, якая з імі звязана. Так што чакайце наступных нумароў «Звязды».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НАДЗВЫЧАЙНЫ ЗДАРЫЎСЯ ПАДЗЕЯ

ПРАЕКТ УДАКЛАДНЕНАГА БЮДЖЭТУ БЕЛАРУСІ НА 2009 ГОД ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ІСТОТНЫЯ ЗМЯНЕННІ Ў ДАХОДАХ І РАСХОДАХ

Праект удакладненага бюджэту Беларусі на 2009 год прадугледжвае істотныя змяненні ў даходнай і расходнай частках, уключаючы аб'ёмы міжбюджэтных трансфертаў. Пры гэтым вытрыманы мэтавы паказчык нулявога дэфіцыту. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве фінансаў Беларусі.

Пры ўдакладненні прагнозу разглядаецца некалькі варыянтаў развіцця эканомікі. Нягледзячы на скарачэнне бюджэтных расходаў, Мінфін імкнецца рэалізаваць гэтыя падыходы, каб захаваць дасягнуты якасны ўзровень сацыяльных паслуг, забяспечыць сацыяльную накіраванасць бюджэту і падтрымку прыярытэтным сферам эканомікі.

Для змякчэння негатыўных наступстваў сусветнага фінансавага крызісу выкарыстоўваюцца ў тым ліку і падатковыя стымулы. Праводзімае рэфармаванне падатковай сістэмы ў апошнія гады было накіравана на зніжэнне падатковай нагрузкі на прадпрыемствы рэальнага сектара эканомікі, лібералізацыю эканамічнай сістэмы і павышэнне яе інвестыцыйнай прывабнасці. У 2008 годзе падатковая нагрузка ў краіне знізілася на 1,3 працэнта да ВУП. Гэты тэмп захоўваецца і ў 2009 годзе, што забяспечвае нагрузку на ўзроўні 30,1 працэнта да ВУП. Мінфін прадоўжыць гэту работу і ў далейшым, але будзе больш дасканала падыходзіць да вырашэння пытанняў аб планаваемым скарачэнні падатковай нагрузкі ў 2010 годзе.

Акрамя таго, у Беларусі завяршаецца інвентарызацыя ўсіх дзяржаўных, галіновых і рэгіянальных праграм. Вынік гэтай работы — аптымізацыя праграм і выключэнне тых мерапрыемстваў, якія страцілі актуальнасць або малаэфектыўныя ў існуючых эканамічных умовах. Пераглядаецца парадак распрацоўкі праграм і ўзмацняецца адказнасць дзяржаўных органаў за іх эфектыўную рэалізацыю.

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ!

Гэтыя словы ў новым Гомельскім перынатальным цэнтры яшчэ не раз пачуюць жанчыны, якія тут будуць нараджаць дзетак. А пакуль віншаванне прызначана самой установе, што адкрылася на базе гарадской клінічнай бальніцы № 2, вядомай усім жыхарам абласнога цэнтра як «Чыгуначная».

Новая ўстанова аховы здароўя, разлічаная на 150 ложка-месцаў, аснашчана самым сучасным абсталяваннем, якое дазволіць правадзіць своечасовую дыягностыку і аказваць неабходную высокатэхналагічную медыцынскую дапамогу цяжарным і парадзіхам. Начальнік абласнога ўпраўлення аховы здароўя Мікалай Васількоў адзначае, што вельмі складана было перапрафіляваць бальніцу цалкам, тым не менш гэта быў правільны шлях.

— На гэтай базе сёння будуць дзейнічаць не толькі ўрачы-практыкі. Тут будуць займацца і тэарэтыкі — кафедра Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта.

— Цалкам мадэрнізаваныя сістэмы вентыляцыі, кандыцыянавання, электразабеспячэння, — расказвае галоўны ўрач бальніцы Леанід Кузняцоў. — Самае сучаснае абсталяванне: столевыя і прысценачныя кансолі для падачы і разводкі медыцынскіх газаў, новыя аперацыйныя сталы, апараты для штучнай вентыляцыі лёгкіх, дзіцячыя ложкі з падагрэвам, інкубатары для нованароджаных, аналізатар газаў крыві, якога не было ў гарадскім радзільным доме. Акрамя таго, адкрыта зусім новае абсервацыйнае прыёмнае аддзяленне, яно двухпавярховае, аўтаномнае, з французскім ліфтам. Хоць большасць начыння гэтага цэнтра — беларускай вытворчасці. Напрыклад, зручная спецыяльная мэбля з Маладзечна. Увогуле ж сучаснае медыцынскае абсталяванне для гэтага цэнтра каштавала 800 мільёнаў рублёў.

Усяго ж з абласнога бюджэту на капітальны рамонт і пераабсталяванне выдаткавана больш за 6 мільярдаў рублёў. Частка спецыялістаў з гарадскога радзільнага дома, які даўно не адпавядае сучасным патрабаванням медыцыны, перабралася ў новы будынак, але ў большасці з іх напярадзе — вялікі пераезд, які павінен закончыцца праз паўтара месяца. Пасля чаго ў гэтых сценах пачуюць гучныя галасы немаўлятак. Прынамсі, будаўніцтва яшчэ аднаго аналагічнага цэнтра будзе завершана сёлета на базе Гомельскай гарадской клінічнай цэнтральнай бальніцы.

Трэба адзначыць, што ў апошнія гады на Гомельшчыне адзначаецца станоўчая дынаміка росту нараджальнасці. Так, летась у рэгіёне нарадзілася каля 17 тысяч дзетак — амаль на тысячу больш, чым у 2007 годзе. Гэта тэндэнцыя назіраецца і сёлета. Па словах спецыялістаў, улічваючы такі тэмп нараджальнасці, які хутчэй за ўсё захаваецца, ёсць неабходнасць адкрыцця на Гомельшчыне новых радзільных дамоў. Тым больш што зараз колькасць нармальна працякаючых родаў складае толькі 20 % ад агульнай колькасці. А такія цэнтры дазволяць аказваць парадзіхам неабходную медыцынскую дапамогу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Праверана на сабе

ХОЧАШ ПРАЦАВАЦЬ У СТАЛІЦЫ? РЭГІСТРУЙСЯ!

Наколькі рэальна ў Мінску ўладкавацца на працу без адпаведнай рэгістрацыі, правярала наш карэспандэнт Настасся Занько

Пошукі пачаліся з таго, што я разгарнула набытую ў кіёску газету. І адразу ж на апошняй старонцы натрапіла на дзве аб'явы, у якіх адным з патрабаванняў да кандыдата ў работнікі была наяўнасць рэгістрацыі ў Мінску ці Мінскім раёне.

З дзесяці месцаў, куды я патэлефанавала, абавязковай рэгістрацыю палічылі ў чатырох выпадках, неабавязковай — у трох, у столькіх жа выпадках працадаўцы вагаліся, калі даведваліся, што я не маю мінскай рэгістрацыі.

Па легендзе я жыву ў Мядзельскім раёне, хачу ўладкавацца ў сталіцы, буду кожны дзень ездзіць на працу.

Пасаду кухара ў ГУО «Сацыяльна-педагагічны цэнтр» Савецкага раёна мне расхвалілі:

— У нас і кухня новая, пасля рамонту, і толькі 40 хвілін на прыгатаванне ежы.

Заробак будучаму працаўніку абяцалі ад 350 тысяч.

На маё пытанне пра рэгістрацыю замяліся: — Ой, у нас не было такога, каб без рэгістрацыі працавалі. А як жа вы з Мядзельскага раёна будзеце ездзіць? Давайце мы вам ператэлефануем.

Тэлефанаванняў я так і не дачакалася.

У адным з гіпермаркетаў горада мяне запрасілі на гутарку, сказаўшы, што рэгістрацыя для іх не мае аніякага значэння:

— Прыходзьце, там пабачым.

Для таго каб уладкавацца на працу майстрам па ўборцы памяшканняў з зарплатай ад 1 млн у адну з камерцыйных фірмаў, патрэбна напачатку адказаць на шквал пытанняў. Дзе вы працавалі? Якую тэрыторыю прыбіралі? А чаму так мала? А досвед працы? — такой доўгай тырадай пачала размову менеджар. Наконт рэгістрацыі яна адказала, што гэта ўмова важкая, але не вызначальная.

Калі я тэлефанавала ў адзін з рэстаранаў, на мой адмоўны адказ наконт сталічнай рэгістрацыі ў мяне здзіўлена спыталі: «Ой, дзяўчына, а як жа вы гэта без мінскай рэгістрацыі?». І прапанавалі прыйсці запоўніць анкету.

Праца ў пральні. Цяжка фізічна, поўны працоўны дзень і восем канкурэнтаў. Да таго ж і рэгістрацыя павінна быць мінская ці Мінскага раёна.

— Пытанні могуць узнікнуць, разумееце, — тлумачыла мне хрыплым голасам па тэлефоне жанчына. Якія і чаму і не паведаміла...

А вось працаваць медыцынскай сястрой у хоспісе можна з любой рэгістрацыяй.

— Гэта вашы праблемы, як і чым вы будзеце дабіравацца, — сказалі мне працадаўцы.

«Дзяўчаты і хлопцы ад 18 да 25 гадоў запрашаюцца ў школу круп'е. Навучанне і стыпендыя. Добры заробак і працаўладкаванне». Тэлефаную, спасылаюся на досвед.

— Вы з Мядзельскага раёна? Тады можам вас узяць, прыходзьце на гутарку. Галоўнае для нас — каб рэгістрацыя была ў Мінску ці Мінскай вобласці, — ветліва кажуць у казіно.

Каб уладкавацца гандлёвым прадстаўніком за зарплату 1,1 млн, патрэбна вышэйшая адукацыя, досвед працы і асабісты аўтамабіль. Рэгістрацыя можа быць любая. А вось памочнік выхавацеля з заробкам ад 400 000 павінен мець пашпарт са штампам аб рэгістрацыі ў Мінску ці Мінскім раёне. Загадчыца іншага дзіцячага садка вагалася і папрасіла патэлефанаваць пазней.

З дзесяці месцаў, куды я патэлефанавала, рэгістрацыю абавязковай палічылі ў чатырох выпадках, неабавязковай — у трох, у столькіх жа выпадках працадаўцы вагаліся, калі даведваліся, што я не маю мінскай рэгістрацыі.

У адным з кадравых агенцтваў Мінска сітуацыю пракаментавалі так:

— Разумееце, для таго, каб уладкавацца на працу ў сталіцы, вам у любым выпадку патрэбна будзе мінская рэгістрацыя. Бо праца — гэта ж надоўга. Як мінімум на год. Гэта, праўда, залежыць ад таго, куды вы ўладкоўваецеся. Калі праца высокааплатная, то часцей за ўсё без мінскай рэгістрацыі ніяк. Ды і самі наймальнікі такім чынам страхуюцца. Мы рэгіструем сваіх кліентаў на год за 130 долараў. Кошт нашай паслугі 100 тысяч.

І прапанова агенцтва абыдзецца не нашмат даражэй за прапановы прыватных асобаў. Сёння зарэгістравацца ў Мінскім раёне каштуе ад 412 тысяч рублёў, у самім горадзе кошты павялічваюцца ўдвая. Гэта кошт месца для рэгістрацыі.

Сітуацыю каментуе **начальнік упраўлення занятасці Мінгарвыканкама Чэслаў РОЎБА:**

— Даўно ўжо гэтыя пытанні знятыя. Для таго каб уладкавацца ў горадзе Мінску, мінская рэгістрацыя не патрэбна. Згодна з Працоўным кодэксам (арт. 26) наймальнік мае права запатрабаваць дакумент, які пацвярджае асобу, і дакумент аб адукацыі, а таксама працоўную кніжку, калі яна ёсць. Ну, і дадатковыя дакументы (медыцынскія даведкі і г.д.), калі гэта прадугледжана заканадаўствам. Патрабаваць дакументы, якія не прадугледжаны законам, працадавец не мае права.

Чалавек можа быць зарэгістраваным хоць у Гомелі, але, напрыклад, калі мае магчымасць працаваць у Мінску, ніхто не мае права яму адмовіць толькі з-за адсутнасці мінскай рэгістрацыі. Калі такое адбываецца, значыць, працадавец перавышае свае паўнамоцтвы.

Як патлумачылі ў Мінскім гарадскім упраўленні Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, рэгістрацыя з'яўляецца праблемай самога працаўніка, а ніяк не працадаўца. Наймальнік не павінен прымушаць рэгістравацца свайго супрацоўніка.

Калі ж вас не бяруць на працу толькі з-за адсутнасці рэгістрацыі, вы можаце абскардзіць такое рашэнне праз суд.

Настасся ЗАНЬКО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«ЮЛЕНЬКУ» ЎСЫНАЎЛЯЕ АМЕРЫКА?

Галівудскія зоркі будуць асвойваць сюжэт беларуса Курэйчыка

Кінакампанія «XX ВЕК ФОКС» зацікавілася фільмам «Юленька», які выйшаў у расійскі пракат напачатку года. Фільм Аляксандра Стрыжэнава па сцэнарыі беларускага аўтара Андрэя Курэйчыка выклікаў супрацьлеглыя водгукі. Але дакладна не прайшоў незаўважаным. Яго пажадалі набыць кінапракатчыкі Францыі, зацікавіліся ім у некаторых іншых еўрапейскіх краінах. Асабліва заманлівую прапанову прадзюсар Рэнат Даўлецьяраў атрымаў ад адной з найбуйнейшых амерыканскіх студый, якая пажадала зрабіць рымейк гэтага фільма для амерыканскага рынку.

Ці застанецца галоўная гераіня-дзяўчынка Юленькай, ці яна атрымае новае імя? Дакладна вядома, што загаворыць яна на англійскай мове. А яе мамай стане ў будучай карціне якая-небудзь галівудская зорка замест актрысы Ганны Казючыц, былой мінчанкі. Ды і імя сапраўднага бацькі, які нарадзіў «Юленьку» ў кінасцэнарыі, зусім не факт, што будзе захаванае для амерыканцаў. Таму што ўсё-такі трэба адчуваць мову, ведаць спецыфіку кінарынку. Аднак, калі што, наш Курэйчык гатовы амерыканцам патлумачыць сэнс свайго сюжэту.

Іншая справа — хутчэй за ўсё «за так». Таму што свой сцэнарый і ўсе правы на яго Андрэй Курэйчык прадаў прадзюсару. А той як уласнік мае права перапрадаць яго таму, каму хоча і за любыя грошы. І абсалютна магчыма, што за права на рымейк расійскі прадзюсар атрымае больш, чым сам заплаціў сцэнарысту. Паколькі аўтар сваё ўжо атрымаў, то цяпер можа суцяшаць сябе тым, што дзякуючы студыі «XX ВЕК ФОКС» Амерыка прыме «Юленьку» ў сваю кінематаграфічную сям'ю.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ
о покупке акций СОАО «Речицапиво»

1. Полное наименование и местонахождение покупателя акций:	Совместное открытое акционерное общество «Речицапиво», расположенное по адресу: ул. Молодежная, 3а, 247500, г. Речица, Гомельская область, Республика Беларусь.
2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:	Совместное открытое акционерное общество «Речицапиво», расположено по адресу: ул. Молодежная, 3а, 247500, г. Речица, Гомельская область, Республика Беларусь.
3. Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель	65 000 (шестьдесят пять тысяч) простых (обыкновенных)
4. Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции:	34 060 (тридцать четыре тысячи шестьдесят) белорусских рублей за одну акцию.
5. Сроки, форма и порядок оплаты акций	в течение 20 (двадцати) банковских дней с даты зачисления акций на счет «депо» покупателя. Оплата в безналичной форме денежными средствами в белорусских рублях.
6. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций:	г. Минск, ул. Сурганова, 48а (ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа») Гомельская обл., г. Речица, ул. Молодежная, 3а (СОАО «Речицапиво»)
7. Дата начала срока представления предложений акционеров на продажу акций: Дата окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций:	26 марта 2009 г. 31 марта 2009 г.
8. Дата начала заключения договоров купли-продажи акций: Дата окончания заключения договоров купли-продажи акций:	01 апреля 2009 г. 30 июня 2009 г.
9. Телефон для справок:	(02340) 27593; 22551.

УНП 400016657

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, футболкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь» і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 красавіка 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 красавіка 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 04.03.09 па 10.04.09.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 сакавіка 2009 года. Удачы ў гульні!

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1339 ад 03.03.09 выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на II кв. або 1-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ _____ месца _____ літар _____

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____
(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт падпіскі _____ руб. пераадрасоўкі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____
(прозвішча, ініцыялы)

Куды _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ТЭРЫТОРЫЯ КІНО

У той час, калі ва ўсіх на языку быў скандал вакол расколу Саюза кінематаграфістаў Расіі, шмат хто з нашых землякоў абмяркоўваў варыянты, чым гэта ўсё скончыцца для Мікіты Міхалкова, але мала хто засяродзіў увагу на тым, што адбыліся змены ў кіраўніцтве Саюза кінематаграфістаў Беларусі. Навіны з Расіі, вядома ж, засланілі ўсё. Хоць нашы былі не менш гучныя: напрыканцы мінулага года з'езд Саюза кінематаграфістаў Беларусі так і не змаглі правесці. Зразумела, наўрад ці тут можна гаварыць пра раскол — у беларускіх кінематаграфістаў у адрозненне ад расійскіх няма чаго дзяліць, — але разброд і ваганні ўсё-такі сведчылі пра нейкую не вельмі аптымістычную тэндэнцыю.

Пераадолець яе збіраецца Віктар Васільеў, які у выніку доўгіх і пакутлівых роздумаў усіх зацікаўленых стаў выконваць абавязкі старшыні Беларускага Саюза кінематаграфістаў. Прычым з сібірскім запалам — менавіта з Расіі артыст Васільеў у сярэдзіне 80-х прыехаў працаваць у беларускі тэатр. Чаго дзівіцца, што за развіццём канфлікту ў кінематаграфічнай супольнасці суседняй краіны ён назірае асабліва зацікаўлена? Тым больш што развязка там, магчыма, адбудзецца толькі напрыканцы сакавіка, калі Міхалковым прызначаны надзвычайны з'езд. І тут сапраўды прыгадваюцца словы пра тое, што «мы, беларусы, мірныя людзі». Калі разабрацца, у нашых кінематаграфістаў сітуацыя, магчыма, нават больш крыклівая, аднак жа неяк без «надзвычайшчыны» абышліся. Вось што значыць, калі амаль усе за адно. «Адно» і самае галоўнае на гэтым этапе, паводле Віктара ВАСІЛЬЕВА, — гэта найперш захаванне самога Саюзу і вяртанне павагі да яго і да творчай асобы.

СТОМЛЕНЫ З'ЕЗДАМ

— Чаму так здарылася, што ўвогуле ўзнікла пытанне наконт выбрання новага старшыні Беларускага Саюза кінематаграфістаў?

— Юрый Цвяткоў адчуў, што здароўе не дазваляе яму працаваць на поўную сілу. У кастрычніку ён падаў заяву, што хоча сысці з пасады старшыні Саюза кінематаграфістаў. Праўленне яго зразумела. Згодна са Статутам, калі ўзнікае сітуацыя, якая патрабуе выбрання новага старшыні, трэба збіраць надзвычайны з'езд. Але ён не адбыўся. Тады згодна са Статутам збіраецца пашыраное праўленне, якое вырашае пытанне выбару старшыні. У нас было шмат кандыдатур, прапаноўвалі нават збоку. Але згодна са Статутам трэба выбіраць сярод членаў праўлення. Галоўны крытэрый — жаданне працаваць на арганізацыю, а не на сябе. На працягу трох дзён абмяркоўваліся розныя кандыдатуры. Ведаеце, мы ідзём у нагу з часам, але бывае, што трэба спыніцца. На маю думку, калі з'езд не правялі, не змаглі абраць старшыню ў першы дзень, на другі — гэта ўжо надзвычайная сітуацыя. І калі паступіла прапанова разгледзець маю кандыдатуру, то я сказаў: «Я не адмоўлюся і не адмаўляюся. Наадварот, вазьмуся за гэтую справу. Але мы павінны зразумець, чаго мы хочам. А з іншага боку, зразумець, ці таго чалавека выбіраем, каб потым не было непаразменняў і шкадавання». Я спецыяльна адцягнуў час галасавання, для таго каб кожны чалавек усвядоміў ці прапанаваную іншую кандыдатуру.

— Калі сапраўды склалася неадназначная сітуацыя, то, напэўна, людзі зняверыліся ў эфектыўнасці існавання арганізацыі? Вы верыце, калі яе ўзначалілі?

— У нас павінен быў сабрацца з'езд, але ён не сабраўся. Я лічу, па дзвюх асноўных прычынах. Па-першае: мы дрэнна папрацавалі, калі яго рыхтавалі. Мы не дазваліся да кожнага, не дамовіліся з кожным, не патлумачылі, чаму Саюз патрэбны кожнаму яго члену. Нас не шмат — на той момант было 360 з лішнім членаў Саюза кінематаграфістаў. Па-другое — няўжо ў тое, што Саюз можа быць карысны кожнаму з нас, творцаў. Па-трэцяе, адыграла сваю ролю і нядбайнасць тых, хто некалі меў магчымасць кантраляваць картатэку. Мне так падаецца, таму што ўлік членаў — гэта ўлік іх творчага жыцця, іх дасягненняў, улік асабістых святаў. Калі я пачаў рабіць рэвізію, то выявіў, што тэлефоны не тыя, адрасы не тыя...

Прызначаны з'езд не адбыўся яшчэ і з-за адсутнасці людзей, якія былі «вісякамі». У нас шмат людзей фактычна даўно не мелі дачынення да Саюза кінематаграфістаў, але фармальна працягвалі ў яго ўваходзіць. Пазней я падрыхтаваў дакументы на адлічэнне іх з Саюза і вынес гэтае пытанне на праўленне. Калі мы хочам, каб нас паважалі, то павінны ўзяць на сябе смеласць адлічваць людзей, і ў той жа час перагледзець свае пазіцыі наконт прыёму маладых.

— Колькі засталося пасля чысткі шэрагаў?

— Не будзем называць гэта чысткай. Я не з тых калонаў, дзе робяць чыстку. Гэта добрасумленнае пазбаўленне ад баласту. У выніку на сённяшні дзень засталося 329 членаў Саюза кінематаграфістаў.

— Каго выключылі, калі не сакрэт?

— У нас прадугледжаны выхад з Саюза па заяве. Самі выйшлі Ігар Волчак, Таццяна Логінава, Ігар Чацвярыкоў, Ала Бабкова. Хоць гэтыя людзі выйшлі яшчэ некалькі гадоў таму, але іх заявы ляжалі без адказу. Яны матывавалі сваё рашэнне так: «А што такое на сённяшні дзень Саюз кінематаграфістаў?» Я лічу, што гэта няслушны крок. Але гэта іх права. Крыўдна тое, што таленавітыя людзі прыйшлі да нявер'я.

Але шмат хто вярнуўся і нават выплаціў узносы. Праблема ў тым, што людзі без павагі ставяцца да пытання выплаты членскіх узносаў, кажуць, маўляў, давайце ўсё перакрэслім і пачнём па-новаму. Але існуе бухгалтэрыя, закон, ёсць даўгі перад Саюзам, якія трэба кампенсаваць. І калі-небудзь Саюз дапаможа ім.

ЖОРСТКІЯ РАМАНСЫ

— А на ваш погляд — што такое Саюз кінематаграфістаў сёння? І калі ёсць жаданне яго змяніць, то якім чынам?

— Сёння я не стаўлю задачу вярнуць усё да ўзроўню мінулых слаўных часоў. Важна хоць бы запусціць кола, якое спынілася. Так, Саюз сапраўды павінен мяняцца. Але ён не павінен мяняцца ў прафсаюзны бок. Ён павінен кардынальна памяняць сваю палітыку. Акрамя таго, што ў нас ёсць сумесныя планы, мы павінны вырашаць праблемы, якія існуюць. У нас адсутнічае злучэнне з моладдзю, Саюз раскіданы па прафесіях, у нас не выбудаваныя секцыі — аператарская, акцёрская, рэжысёрская... Трэба іх аднавіць, у праўленне павінны быць уведзены кіраўнікі ўсіх секцый. Толькі тады мы будзем ведаць, чаго чакаюць людзі, тады будзем ствараць падзеі.

Трэба, каб усе нашы кінамайстры ведалі, чым мы займаемся, куды рушым, куды ідуць грошы... Сёння кожны з нас не ведае праблем, ён пакрыўджаны на Саюз. Трэба вярнуць павагу да яго. Дзеля гэтага неабходна вызваліць ад выплаты членскіх узносаў удзельнікаў вайны і людзей, якія дасягнулі 75-гадовага ўзросту. Яны за сваю працу столькі зрабілі карыснага для краіны, для сваёй прафесіі, што маюць права быць ганаровымі членамі Саюза.

— Арганізацыя ў асноўным існуе на ўзносы?

— У асноўным сёння гэта так. Таму што скончыліся грошы, якія мы атрымалі ў часы распаду СССР, калі выходзілі з Канфедэрацыі Саюзаў. Была прапанова пакінуць грошы ў Расіі і атрымліваць працэнты, але ад яе адмовіліся. Маё меркаванне, што не трэба было гэтага рабіць. Таму што грошы павінны працаваць. Я тады не разбіраўся ў гэтым, і не я адзін. І зараз я шмат чаго не ведаю, але ўжо разумею, што калі ёсць грошы, яны павінны працаваць на будучыню, а не траціцца ўпустую. Скончыліся грошы — людзі разбягліся. Але не ў грошах справа. Грошы вельмі важныя для Саюза, для кожнага чалавека. Гэта хлусня, калі кажуць, што можна рабіць нешта бясплатна. Бясплатна толькі крадуць.

Шмат якія кіраўнікі ведамстваў няправільна разумеюць, адкуль бярэцца прыбытак Саюза кінематаграфістаў. Яны лічаць, што для таго, каб зарабіць грошы, мы павінны рабіць вечарыны, творчыя сустрэчы. Але творчая сустрэча прыносіць прыбытак толькі канкрэтнаму акцёру ў памеры 10-15 долараў. Тым больш што арганізацыя мерапрыемства звязана з арэндай памяшкання, апаратуры і працай людзей, якія не абслугоўваюць.

Мы забыліся на тое, што такое Саюз па-сутнасці. Гэта кавалачак дома. Таму што «кіношнікі» — гэта асаблівыя людзі. Каб абмяркоўваць нейкія праблемы, творча расці, нам трэба збірацца, скінуць з сябе тыя праблемы, якія мы носім у сабе, калі сядзім па кватэрах. У нас павінны быць дні сустрэч, павінна быць сваё памяшканне. Патрэбны цэнтр, дзе людзі за кубачкам кавы, чаю, газіроўкі маглі б паразмаўляць. Тады праблемы будуць сыходзіць самі сабой. Тады будзе больш празрыстай дзейнасць шмат якіх творцаў, арганізацый, Саюза ў тым ліку.

СОНЦА СВЕЦІЦЬ УСІМ?

— Саюз кінематаграфістаў Беларусі шмат чаго страціў зза таго, што надта шпарка прымаліся рашэнні. Мы адмаўляліся ад будынкаў, якія нам давалі — у свой час дзяржава ва ўласнасць прапаноўвала нам не адзін будынак. Але цяпер Саюз кінематаграфістаў знаходзіцца ў такім становішчы, што ў нас адзін пакой на правах арэнды. Хоць мы некалі «прабівалі» пераўтварэнне будынка кінатэатра «Партызан» у Дом кіно. Мы ж зараз арандуем у ім адзін пакой, пра які нам увесь час нагадваюць: «А вы заплацілі арэнду?» І мы нічога не можам зрабіць. Калі прымалася рашэнне, то нехта павінен быў мець на ўвазе, што ў Доме кіно будзе размяшчацца Саюз кінематаграфістаў. А гэта грамадская арганізацыя, якая не можа займацца камерцыйнай дзейнасцю. Аднак плаціць за арэнду яна павінна. Якімі сродкамі?

Магчыма, пасля рамонту кінатэатра «Партызан» трэба было прадумаць, якім чынам у гэтых умовах зможа існаваць Саюз кінематаграфістаў Беларусі. Трэба было падумаць, якая функцыя будзе ў Дома кіно і ў Саюза кінематаграфістаў. Таму што фактычна мы падмяняем адзін аднаго, толькі Дом кіно — гарадская структура, а Саюз — рэспубліканская. У Доме кіно працуюць метадысты. Яны па-сутнасці выконваюць нашу працу. А ў нас у той жа час абмежаваныя магчымасці, няма чым плаціць людзям. Зала нам не належыць, пакоі для абмеркаванняў — таксама. Саюз кінематаграфістаў у любы момант павінен мець магчымасць сабраць людзей, мець доступ у залу, каб правесці мерапрыемства. А мы ходзім і выпрошваем: «Ці можна праз месяц тут нешта арганізаваць?» А нам могуць адказаць, што ў іх свае планы. Немагчыма планаваць нават творчыя вечарыны нашых кінамайстроў.

Па-сутнасці, няшмат трэба Саюзу кінематаграфістаў. Яму патрэбна памяшканне — хоць бы тры пакоі: праводзіць нарады, вучобу, збіраць праўленне, захоўваць дакументацыю. І яшчэ адзін раз на тыдзень трэба мець права распараджацца залай. На мой погляд, не павінны ўваходзіць у канфлікт дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі. Яны павінны сумесна працаваць. Але калі залу трэба выпрошваць, то гэта ўжо наўрад ці можна назваць сумеснай працай.

— А на якую сумесную працу з дзяржаўнымі ўстановамі вы разлічваеце?

— Саюз кінематаграфістаў — гэта арганізацыя, якая не мае грошай, не зарабляе іх. Але яна існуе ў гэтай краіне, яна, між іншым, працуе на яе славу. У такіх умовах, у якіх мы апынуліся, ніякія ўзносы нам не дазволяць сёння захаваць самую арганізацыю жыццяздольнай — каб мы не думалі пра дробязі побыту, а сапраўды вырашалі творчыя праблемы. На цяперашнім этапе мы губляем сваю энергію на лісты, размовы, цяжбы, тлумачэнні. Робім гэта дзеля тых людзей, якія ствараліся Саюз, дзеля тых, хто зараз у Саюзе і дзеля той моладзі, якая будзе верыць у яго і папоўніць нашы шэрагі.

Мы б хацелі працаваць мэтанакіравана, каб мець свой будынак і выкарыстоўваць яго ў сваіх мэтах — гэта мара. Гэта, дарэчы, адна з крыніц, дзякуючы якой існуе Саюз кінематаграфістаў Расіі. Але ў нас такой магчымасці няма. Самае вялікае пытанне для нас — памяшканне і яго аплата. Наша грамадская арганізацыя існуе, пра яе яшчэ чуюць. Але атрымліваецца, што насамрэч яна не можа без падтрымкі дзяржавы. Падманваць дзяржаву — падманваць самога сябе.

— Але не забыты той час, калі творчыя людзі імкнуліся максімальна дыстанцыравацца ад стасункаў з дзяржавай.

— Я разумею, чаму ў свой час кінематаграфісты імкнуліся адасобіцца ад палітыкі — калі гэта адбывалася, творцы імкнуліся скінуць з сябе нейкі ідэалагічны цяжар, які застаўся ў спадчыну ад Савецкага Саюза. Але ўсё мяняецца. Цяпер мы — грамадзяне іншай краіны. Я не лічу, што мы павінны быць вольнымі ад яе.

Ларыса ЦІМОШЫК.

PS. *Праблемы Саюза кінематаграфістаў Беларусі абмяркоўваліся на сустрэчы ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Акрамя прадстаўнікоў Саюза, на ёй прысутнічалі прадстаўнікі кіраўніцтва Мінскага гарвыканкама і дэпартамента па кіно Міністэрства культуры. Памочнік Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі падзякаваў беларускім кінамайстрам за працу ў папярэднія гады, а вырашэнне праблем Саюза кінематаграфістаў ён паабяцаў узяць пад свой кантроль і папрасіў гарадскія ўлады і Міністэрства культуры зрабіць крок насустрач гэтай грамадскай арганізацыі. Міхаіл Ціцянкоў ад імя кіраўніцтва горада Мінска прапанаваў дапамагчы ў выдзяленні глядацкай залы некалькі разоў на тыдзень для патрэбаў Саюза. Кіраўніцтва горада можа звярнуцца да арганізацый з просьбай па магчымасці падтрымаць кінематаграфістаў, якія доўгія гады працавалі дзеля свайго народа, ствараючы моцнае кіно, якое з'яўлялася творам краіны.*

ВІРУС у кожным з нас,

Распаўсюджаныя інфекцыі

або У якіх грахах падазраецца герпес?

Вірус герпесу абвінавачваюць у праяўленні шэрагу самых розных захворванняў, у тым ліку нервовых, скураных, анкалагічных, хваробах слізістых, вачэй, мочапалавой сістэмы. На сёння вядома 8 тыпаў віруса, аднак не выключана, што спіс будзе пашыраца, і адпаведна будзе павялічвацца колькасць захворванняў, якія падазраюцца ў сувязі з імі.

Найбольшую распаўсюджанасць у папуляцыі атрымалі пакуль вірусы 1 і 2 тыпаў. Вірус 1 тыпу звычайна заяўляе аб сабе непрыемнымі высыпкамі на вуснах, слізістай ротавай поласці, 2 тыпу — паражае мочапалавую сістэму і, адпаведна, праяўляецца высыпкамі на геніталіях. Радзей сустракаецца вірус 3-га тыпу — яго яшчэ называюць вірусам зостэра — прычына вятранкі ў дзяцей і апаясвальнага лішая, ці міжрабрыннай неўралгіі ў дарослых... Усім тыпам можна эфектыўна «супрацьстаяць», асабліва калі пачынаць дзейнічаць пры першых сімптомах праяўлення інфекцыі, і, зразумела, з удзелам спецыялістаў. Трэба мець на ўвазе, што пазбавіцца віруса герпесу не ўдасца, але правільныя дзеянні дапамогуць стрымліваць буйнае развіццё інфекцыі і, значыць, забыцца на непрывабныя знешнія праявы.

Бліжэй да паўналецця фактычна кожны з нас з'яўляецца носьбітам герпеснай інфекцыі. Тлумачыцца гэта тым, што вірус досыць лёгка перадаецца ад інфіцыраванага чалавека здароваму, прычым найчасцей гэта адбываецца ў сям'і, ад бацькоў — дзецям. Заражэнне можа адбывацца як непасрэдна падчас родаў, так і пры карыстанні шэрагам бытавых прадметаў, тых жа ручнікоў.

Нельга меркаваць аб наяўнасці віруса герпесу толькі па характэрных высыпках. Іх можа і не назіравацца, калі гэтага не дапускае наша трывалая імунная сістэма. Дакладны адказ аб інфіцыраванні герпесам дае толькі спецыяльны аналіз крыві на антыцелы і антыген віруса.

— Важна мець на ўвазе не столькі сам факт з'яўлення непрыемных высыпак, колькі частату рэцыдываў, — тлумачыць **доктар медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік клініка-эксперыментальнай лабараторыі хранічных нейраінфекцый Навукова-даследчага інстытута эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Марк ХМАРА**. — Па вялікім рахунку, калі згаданая сітуацыя назіраецца зрэдку і не суправаджаецца непрыемнымі агульнымі адчуваннямі, напрыклад, болем у целе, лімфаванкавым станам, то можна абысціся выкарыстаннем адпаведных мазяў з актыўным дзейным рэчывам — ацыклавірам. Адзінае, што патрабуецца, — пачаць прымяненне мазі адразу ж, як толькі з'явіцца першыя прыкметы.

Калі ж вірусныя пузыркі нагадваюць пра сябе з незайздроснай рэгулярнасцю, скажам, некалькі разоў на год або часцей, варта падазраваць пэўныя праблемы ў імуннай сістэме. Неабходна абавязкова звярнуцца да імунолага, зрабіць імунаграму і высветліць прычыну актыўнасці віруса. Спецыяліст павінен таксама высветліць, ці няма ў пацыента спадарожных інфекцый. Варта памятаць, што актывізацыі герпесу спрыяюць інфекцыі, якія суправаджаюцца імунадэфіцытным станам — гэта ВІЧ-інфекцыя, туберкулёз, а таксама прыроджаны імунадэфіцытны стан. Заяўляе аб сабе вірус і пасля пераахаладжэння, перагрэву ці пад уплывам стрэсавай сітуацыі...

Вядома, што некаторыя вучоныя лічаць герпетычны вірус мініклеткамі з вялікай колькасцю генаў, якія могуць умешвацца ў структуру нармальных клетак і выклікаць іх трансфармацыю. Наогул вывучэнне дзеянняў віруса ў нашым арганізме яшчэ працягваецца. Зараз увага даследчыкаў скіравана на так званыя вірусна-бактэрыяльныя садружнасці, здольнасці віруса актывізаваць бактэрыяльную інфекцыю. Абумоўлена гэта аб'ектыўным выкарыстаннем вірусам для свайго выжывання не толькі здаровых клетак, але і бактэрый.

Вірусная этыялогія паходжання раку была выказана досыць даўно. Але дагэтуль тэма не з'яўляецца завершанай. Вызначана, што вірус здольны актывізаваць і клетачныя анкагены, прасцей кажучы, узнікненне некаторых пухлін. Даказана, у прыватнасці, што вірус папіломы чалавека выклікае рак шыйкі маткі. Шэраг даследчыкаў лічаць, што гэтаму тыпу раку садзейнічае і герпетычны вірус 2 тыпу. Фатальнасць у развіцці пухліны звязваецца вучонымі і з адначасовым уздзеяннем двух фактараў. Скажам, наяўнасцю як самога віруса, так і такой дрэннай звычкі, як курэнне.

Наогул пухліны ніколі не развіваюцца раптоўна, на здаровым месцы. Анкалогія заяўляе аб сабе там, дзе орган церпіць пэўныя дыстрафічныя змяненні, калі метабалізм у клетках гэтага органа перастае быць такім, як патрэбна. Дыстрафічныя змяненні могуць з'явіцца ў выніку траўмы, гарманальных парушэнняў, таго ж курэння і г.д. Праблема ў тым, што «дрэнныя» клеткі не маюць на мэце паміраць. Так ужо створаны наш арганізм: выжыць хочуць клеткі любыя. Трагізм жа сітуацыі хаваецца ў цеснай сувязі кожнага органа, яго клетак з нервовай сістэмай, якраз тымі месцамі, дзе хаваецца вірус герпесу — сімпатычных гангліях. Не выключана, што адсюль таксама «паступаюць загады» для выжывання дыстрафічных клетак.

Ёсць работы і аб тым, што трамбозы — прычына сасудзістых катастроф — развіваюцца таксама не без удзелу віруса герпесу. Запаленне, справакаванае вірусам, у рэшце рэшт спрыяе атэрасклератычным змяненням. Падазраецца герпес і у развіцці такога запаленчага захворвання нервовай сістэмы, як рассеяны склероз. Спрыяе вірус і кагнітыўным — разумовым — парушэнням, якія прыводзяць да псіхічных захворванняў. Да ліку цяжкіх станаў, выкліканых герпесам, адносіцца і менінгітэнцэфалія — паражэнне галаўнога мозгу.

— Вірус вельмі цяжка вылучыць, — кажа Марк Яфімавіч. — Практычна гэта магчыма толькі падчас вострых станаў. Аднак дзесьці пасля 40 гадоў мы маем справу ўжо з хранічнымі формамі інфекцыі. Вострыя ж герпетычныя паражэнні маюць дакладную клінічную карціну — ліхаманка, болевы сіндром (галаўны боль), дрэннае ўспрыняцце рэчаіснасці. Пры такіх сімптомах заўсёды варта мець на ўвазе герпетычны энцэфаліт. Паводле літаратурных звестак, каля 90 працэнтаў спарадычных энцэфалітаў звязаны з вірусам герпесу. У такіх выпадках хвораму патрабуецца трэміновая дапамога. Вострыя герпетычныя паражэнні добра лечацца ацыклавірам, які ўваходзіць у шэраг прэпаратаў — таблетаваных і кропельных. Аднак ацыклавір — гэта хімічны прэпарат, які ўмешваецца і ў ферментатыўныя працэсы, таму прымаць яго трэба пад назіраннем урача...

І жанчыны, і мужчыны могуць быць носьбітамі герпеснай інфекцыі, але не мець ніякіх праяў да таго часу, пакуль імунная сістэма будзе трымаць сітуацыю пад кантролем. Дапамагаюць гэтаму і пэўныя імунакарэктары — віферон, панавір, палікседоні, супрацьгерпетычны гамаглабулін, грапрынасін. Аднак нават калі з прафілактычнай мэтай прымаць штосьці з пералічаных прэпаратаў, не выключана, што аднойчы вірус усё ж такі заявіць аб сабе.

— Для жанчын важна мець на ўвазе, што абвастрэнне віруса герпесу падчас цяжарнасці пагражае як выкідышам, так і заражэннем плода, — расказвае **кандыдат медыцынскіх навук, старшы навуковы супрацоўнік клініка-эксперыментальнай лабараторыі хранічных нейраінфекцый НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Святлана ДРАКІНА**. — Само па сабе інфіцыраванне будучай маці вірусам герпесу не з'яўляецца супрацьпаказаннем да родаў. Проста трэба назіраць жанчыну і своечасова лячыць. Пры абвастрэнні паказаны, напрыклад, такі супрацьвірусны прэпарат, як валтрэкс — прэпарат, які добра зарэкамендаваў сябе ў свеце ў адрозненне ад таго ж ацыклавіру, да якога ў некаторых даволі хутка развіваецца ўстойлівасць. Схему лячэння трэба падбіраць выключна індывідуальна. Калі востры перыяд прайшоў, можна папрымаць і імунакарэктары. З лячэбнай і прафілактычнай мэтай выкарыстоўваецца лазар. Самае важнае для пацыентаў, у якіх герпес заяўляе аб сабе досыць часта, — дамагчыся з дапамогай спецыяліста рэдкіх рэцыдываў...

Святлана БАРЫСЕНКА.

НЯПОЎНАГАДОВЫХ НЕ ВЫКЛЮЧАЦЬ!

Практыку выключэнняў няпоўнагадовых мінчан са школ, ліцэяў, каледжаў, прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў плануецца звесці да нуля. У прыватнасці, паведаміла намеснік старшыні гарадской камісіі па справах няпоўнагадовых Алена Герасіменка, з гэтага моманту любыя выключэнні стануць магчымымі пасля ўзгаднення з камісіяй па справах няпоўнагадовых і камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама.

Пры гэтым дазвол на «развітанне» будзе давацца толькі тады, калі стане зразумела, чым будзе займацца малады чалавек надалей. Як адзначыла Алена Герасіменка, гэта рашэнне павінна зменшыць узровень падлеткавай злачыннасці — не сакрэт, што часцяком парушае закон менавіта моладзь, якая не мае сталага занятку.

Дарэчы, паказчыкі падлеткавай злачыннасці ў найбуйнейшым горадзе краіны працягваюць зніжацца. Калі пазалетась удзельнікамі правапарушэнняў сталі 636, то летась — 535 няпоўнагадовых асобаў. Праўда, гэтаму ёсць і яшчэ адно тлумачэнне — больш пільная ўвага да нядбайных сем'яў. Паводле слоў Алены Герасіменкі, сёння большасць гора-бацькоў зразумела — грошы на дзяржаўнае выхаванне дзяцей рана ці позна давядзецца вяртаць, і даўгі ніхто не «спіша». Таму калі ў 2007 годзе бацькі кампенсавалі 23-25 % выдаткаў на дзяржаўнае ўтрыманне дзяцей (зараз яго поўны кошт вагаецца ў межах 230-400 тыс. рублёў у месяц), то ў 2008 годзе гэты паказчык дасягнуў 64 %. Але галоўны вынік іншы — летась у сталіцы з 587 дзяцей, што былі адабраныя з нядбайных сем'яў і часова змешчаныя ў сацыяльныя прытулкі, 221 вярнуўся ў свае родныя сем'і.

Пры гэтым, апроч неабходнасці кампенсацыі выдаткаў, сёння ў гора-бацькоў Мінска ёсць яшчэ адзін стымул. У горадзе прынятае рашэнне не адключаць за неплацяжы электрычнасць, ваду і газ у «праблемных» сем'ях, дзе ёсць няпоўнагадовыя дзеці. Аднак у выпадку, калі дзеці адбіраюцца, бацькоў могуць перасяліць у жылыя памяшканні горшых спажывецкіх якасцяў, а іх кватэры — здаваць у наём. Разам з тым, падкрэсліла Алена Герасіменка, у выніку самі дзеці ніякім чынам не пацерпяць — пасля дасягнення паўналецця дзіця зможа проста вярнуцца ў сваю ранейшую кватэру.

Сяргей ГРЫБ.

Сёлетняя «Мотаршоу» пройдзе без традыцыйнага размаху

Паводле слоў арганізатараў выставы, мэта міжнароднага аўтасалона — не спаборніцтва ў прыгажосці і бляску, а хутчэй жаданне паказаць, што нават у цяжкі для аўтапрама час кліентам ёсць што паказаць.

Аўтаімпарцёры ў гэтым годзе зменшылі забраніраваныя выставачныя плошчы, тым не менш гэта дае дадатковыя магчымасці для размяшчэння прадстаўнікоў змежных напрамкаў. Такая акалічнасць дазволіць размясціць усіх удзельнікаў у адным павільёне і зрабіць выставу кампактнай для наведвальнікаў.

У гэтым годзе зноў вернуцца прэзентацыі на стэндах удзельнікаў, яркія эмоцыі падорыць наведвальнікам шоу-кар. Асобны акцэнт будзе зроблены на навінках, прэзентацыі якіх будуць даступныя ўсім беларусам.

«Мотаршоу» чакае наведвальнікаў з 6 па 10 мая ў сталічным Футбольным манежы.

Ул. інф.

РАННЯЕ ВЫЯЎЛЕННЕ ХВАРОБЫ — ПАСПЯХОВАЕ ЛЯЧЭННЕ

На базе Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы створаны цэнтр спадчынных пухлін. Яго асноўная задача — выяўленне той часткі насельніцтва, у якой ёсць мутантныя гены, здольныя прывесці да ўтварэння злаякасных пухлін. Паводле інфармацыі галоўнага ўрача Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Святаслава Савіцкага, у гэтым цэнтры праводзіцца вялікая работа па анкетаванні насельніцтва на прадмет абцяжаранай спадчыннасці. З дапамогай сучаснай камп'ютарнай праграмы фарміруюцца групы рызыкі захворваць злаякаснай пухлінай у цяперашнім і наступных пакаленнях. Да клінічнага праяўлення раку гэта катэгорыя людзей на базе абласной бальніцы актыўна абследуецца, у тым ліку праводзіцца геннае тыпіраванне. Сучаснае абсталяванне дазваляе выявіць ачагі хваробы памерам у некалькі міліметраў. Кансультатыўны кабінет цэнтра спадчынных пухлін знаходзіцца ў анкалагічным дыспансеры Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы. Запісацца на кансультацыю можна па тэл. 43 37 72. Больш падрабязная інфармацыя на сайце: www.cancer.grodno.by.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Рэнтген на колах едзе ў вёску

Улічваючы, што ў сельскай мясцовасці захворванасць на туберкулёз і смяротнасць ад яго ў 2 разы вышэйшая, чым у гарадах, супрацоўнікі Віцебскага абласнога туберкулёзнага дыспансэра сёлета плануюць абследаваць з выездам ў глыбінку мінімум 95 працэнтаў ад усяго насельніцтва. Напэўна, гэты працэс нейкім чынам будзе нагадваць «ваенную аперацыю» — «зачыстку». Як паведамілі «Звяздзе» ў дыспансэры, зараз у вобласці ёсць 5 сучасных флюараграфічных кабінетаў на колах.

Зараз сярод хворых на туберкулёз больш за 70 працэнтаў — мужчыны. Самая высокая захворванасць ва ўзроставай групе ад 45 да 54 гадоў. Сярод жанчын — 25—34 гады. Сацыялагічнае даследаванне паказала, што кожны пяты хворы раней знаходзіўся ў месцах пазбаўлення волі, амаль палова — злоўжывалі алкаголем...

Цікава, што менавіта ў Прыдзвінскім краі ў 1880 годзе адчынілася першая прыватная кумысная лячэбніца. А толькі потым — у Мінску. У Сусветны дзень барацьбы з туберкулёзам у самым цэнтры Віцебска — на плошчы Свабоды можна будзе праверыць стан свайго здароўя, пагутарыць з медыкамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2009 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насцярэжы Чарнобыля

Местное самоуправление · Наша справа · Жыццяпіс · Юпі! Лепшае! Тавары. Паслугі. Цэны · Змена · Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	10 120 рублёў на месяц 30 360 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	9 570 рублёў на месяц 28 710 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	16 170 рублёў на месяц 48 510 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	14 740 рублёў на месяц 44 220 рублёў на квартал
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8 690 рублёў на месяц 26 070 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 180 рублёў на месяц 24 540 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	11 640 рублёў на месяц 34 920 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11 010 рублёў на месяц 33 030 рублёў на квартал

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ (первичный)

№ лота	1	2	3	4	5
Наименование объекта	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка	Право аренды земельного участка	Продажа в частную собственность гражданам
Местонахождение объекта	г. Слоним, проспект Независимости, 21	г. Слоним, проспект Независимости, 24	г. Слоним, ул. К. Маркса, 62	г. Слоним, ул. Брестская	г. Слоним, ул. Котовского, 65
Площадь земельного участка, га	1,325	0,0148	0,0107	0,2425	0,1470
Кадастровый номер	425450100001006941	425450100001006944	425450100001006396	425450100001006970	425450100001006006
Начальная цена продажи (руб.)	35473920	394860	159360	543810	4211800
Сумма задатка, (руб.)	3500000	39000	15000	50000	400000
Форма проводимого аукциона	Аукцион с условиями				
Условия продажи объекта	1. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта (магазина) в срок, не превышающий 2 года. 2. Осуществление строительства объекта (магазина) в сроки, определенные проектно-сметной документацией. 3. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет.	1. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта (под установку остановочного комплекса с павильоном) в срок, не превышающий 2 года. 2. Строительство остановочного комплекса с павильоном в течение 2 лет. 3. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет.	1. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта (торгового павильона) в срок, не превышающий 2 года. 2. Строительство торгового павильона в течение 2 лет. 3. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет.	1. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на разработку месторождения песчано-гравийной смеси в соответствии с действующим законодательством.	1. Осуществление победителем аукциона в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственно регистрации права на земельный участок. 2. Получение победителем аукциона в установленном порядке технодокументации и разрешения на строительство жилого дома. 3. Занятие земельного участка не позднее 1 года после получения свидетельства о государственной регистрации.
Срок аренды участка	50 лет		10 лет	3 года	Продажа в собственность

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков

НАНАТЭХНАЛОГІІ: ад навуковых эксперыментаў да вытворчасці

Сёння няма такой галіны чалавечай дзейнасці, дзе б не спатрэбіліся нанатэхналогіі: ад медыцыны і электронікі да будаўніцтва жылля і вытворчасці асфальту.

Як адзначыў першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Пётр Віцязь, створаныя ў нас сістэмы дыягностыкі і тэхналагічныя прыёмы дазваляюць уплываць на структуру ўтварэння матэрыялаў на атамна-малекулярным узроўні. Цяпер мы можам не толькі вывучаць нанапрацэсы, але і тэхналагічна мяняць іх (а гэта ўжо выхад на вытворчасць). Сёння нанатэхналогіі сталі не толькі навуковым пытаннем, але і практычным, палітычным, эканамічным і філасофскім, адзначыў Пётр Віцязь. «Мы па-іншаму пачалі глядзець на жыццё, калі зазірнулі ў яго атамна-малекулярны свет», — сказаў ён.

У прамысловасці прымяненне розных нанаструктураваных матэрыялаў надае новыя функцыянальныя якасці абсталяванню і тэхніцы. Выкарыстанне нанатэхналогій у медыцыне дазваляе на клетачным узроўні выяўляць розныя паталогіі на самых ранніх стадыях захворвання. У сельскай гаспадарцы нананавука дазваляе атрымліваць генетычна мадыфікаваныя гатункі раслін, устойлівыя да пэўных кліматычных умоў. Новыя магчымасці нанатэхналогіі адкрываюць у хіміі і нафтахіміі, энергетыцы і іншых галінах народнай гаспадаркі Беларусі. Вынікі, атрыманыя пры распрацоўцы нанатэхналогій, — універсальныя і могуць быць выкарыстаны ў самых розных напрамках навукі і тэхнікі.

Беларусь была адной з першых краін на постсавецкай прасторы, якая прыняла сваю нацыянальную праграму «Нанаматэрыялы і нанатэхналогіі» (разлічаную на 2003-2010 гады). Яна, акрамя тэарэтычных даследаванняў, прадугледжвае і практычны эфект: сінтэз звышцвёрдых матэрыялаў, развіццё нанаэлектронікі, стварэнне магнітных матэрыялаў, кампазіцыйных матэрыялаў на розных асновах (палімернай, металічнай) і г.д. Паводле слоў Пятра Віцязя, ужо ёсць дзясяткі канкрэтных станоўчых прыкладаў — пакуль што ў «малой» металургіі, аднак мы ўшчыльную падыходзім да прымянення нанатэхналогій і ў галіне чорных і каляровых металаў. Задача на найбліжэйшую перспектыву — перайсці ад эксперыментальнай работы і выпуску доследных партый да маштабнага ўкаранення ў вытворчасць.

Дзякуючы своечасовай дзяржаўнай падтрымцы, у Беларусі была створана выдатная каманда высокакваліфікаваных спецыялістаў (як тэарэтыкаў, так і практыкаў), што дазволіла актыўна развівацца ў нас нанатэхналогіі. У год на распрацоўкі ў галіне наманатэрыялаў і нанатэхналогій толькі Акадэміяй навук траціцца каля 1 млн долараў, крыху больш на гэтыя ж мэты расходуе вышэйшая школа.

Інга МІНДАЛЁВА.

Антыкрызісная эканоміка

ЭНЕРГАДЫЕТА ДЛЯ КВАТЭРЫ

Магіляўчане вучацца эканоміць электраэнергію: дзесяць самых беражлівых гараджанаў атрымаюць па мільёну рублёў і стануць прыкладам для іншых. Магілёўскі конкурс «Эканомія электрычнай энергіі ў побыце» — першы падобны вопыт у Беларусі.

Ганна Васільеўна ЛЯГЕЗА набыла энергазберагальныя лямпачкі, каб выйграць у конкурсе эканоміі электраэнергіі і атрымаць прыз у мільён рублёў.

ЭНЕРГАКАПЕЙКА ЭКАНОМІЦЬ РУБЕЛЬ

Сімпатычны дамок экалагічнага салатавага колеру ў прыватным сектары абласнога цэнтра.

— Я вельмі эканомны чалавек па жыцці, і таму вырашыла, што змагу зберагчы і электраэнергію, — гаворыць гаспадыня Ганна Васільеўна Лягеза.

Пенсіянерка рашуча настроеная на перамогу. Яна адразу набыла 4 энергазберагальныя лямпачкі.

— Кожная каштуе 16 тысяч рублёў, але што рабіць? — паціскае плячыма жанчына. — Пусціўся ў бойку — кулакоў не шкадуй. Ды і ведаю я, што гэтыя выдаткі акупяцца.

Ганна Васільеўна рашуча выключыла маразільнік. Маўляў, дэфіцыту свежых харчоў у крамах няма, а 1,3 кВт у суткі — гэта замнога. «Двайная выгада: зрабіла дзецям падарунак, а сабе — эканомію».

У пральнай машыне пенсіянерка цяпер мые толькі вялікія рэчы, а драбязу — рукамі. Пасцельную бялізну не прасуе, а распраўляе вільготную: «Астатняе разгладзіцца пада мной».

Прагляд тэлевізара абмежавала адным серыялам пра каханне, адным ток-шоу і навінамі. Пыласосам карыстаецца раз на месяц, а штотыдзень абыходзіцца анучай. Радыётэлефон ставіць на базу не так часта. І нават ліквідавала электрычную запальніцу: замест яе набываю звычайныя запалкі.

— Паглядзіце мае кветкі, — дзелавіта запрашае Ганна Васільеўна. — Летась за студзень напаліла 80 кВт, а сёлета — толькі 40. У лютым, адпаведна, замест 70-ці — 35. І гэта ж яшчэ, лічы, зіма, а ўлетку я буду эканоміць яшчэ болей.

За два месяцы пенсіянерцы ўдалося зберагчы тысяч 5 рублёў — гэта энергакапейкі. Але жанчына ведае, што з капеек складаецца рубель, і за год яна плануе зэканоміць на электрычнасці больш за 30 тысяч рублёў.

САМ САБЕ ЭНЕРГЕТЫК

Удзельнікамі конкурсу зарэгістраваны 108 сем'яў. Паводле першых вынікаў за два месяцы, лідзіруюць пенсіянеры.

Марыя Васільеўна Каўкова жыве разам з дачкой, унучкай і маленькай праўнучкай у двухпакаёвай кватэры. Жанчыны ставяцца да электраэнергіі ашчадна: нават узімку нагарае не болей за 50 кВт. Калісьці за савецкім часам Марыя Васільеўна выйграла ў латарэю халадзільнік — ёй, прадаўцу, давялося набыць апошнюю ў краме латарэйку, а азарт з тых часоў не знік. А ці ўдасца выйграць мільён?

Нічога спецыяльна для гэтага гаспадыня не робіць. Аднак эканомія, што называецца, у яе ў крыві: ніколі не пераплачвае, харчуецца з «падножнага корму» на лецішчы, разам з дачкой вяжа і шые.

— Мяне жыццё навучыла эканоміць, — тлумачыць свае здольнасці Ганна Васільеўна Лягеза. — Пасляваеннае дзяцінства, жылі вельмі бедна, недаядалі. Кожны кавалак хлеба і ахапак сена для каровы былі на ўліку. Заробкаў не хапала, цяпер пенсія не «вельмі», таму нічога не выкідаю і набываю ўсё самае таннае. Моладзь ставіцца да жыцця ўжо па-іншаму.

Іншая ўдзельніца конкурсу, Святлана Васільеўна Дабрынёва, расказала, што яе дзеці паставіліся да матчынага захаплення без энтузіязму. Маладым падаецца, што гэта эканомія на здароўі і камфорце.

Але Святлана Васільеўна хоча выйграць грошы і паесці дасыта смачнай заморскай садавіны, якой на сваю пенсію яна сабе дазволіць не можа. Таму на халодны сезон яна адключыла халадзільнік і карыстаецца балконам, а таксама ліквідавала вызначальнік тэлефонных нумароў — маўляў, Джэймс Бонд тут не жыве. Вось і атрымліваецца эканомія.

Загадчык сектара энергетыкі і паліва гарвыканкама Валерый Барэйша, які ўваходзіць у склад журы конкурсу, перакананы, што ў кожнай сям'і ёсць рэзервы для эканоміі.

— Калі б я браў удзел у конкурсе, то знайшоў бы спосаб выйграць мільён, — упэўнены Валерый Аляксандравіч. — Па-першае, замяніў бы ў сваім доме электрычны бойлер на газавы. Гэта, безумоўна, значныя выдаткі, але мадэрнізацыя акупіцца ў будучыні. Ёсць цэлы комплекс мерапрыемстваў, якія гарантавана даюць эканомію электраэнергіі. Наш конкурс заахвоціць людзей эканоміць: гэта будзе папулярызацыя не словам, а рублём.

Пра ўсе магчымыя спосабы эканоміі энергіі распавядуць у Магілёўскім інфармацыйна-кансультацыйным цэнтры па энергазберажэнні. Ён быў створаны пры садзейнічанні ўрада Германіі паўгода таму.

Цэнтр — гэта банк карыснай інфармацыі, якая сабрана на інтэрнэт-сайце www.2e.technopark.by, а таксама людзі — энтузіясты эканоміі энергіі. Галоўны з іх — дырэктар ЗАТ «Тэхналагічны парк Магілёў» Васіль Малачкоў.

Гадоў пяць таму Васіль Аляксандравіч пазнаёміўся са стаўленнем немцаў да эканоміі энергіі. Спачатку падавалася, што такі педантычны падыход не для нас. Аднак усё ж рашыўся набыць першую энергазберагальную лямпачку і ацаніў яе: для таго, каб добра чытаць, раней патрэбна было 500 Вт, а тут хапае і 75-ці!

— Так я імгненна «захварэў» на энергазберажэнне, — прызнаецца Малачкоў. — Звычайныя лямпы напальвання я знішчыў у сваёй кватэры як клас — і ўдвая скарацію расход электрычнасці. Цяпер сябрам раблю энергазберагальныя падарункі і кансультую ўсіх, хто хоча эканоміць энергію.

ДАРАГАЯ ЛЯМПАЧКА

Якія ж сёння ёсць спосабы эканоміі электраэнергіі?

1. **Выключаць!** Самыя простыя дзеянні: разумна выкарыстоўваць бытавыя прыборы і не асвятляць пустыя пакоі.

2. Трэба **адмовіцца ад рэжыму чакання «stand-by»**. Падлічана, што ў адной кватэры можна эканоміць да 350 кВт у год, калі выключаць тэлевізар, мікрахвалевыя печкі, камп'ютары і ўсё, што свеціцца чырвонымі лямпачкамі і лічбамі гадзіннікаў.

Калі не верыце, скарыстайцеся спецыяльным калькулятарам ці лічыльнікам эканоміі на сайце цэнтра энергазберажэння. Калі выключыць «stand-by» толькі на двух тэлевізарах, то за год пры цяперашніх тарыфах можна зэканоміць каля 25 тысяч рублёў. І на гэта не патрэбны інвестыцыі — проста быць уважлівым і не ленавацца.

3. Набыць **энергазберагальныя лямпачкі**.

— Самая простая лямпачка толькі 5% энергіі пераўтварае ў святло, а энергазберагальная — у 5 разоў болей, — гаворыць Аляксандр Малачкоў. — І нават нягледзячы на тое, што звычайная лямпачка каштуе 700 рублёў, а энергазберагальная — 10 тысяч, усё адно выгадна набываць!

Перакананць у гэтым зможа яшчэ адзін калькулятар. Калі ў спецыяльніку пяць звычайных лямпачак замяніць на энергазберагальныя, то за год можна зэканоміць 90 тысяч рублёў. Энергазберагальная лямпачка цягне на 80% менш энергіі, а жыве ў 8-10 разоў больш. Мая першая энергазберагальная лямпачка сведчыць ужо 10 гадоў.

4. Набываць новыя **бытавыя прыборы з улікам маркіроўкі энергаэфектыўнасці**.

Цана і знешні выгляд — гэта важна, але трэба зважаць на энергаэфектыўнасць і аддаваць перавагу эканомнаму класу «А». Можна выбраць больш танны халадзільнік, але ён за сваё жыццё можа зжэрці столькі энергіі, што ўрэшце абыдзецца даражэй за іншы. Можа, варта заплаціць болей сёння, каб зэканоміць заўтра?

Ёсць яшчэ шэраг парадаў па эканоміі электраэнергіі. Напрыклад, не трэба ставіць цёплую каструлю ў халадзільнік — гэта будзе каштаваць энергіі для халаджэння і, адпаведна, прыстойных грошай. Не трэба кіпяціць у пральнай машыне бялізну, а набыць біяпарашок, які адмыле плямы пры нізкай тэмпературы. І гэтак далей. Аднак нават калі выканаць тры першыя пункты з нашага спісу, выдаткі на энергію можна скараціць як мінімум на трэць.

«ЗЯЛЁНАЕ» СВЯТЛО

У цэнтры гавораць, што іх інфармацыю вельмі добра ўспрымаюць пенсіянеры, якія на ўсім эканомяць, а таксама школьнікі, якія часта прыходзяць на заняткі ў цэнтр. Лозунг маладых: «Навучы бацькоў і атрымай працэнт з эканоміі».

— Людзі хочуць эканоміць і кажуць нам: «Ой, вы адкрылі нам вочы!», — гаворыць Васіль Малачкоў. — Аднак эканомія працуе не толькі на кашалёк, але і на прыроду. У нашых калькулятарах паказваецца не толькі эканомія грошай, але і колькі кілаграмаў вуглякіслага газу не трапіць у выніку нашай эканоміі ў атмасферу Зямлі.

Самога Васіля Аляксандравіча эканоміць энергію падштурхнулі якраз не грашовыя праблемы, а ўсведамленне таго, што эканомія працуе на экалогію. Гэты аспект у нас не часта бяруць пад увагу: шмат размаўляюць пра эканомію як пра нацыянальную бяспеку і эканомію валюты, але вельмі мала — пра парніковы эфект і будучыню планеты.

— Мы хочам перакананць, што эканомяць прасунутыя людзі, што гэта важны элемент культуры сучаснага чалавека, — кажа Малачкоў. — Нават калі ў цябе ёсць грошы, ты не маеш права паліць святло без межаў, таму што павінна быць асабістая адказнасць перад усім чалавецтвам.

У сувязі з гэтым, лічаць мае суразмоўцы, крызіс можа даць ачышчэнне. Праўда, усе яны сумняваюцца, што заможных людзей, якія прызвычаіліся да раскошы і літаральна «светлага» ладу жыцця, наўрад ці можна прымусіць эканоміць на клаватах — для іх гэта драбяза. А вось людзі з даходамі сярэднімі будуць эканоміць на ўсім і не цурацца выключэння электрапрыбораў.

Сёння гэтыя прагнозы пакуль не спраўджваюцца. Як паведаміў загадчык сектара энергетыкі і паліва Валерый Барэйша, насельніцтва Магілёва спажыло за сёлетнія студзень і люты больш энергіі, чым у першыя два месяцы летась. І калі расход цяпла можна апраўдаць нізкімі тэмпературамі, то як растлумачыць, што электраэнергіі гараджане спалілі на 6,6% больш?

— Павялічваецца ўзровень жыцця людзей, і яны набываюць новыя бытавыя прыборы для камфортнага жыцця, — растлумачыў Валерый Аляксандравіч. — Леташні год быў добрым, мы набывалі тэхніку, якая цяпер працуе і цягне электраэнергію.

СВЕТЛЫ ШЛЯХ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ

Энергазберагальныя тэхналогіі прыходзяць у жыццё чалавека. Іх сімвалам у Магілёве стаў вятрак, які цэнтр па энергазберажэнні ўсталяваў на даху высокага будынка Тэхнапарка. Ён забяспечвае электраэнергіяй дэманстрацыйны пакой, дзе магіляўчанам паказваюць энергазберагальныя лямпачкі і пераконваюць у эфектыўнасці новых тэхналогій.

Можна эканоміць энергію не толькі ў кватэрах, але і ў пад'ездах. Напрыклад, у Кастрычніцкім раёне абласнога цэнтра, на бульвары Няскораных, у адной са шматпавярховак ёсць узорны пад'езд. Старэйшая па пад'ездзе Паліна Салдаценка разам са сваімі суседзямі па паверху зрабіла інтэр'ер у яркіх колерах на лесвічнай пляцоўцы. Яшчэ адна важная адметнасць пад'езда — энергазберагальная сістэма асвятлення. Святло ўключаецца толькі ўслед за гукам — калі адчыняюцца дзверы пад'езда, кватэры альбо ліфта.

— Усім хочацца жыць лепей: добра, калі і зручна, і ёсць эканомія, — тлумачыць Паліна Дарафеёўна. — Мы з розумам карыстаемся электрычнасцю, дарма не палім. Гэта ж нашы грошы.

Конкурс па эканоміі электрычнасці ў побыце працягнецца да канца года. Потым 25 фіналістаў распавядуць журы і грамадскасці пра свой досвед у справе энергазберажэння. Дзесяць чалавек у выніку атрымаюць запаветны мільён, і гэта стане дадатковым стымулам для ўсіх гараджанаў эканоміць і, верагодна, уключыцца ў новы конкурс. У Магілёве прагназуюць, што ў наступным годзе ўдзельнікаў будзе як мінімум у дзясятак разоў больш.

Ілона ІВАНОВА.

Бобровичский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

Проводит открытый аукцион по продаже 5 (пяти) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: **Лот 1** — земельный участок в деревне Голубы, площадь участка 0,2355 га, кадастровый номер 622082603101000017, начальная цена 3 530 000 белорусских рублей (р. Першайка, р. Ислочь, лес); **Лот 2** — земельный участок в деревне Яцково—Корчемные, площадь участка 0,1953 га, кадастровый номер 622082609601000014, начальная цена 2930000 белорусских рублей (р. Ислочь, рядом лес); **Лот 3** — земельный участок в деревне Яцково—Замостные, площадь участка 0,2249 га, кадастровый номер 622082608601000027, начальная цена 3 370 000 белорусских рублей (р. Ислочь, рядом лес); **Лот 4** — земельный участок № 1 в деревне Бобровичи, площадь участка 0,1474 га, кадастровый номер 622082601101000139, начальная цена 3680000 белорусских рублей (агрогородок); **Лот 5** — земельный участок № 2 в деревне Бобровичи, площадь 0,2260 га, кадастровый номер 622082601101000143, начальная цена 5 600 000 белорусских рублей (агрогородок).

Задаток в размере 10 % от начальной цены пересчисляется в Главное управление МФРБ по Минской области РБ, р/с 3600614040063 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037371, назначение платежа 04901, Бобровичский сельский исполнительный комитет. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится **24 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, зал заседаний. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 23 апреля 2009 г. до 17.00 по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, кабинет секретаря.

Контактные телефоны: (8 01772) 37635, 37636.

Антыкрызісная праграма

І ЧАМУ Ж ТЫ ТАКАЯ ДАРАГАЯ, ЦУКРОВАЯ ПУДРА?

Пакупнік ставіць праблему, а Гродзенскі аблвыканкам прымае аператыўныя меры па яе вырашэнні

НАША ДАВЕДКА. ***Цукровая пудра выкарыстоўваецца пры вытворчасці глазуры, прысмакаў і напояў, а таксама для абсыпання і ўпрыгажэння кандытарскіх вырабаў. У свеце прыкладна пяць-дзесяць працэнтаў ад усяго вырабляемага цукру здрабняецца ў цукровую пудру і прымяняецца ў асноўным у прамысловасці, а таксама, у значна меншых маштабах, у хатняй гаспадарцы.***

Шчыра кажучы, да таго часу, пакуль у гродзенскі карпункт «Звязды» не звярнуўся адзін з жыхароў абласнога цэнтра, аўтар гэтых радкоў ніколі не задумваўся аб ролі цукровай пудры ў прамысловасці і хатняй гаспадарцы і не цікавіўся ёй у крамах. А вось Васілю Аляксеевічу яна нядаўна спатрэбілася (цукровую пудру, дарэчы, выкарыстоўваюць не толькі ў кандытарскай вытворчасці, але і некаторыя аматары пчалярства), і ён быў вельмі здзіўлены коштам гэтага прадукту. Мяркуйце самі. Кілаграм вырабленага на Скідальскім цукровым камбінаце фасаванага цукру на сённяшні дзень каштуе ў гродзенскіх крамах 2100 рублёў. А цана, заўважце, не кілаграма, а 150-грамовага пакеціка цукровай пудры (цяжка паверыць, але факт!) у некаторых крамах складае ажно 4750 рублёў. Розніца паміж сыравінай і канчатковым прадуктам, як відаць, проста каласальная. Зыходзячы з вышэйзгаданай цаны, кошт кілаграма цукровай пудры перавышае 31 тысячу рублёў (?!). Нават з улікам затрат на ўпакоўку гэта, пагадзіцеся, ну вельмі ўжо «крута». І што, такія нашы рэаліі? Так і павінна быць, іншага пакуль не дадзена?

Разам з Васілём Аляксеевічам мы паспрабавалі разабрацца ў гэтай сітуацыі, для чаго пабывалі ў шэрагу крамаў горада над Нёманам і ў абласным унітарным прадпрыемстве «Бакалея». І вось што высветлілася.

«Няўжо мы ў Беларусі, вырабляючы цукру столькі, што з лішкам хапае не толькі на свае патрэбы, але і на экспарт, не ў стане адмовіцца ад імпарту цукровай пудры? Гэта што, звышскладаная вытворчасць, якая нам не па сілах? Няма спецыялістаў, абсталявання? Не ведаем адпаведнай тэхналогіі?»

Аптовымі пастаўкамі цукровай пудры ў Гродна і, верагодна, у іншыя рэгіёны рэспублікі займаюцца два мінскія прадпрыемствы — ТДА «Сатурн-2» і ТАА «Сярэбраны мост». Дык вось, першае і прапануе пакупнікам абласнога цэнтра расфасаваную ў 150-грамовую ўпакоўку цукровую пудру расійскай фірмы з юрыдычным адрасам у адным з жылых будынкаў у Маскве. На базе «Бакалея», як нас там праінфармавалі, летась адмовіліся ад супрацоўніцтва з ТДА «Сатурн-2» па прычыне значнага росту цэнаў на тавар ад гэтага пастаўшчыка, і цяпер там расійскай цукровай пудры няма. Аднак гэта прадукцыя, як мы пераканаліся, па-ранейшаму прысутнічае на прылаўках абласнога цэнтра, паколькі гандлёвыя агенты ТДА «Сатурн-2» працуюць напрамую з крамамі. У выніку 150-грамовы пакецік цукровай пудры, у залежнасці ад гандлёвай надбаўкі, у крамах ААТ «Прадсэрвіс» каштуе 3290, 3710 і нават 4750 рублёў.

Зрэшты, у адным гродзенскім гандлёвым прадпрыемстве нам удалося адшукаць і куды больш танны айчынны тавар. Яго, ва ўпакоўках па 15 кілаграмаў, пастаўляе абласному УП «Бакалея» ТАА «Сярэбраны мост». Зразумела, такая фасоўка прызначана перш за ўсё для прамысловай перапрацоўкі. Аднак прыйшоў да іх, як паведамілі ў краме «Спадарожнік» таго ж самага ААТ «Прадсэрвіс», пчаляр і пацікавіўся цукровай пудрай. Не пацікавіўся б — і, пэўна, там яе дагэтуль не мелі б. Аднак пасля звароту пчаляра з базы «Бакалея» даставілі ў краму адну 15-кілаграмовую ўпакоўку цукровай пудры, дзе яе расфасавалі ў поліэтыленавыя пакеты і вылажылі на паліцу. Трэба 150 грамаў — калі ласка, 250, 300 грамаў — таксама без праблем. Адпускная цана кілаграма з базы — 3825 рублёў, а на прылаўку, з улікам ПДВ і гандлёвай надбаўкі, прыкладна 5700 рублёў. Так, не ў фірмовым пакеце, трэба фасаваць у звычайны поліэтыленавы. Але ўсе адно хіба ж не адчувальная, мякка кажучы, розніца ў параўнанні з імпартным прадуктам?

Дарэчы, загадчыца крамы «Крыніца» Тамара Ярашук, дзе мы «з падачы» гандлёвага агента фірмы «Сатурн-2» убачылі цукровую пудру ў 150-грамовай упакоўцы коштам 4750 рублёў, паводле яе слоў, і не ведала, што ў іншай краме таго ж ААТ «Прадсэрвіс» цана гэтага прадукту на парадак больш прывабная для кашалька спажыўца. Дзіўна, але не пакупнік атрымліваў такую інфармацыю ад кіраўніка гандлёвага прадпрыемства, а яна цікавілася ў звычайнага пакупніка, ці сапраўды недзе ў горадзе сёння цукровая пудра прадаецца танней.

Безумоўна, у вялікай краме — дзясяткі таварных пазіцый, і цанавую сітуацыю на рынку па кожнай з іх прасачыць цяжка, у чым загадчыцы крамы павінен дапамагаць апарат ААТ «Прадсэрвіс». Але, з іншага боку, мажліва, і няма асаблівага жадання шукаць таннейшае, паколькі больш выгадна гандляваць даражэйшым. Прынамсі ў дачыненні да такога, скажам так, спецыфічнага тавару, як цукровая пудра. Гэта ж не хлеб альбо малако, што людзі масава купляюць штодзённа і, зразумела, вельмі пільна сочаць за цэнамі. А тут — нейкая цукровая пудра, якая многім увогуле непатрэбная, а камусьці можа спатрэбіцца раз у год, ды і тое ў невялікай колькасці… На гэта, мабыць, і разлік. Калі браць адну асобна ўзятую краму, то выгада ад гандлю больш дарагім таварам па гэтай канкрэтнай пазіцыі, мусіць, і не надта ўжо сур'ёзная. А ў маштабах горада, вобласці, рэспублікі? І гэта толькі цукровая пудра, а ёсць жа, пэўна, яшчэ і іншыя імпартныя «дробязі»…

Пры гэтым узнікае заканамернае пытанне, асабліва актуальнае цяпер, ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, калі на першы план выходзіць праблема імпартазамяшчэння і як мага больш поўнага выкарыстання ўласнага прамысловага патэнцыялу. З пункту гледжання інтарэсаў і вытворцаў, і, зразумела, пакупнікоў. Усюды цяпер, дзе ёсць вытворчасць, што б ні казалі пра інтэграцыйныя працэсы ў сусветнай эканоміцы, гэтая задача першачарговая, усе краіны клапоцяцца перш за ўсё аб сваёй прамысловасці. Дык няўжо мы ў Беларусі, маючы чатыры цукровыя камбінаты і вырабляючы цукру столькі, што з лішкам хапае не толькі на свае патрэбы, але і на экспарт, не ў стане адмовіцца ад імпарту цукровай пудры? Гэта што, звышскладаная вытворчасць, якая нам не па сілах? Няма спецыялістаў, абсталявання? Не ведаем адпаведнай тэхналогіі?

Адказ на гэтыя пытанні ўжо даўно даў канкрэтнай справай гродзенскі індывідуальны прадпрымальнік Міхаіл Тарасюк. Восем гадоў ён, арандуючы невялікае памяшканне на адным з прадпрыемстваў абласнога цэнтра, набываў на базе «Бакалея» цукар і вырабляў з яго цукровую пудру, каля шасці тон у месяц, хаця можна было і значна больш. Гэта прадукцыя разыходзілася не толькі на Гродзеншчыне, але і пастаўлялася ў сталіцу і Брэст. Міхаіл Якаўлевіч мае аўтарскае пасведчанне на тэхнічныя ўмовы вытворчасці, пры гэтым абсталяванне, як пераканаўся карэспандэнт «Звязды», зусім не ўнікальнае, ды і тэхналагічны працэс таксама даволі просты. Дарэчы, адходы пры вытворчасці цукровай пудры невялікія — з тоны цукру прыкладна два кілаграмы.

Апошняя адпускная цана кілаграма цукровай пудры складала ў Міхаіла Тарасюка 2790 рублёў. Праўда, цяпер УП «Бакалея» з ім ужо не супрацоўнічае, паколькі на стане здароўя ён спыніў прадпрымальніцкую дзейнасць. А Аляксей Саф'яновіч, які працаваў разам з Міхаілам Якаўлевічам і павінен быў стаць яго наступнікам у гэтай справе, ужо некалькі месяцаў не можа аднавіць вытворчасць, бо ўзніклі прэтэнзіі з боку санітарнай службы.

У абласным УП «Бакалея» паказалі лісты ў адрас цукровых камбінатаў і іншых прадпрыемстваў рэспублікі з прапановай аб арганізацыі вытворчасці цукровай пудры ў парадку імпартазамяшчэння. Адзін з такіх лістоў («Просім разгледзець пытанне вытворчасці цукровай пудры, расфасаванай па 250, 500 грамаў, 1 і 3 кілаграмы, паколькі на гэту прадукцыю ёсць стабільны пакупніцкі попыт») было накіравана яшчэ ў жніўні 2006 года. Але і сёння гэта пытанне застаецца нявырашаным, і ніша, якая павінна быць занятая айчыннай прамысловасцю, аддадзена імпарту з пасрэднікамі і вышэйзгаданымі цэнамі.

Хаця гэта пытанне і не з'яўляецца для беларускіх вытворцаў надта ўжо праблематычным, дакладней, яно зусім не складанае і можа быць вырашана даволі хутка. Што і пацвердзілі кіраўнікі Скідальскага цукровага камбіната, прадпрыемства «Лідскія харчовыя канцэнтраты» і абласнога УП «Бакалея» на нарадзе, якую пасля гутаркі з карэспандэнтам «Звязды» правёў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Русанаў. Лідчане ўжо маюць абсталяванне для вырабу цукровай пудры і забяспечваюць патрэбы кандытарэў свайго раёна. Прычым яны могуць арганізаваць фасоўку і забяспечыць гэтым прадуктам усю вобласць. У Скідальскага цукровага камбіната абсталявання пакуль няма, але наладзіць вытворчасць цукровай пудры, калі будзе пастаўлена такая задача, таксама не праблема. Ёсць такія магчымасці і ў абласным УП «Бакалея».

Аднак колькі ж цукровай пудры патрабуецца на Гродзеншчыне? На якія аб'ёмы арыентавацца вытворцам? Абласное ўпраўленне гандлю, як высветлілася на нарадзе, на сённяшні дзень не валодае нават інфармацыяй аб тым, колькі гэтай прадукцыі прадаецца на тэрыторыі вобласці, «па імпарце гэты тавар не праходзіць». Але як жа тады ўплываць на пытанні імпартазамяшчэння? Няўжо аб гэтым павінен клапаціцца звычайны пакупнік Васіль Аляксеевіч?

Пазіцыя намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра Русанава адназначная: вобласць у стане і павінна цалкам забяспечыць сябе цукровай пудрай і адмовіцца ад яе імпарту. Прычым ніякай валакіты з вырашэннем гэтай задачы не будзе. Абласному ўпраўленню гандлю даручана на працягу двух тыдняў разабрацца з патрэбай у гэтай прадукцыі ўсіх спажыўцоў — дзяржаўных, прыватных прадпрыемстваў, сістэмы спажыўкааперацыі, пакупнікоў у крамах. Пасля чаго будуць прынятыя аператыўныя меры па вытворчасці цукровай пудры на тэрыторыі вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Глыбінка

Такім, як Мікалай Казачэнка, крызіс да лямпачкі?

У Стадолічах свята вёскі праводзіцца ў кастрычніку. Шмат гадоў ужо. І рыхтуюцца да яго тут усёй грамадой. Кіраўнікі мясцовай гаспадаркі КСУП «Шлях Ільіча», лясніцтва, школы, фельчарска-акушэрскага пункта, бібліятэкі, паштовага аддзялення сувязі, сельскага Дома культуры, насельніцтва. Усе рыхтуюцца. І адным з элементаў яго падрыхтоўкі з'яўляецца правядзенне конкурсу-агляду на лепшую сядзібу, на лепшы кветнік, лепшага гаспадара і гаспадыню і г.д.

Выхаваўчы зарад тоіць у сабе і само запрашэнне на свята. Летам, напрыклад, жыхар Стадолічаў Мікалай Казачэнка на сваім кані з гармонікам і дзяўчатамі-жанчынамі-пяюхамі аб'язджаў вёску, і папярэджвалі гэтыя самадзейныя артысты: прыходзьце, будзе цікава. Убачыце ўшанаванне перадавікоў, будуць канцэрт, гандлёвыя рады на плошчы.

— Свята вёскі падбадзёрвае людзей, паказвае ім арыенціры — на каго ў паўсядзённым жыцці трэба раўняцца, на якія чалавечыя каштоўнасці нацэльвацца. І ў гэтым плане асобнае месца займае малады гаспадар, вышэйназваны Мікалай Казачэнка, які на тым святе перамог у намінацыі «Лепшы гаспадар года».

Сказаўшы гэта, старшыня Стадоліцкага сельсавета Ганна Маркевіч прапанавала пазнаёміцца з ім, што з удзячнасцю было прынята. Едзем да яго дадому і ледзь не ў першым сваім пытанні цікавімся, як ён ставіцца да праяў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Адказ гучыць прыблізна так: да яго хаты гэты д'ябал не дагрукаецца, бо сям'я паставіла яму непераадольную заслону яшчэ ў той час, калі яна толькі стварылася. Шлагбаум той — у настойлівай працы, старанні, імкненні ўвесь час ісці наперад. Крызіс можа залезці ў вёсцы ў хату толькі таго чалавека, у каго крызіс ва ўсёй яго істоце. Гэта значыць, калі ён лянуецца працаваць, б'е лынды і заўзята смокча спіртное. А такія персоны ў Стадолічах ды суседніх вёсках не перавяліся. Крызіс, нястача ў іх і раней былі.

29-гадовы гаспадар са Стадолічаў Мікалай КАЗАЧЭНКА на сваім падворку.

Фота Адама ЖОГЛЫ.

У доме Казачэнкаў, калі мы завіталі туды, знаходзіўся сам гаспадар з бабуляй Марыяй Сямёнаўнай, якая жыве асобна, і дзве суседкі. Жонкі Алены не было, яна ў райцэнтры на курсах па падрыхтоўцы прадаўцоў. Не, спецыяльнасць у яе ёсць пасля заканчэння Прыбарскага прафтэхвучылішча — кухар-агароднік-лабарант. Працавала ж даяркай. Два гады таму нарадзіла дзіця і зараз у дэкрэтным адпачынку. Дык вырашыла яшчэ адну спецыяльнасць набыць. Лішняй не будзе.

Сам жа Мікалай вырас у сям'і, якая распалася, і маці выйшла замуж за іншага і выехала з вёскі, а хлопец застаўся жыць з бабуляй. З самага дзяцінства вырашыў: у яго будзе свой дом. А для гэтага трэба шмат працаваць, разлічваць толькі на сябе. Таму, закончыўшы ў Рэчыцы саўгас-тэхнікум па спецыяльнасці «ветэрынарны фельчар» і адслужыўшы ў арміі, прыйшоў прасіцца на працу да дырэктара мясцовай школы Уладзіміра Пятровіча Цішкоўскага, які быў яго класным кіраўніком. Прасіцца дворнікам. Для чаго? Хай зарплата ў яго малая, затое часу вольнага шмат. Бо зруб трэба давесці да ладу. Каб жыллём стаў.

Вось так з бабуляй ён і заняўся справай, адначасова трымаючы сваю гаспадарку — дзвюх кароў і двух коней. Жывёлу трэба было карміць. Былі такія часы, што за дзень ён да сарака сотак лугавіны скошваў — на сена. Не кожнаму такое па сілах. Але калі ёсць мэта і жаданне годна жыць, лічыць ён, дык усё здолееш. Таму амаль усе работы па будаўніцтве хаты выконваў сам. І адкуль толькі веды і сілы браліся!

Мы аглядаем яго гаспадарку, якую Мікалай ахвотна паказвае. Вось прысядзібны ўчастак. Каля дома — 25 сотак. Па ўсім відаць, зямля ўрадлівая, а па ёй ужо гной раскіданы. Нізкая мясціна тут, раней вымакалі агародныя культуры. Каб пазбегнуць страт ураджаю, да сарака вазоў грунту за дзень (бывала такое) завозіў сюды Мікалай на сваім буланым. Падняў агарод. А на ім — і садок (яблыні, грушы, грэцкі арэх, парэчкі). А вунь на дрэве за межамі агарода вулей-ляжак, а далей яшчэ тры. А за вёскай, у лесе — яшчэ 26. Пчалярную справу, кажа толькі набірае разгон, малады гаспадар асвоіў нядаўна. У яго дзесяць сем'яў пчол. Наогул жа ў Казачэнкаў ворнай зямлі ў розных месцах набярэцца больш за гектар. На ёй вырошчваецца ўсё неабходнае. Летась, напрыклад, бульбы было нарыхтавана шэсць тон, буракоў — пяць, морквы — паўтоны, памідораў і клубніц — не лічылі. Было і сабе, і на продаж. З восені ўсе землі Мікалай перарааў, на дваццаці сотках пасеяў азімыя, а сёлетнія планы ў яго наступныя. На 50—60 сотках будзе пасаджана бульба, на 30-ці — буракі, на 30-ці — авёс. Ну, вядома ж, і пад капусту і моркву грады

ШТО ВАРТА ВЕДАЦЬ ПРА РЫБАЛОЎСТВА ПАДЧАС ВЕСНАВОГА НЕРАСТУ?

Адказы на найбольш тыповыя пытанні рыбаловаў-аматараў

Як мы ўжо паведамлялі днямі, згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 1 красавіка па 30 мая ў краіне будзе ўведзена забарона на лоўлю рыбы падчас яе веснавога нерасту. Аднак у гэты ж перыяд дазваляецца аматарскае рыбалоўства — толькі ў светлы час сутак з берага адной вудай з адным кручком ці адным спінінгам са штучнай прынадай з адзінарным, двайным ці трайным кручком памерам не больш за №10 па міжнароднай класіфікацыі. Адпаведна, многія рыбаловы, ведаючы пра гэта, зараз рыхтуюцца распачаць чарговы «сезон». Але нават у дасведчаных часам узнікаюць пытанні, кампетэнтныя адказы на якія могуць даць толькі спецыялісты. Што і зрабілі работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, падрыхтаваўшы каментарыі па сітуацыях, якія найчасцей цікавяць рыбаловаў-аматараў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Ці можна ў перыяд забароны з 1 красавіка па 30 мая лавіць рыбу адной вудай з адным кручком з кладкі?

— Лоўля рыбы ў гэты перыяд дазваляецца толькі з берага. Калі кладка ляжыць на ім, дык лавіць з яе вудай можна. У гэтым выпадку трэба правільна разумець значэнне тэрміна «бераг». Згодна з Правіламі, бераг — гэта частка сушы, што непасрэдна прымыкае да воднага аб'екта. Такім чынам, з азначэння вынікае, што ў момант знаходжання рыбалова на вадаёме берагам гэтага вадаёма будзе частка сушы, якая «кантактуе» з вадой. Вясной пры высокіх узроўнях вады бераг будзе ў адным месцы, у летні ж перыяд, калі ўзровень падае, ён будзе знаходзіцца ў іншым месцы. Таму ў перыяд з 1 красавіка па 30 мая пры аматарскім рыбалоўстве заходзіць у ваду і шукаць «летні бераг» нельга. Гэтыя абмежаванні адносяцца таксама да астравоў, размешчаных на акваторыі вадаёма, і не адносяцца да паўвостраваў, дзе не пакрытая вадой частка сушы з'яўляецца берагам вадаёма. Дарэчы, выкарыстанне ў перыяд забароны любых іншых прыладаў ці спосабаў лоўлі з'яўляецца парушэннем Правілаў і цягне накладанне на грамадзян штрафу ў памеры ад 10 да 50 базавых велічынь.

— Ці можна падчас рыбалкі выкарыстоўваць балотныя боты — пры змене месца лоўлі на вуду?

— Заход у ваду з мэтай перамяшчэння ў іншае месца лоўлі на вуду, а не заход у ваду. Такая абмежавальная мера прынята з мэтай змяншэння фактару турбавання рыбы падчас нерасту, а таксама выключэння гібелі ікры і малечы рыбы ў выніку расціскання ці ўзбоўтвання вады.

— У выпадку, калі лёд будзе трымацца на вадаёмах пасля 1 красавіка, ці можна будзе лавіць рыбу з яго пасля пазначанай даты?

— Калі да пачатку забароны на аматарскае рыбалоўства ў перыяд веснавога нерасту рыбы ледзяное покрыва будзе захоўвацца на водных аб'ектах, пры гэтым пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя тэрміны забароны не зменены і застаюцца ранейшымі (з 1 красавіка па 30 мая), дык у гэтым выпадку лоўля рыбы з лёду забаронена.

— Ёсць шмат меліярацыйных каналаў, дзе можа быць рыба амаль усіх відаў. Ці распаўсюджваюцца забаронныя меры на лоўлю рыбы ў гэтых каналах?

— Згодна з Правіламі, меліярацыйныя каналы адносяцца да рыбалоўных угоддзяў і, адпаведна, на іх распаўсюджваюцца ўсе тыя абмежаванні і забароны, што і на іншыя вадаёмы.

— Ці можна лавіць шчупака пасля 1 красавіка?

— У адпаведнасці з Правіламі, у перыяд веснавой забароны на лоўлю рыбы дазваляецца лоўля ўсіх відаў рыбы, за выключэннем занесеных у Чырвоную Кнігу Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і шчупака (да канца сакавіка дзейнічае забарона на лоўлю звычайнага шчупака ў сувязі з яго веснавым нерастам — **С.Р.**).

— Ці магчымы сплаў па рацэ на байдарках арганізаванай турыстычнай групы падчас дзеяння веснавой забароны?

— Згодна з пунктам 134.5 Правілаў, забараняецца выкарыстанне грамадзянамі маламерных суднаў і суднаў з рухавікамі ў рыбалоўных угоддзях у перыяд веснавой забароны на лоўлю рыбы, а менавіта з 1 красавіка па 30 мая. Такім чынам сплаў грамадзян па рацэ на байдарках нават у выглядзе арганізаванай групы ў гэты час праводзіцца не можа. Парушэнне вышэйназванага пункта можа пацягнуць накладанне папярэджання або штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь.

— Патлумачце, калі ласка, ці магу я падчас дзеяння забароны перапраўіцца на іншы бераг — каб потым там лавіць рыбу з яго — на лодцы пры дапамозе вёслаў, не выкарыстоўваючы матор?

— Не, не можаце. Падчас дзеяння забароны грамадзяне не могуць выкарыстоўваць маламерныя судны, у тым ліку гумавыя лодкі і лодкі з вёсламі. Лоўля рыбы ў гэты перыяд, як ужо гаварылася, дазваляецца толькі з берага. Любыя збудаванні, размешчаныя ў вадзе, над воднай паверхняй на адлегласці ад берага з'яўляюцца месцамі, адкуль аматарскае рыбалоўства ў названы перыяд весціся не можа. Гэтыя абмежаванні адносяцца і да астравоў. Такім чынам, лавіць рыбу з іншага берага можна пры ўмове, калі рыбаловам для знаходжання на ім не будуць выкарыстаны плавальныя сродкі.

— Калі я падчаплю кручком ці блешняй пакінутую кімсьці сетку, разумела, паспрабую адчапіць. А для гэтага спатрэбіцца прыўзняць тую сетку. Ці не абвінаваціць мяне ў гэты час інспектар у тым, што гэта мая забароненая прылада рыбалоўства?

— Калі вуда ці спінінг зачапіліся за сетку, вызваліць сваю прыладу рыбалоўства трэба або адчапіўшы кручок (але не выцягваючы сетку з вады), або абрэзаўшы лёску. Пра факт знаходкі сеткі трэба паведаміць па тэлефоне «гарачай лініі» Дзяржінспекцыі ці яе структурнага падраздзялення па месцы размяшчэння вадаёма. Работнікі інспекцыі выедуць на месца і здымуць сетку.

— Ці будзе парушэннем, калі я, прыехаўшы ў перыяд веснавой забароны на рыбалку, буду мець у багажніку пад'ёмнік для лоўлі жывой прынады?

— Падчас веснавой забароны такога грамадзяніна прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне пункта 134.9 Правілаў — за знаходжанне паблізу вадаёма з забароненымі да выкарыстання прыладамі лоўлі, г.зн. любымі, акрамя вуды ці спінінга.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

РАДАВОД НАЛІБОЦКІХ ЗУБРОЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пры дапамозе спецыяльных скрынь і аўтакрана ў 1994 годзе зуброў вывозілі з Белавежскай пушчы ў Валожынскі лясгас.

Радавод валожынскіх (налібоцкіх) зуброў – моцная сям'я.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Гістарычным праект пятнаццацігадовай даўнасці па выратаванні самых старажытных насельнікаў Белавежскай пушчы з удзелам Мінпрыроды, Мінлясгаса і Нацыянальнай акадэміі навук на тэрыторыі Налібоцкай пушчы дагэтуль з'яўляецца падставаю для гонару многіх жыхароў Валожынскага раёна. Цяпер гэты куток, як і Белавежская пушча, — месца сталага пражывання зуброў. Выконваючы пастанову ўрада па захаванні рэдкай папуляцыі, у лютым 1994 года сюды прывезлі пятнаццаць асобін (10 зубрых і 5 самцоў), ад якіх пачаўся зубрыны радавод Валожыншчыны. Гэта быў вымушаны крок, якіх гісторыя ведае ўжо нямала. Як вядома, у Белавежскай пушчы павялічыўся рост захваральнасці зуброў. Пра гэта забілі трывогу навукоўцы і пераканаўча сведчылі лічбы: з 1971-га па 1980 год у пушчы загінулі 46 асобін, а ў 81-97 гады страты склалі каля 250 жывёлін. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што знаходжанне зуброў у адным тэрытарыяльным рэгіёне — Белавежскай пушчы — з'яўляецца, бадай, галоўным фактарам масавага захворвання і выміравання. Першым крокам для выпраўлення сітуацыі стала рассяленне. Была распрацавана «Дзяржаўная праграма па рассяленні, захаванні і выкарыстанні зубра ў Беларусі». Да гэтага часу лясныя волаты ўжо абжывалі мясціны ў Барысаўскім раёне (туды яны перавандравалі з суседняга Бярэзінскага біясфернага запаведніка), а таксама ў Прыпяцкім нацыянальным парку. І вось зубры на Валожыншчыне. Але не так проста было атрымаць права на гэты гістарычны шанец.

Сапраўды, пакуль зубры даехалі да Валожына, было шмат сустрэч, спрэчак, меркаванняў. З аднаго боку, усе добра разумелі, што беларускіх патрыярхаў трэба тэрмінова ратаваць, з іншага — ніхто не выказваў жадання ўзяць на сябе адказнасць за рэліктавых жывёлін. І толькі дырэктар Валожынскага лясгаса Уладзімір Боршч пераканаў, што зуброю можна засяляць не толькі на тэрыторыі нацыянальных паркаў і запаведнікаў, але і ў іншыя месцы, з умовай падтрымкі праекта з боку дзяржавы. З палёгкай уздыхнулі і ў Міністэрстве лясной гаспадаркі і ў спецінспекцыі дзяржкантролю па ахове жывёльнага свету, бо і гэтым установам была даручана лёсавызначальная справа. Далучыліся да яе навуковыя супрацоўнікі Інстытута заалогіі НАН Беларусі, яны распрацавалі рэкамендацыі па рассяленні зуброў у Налібоцкай пушчы. Важна было вызначыць месца першачарговага ўтрымання жывёл, стварыць належныя ўмовы. Гэтым займаліся мясцовыя лесаводы. У рэшце рэшт кампетэнтная камісія пагадзілася з месцам абрання спецыяльнага вальера.

За паўтара дзясятка гадоў валожынскі зубрыны статак павялічыўся больш чым у 5 разоў. І гэта не ўлічваючы натуральны адбор, у выніку якога статак недалічыўся амаль трох дзясяткаў асобін. Прычынай былі і смяротны траўматызм (у бітвах паміж сабой), і гібель маладняка ў меліярацыйных каналах. І выпадкі міграцыі (2 самцы сышлі ў суседнюю Літву). І смерць па старасці, і селекцыйны адстрэл, і нават выпадкі браканьерства. Лясныя волатаў цяпер можна сустрэць і ў куточках Іўеўшчыны, на Стаўбцоўшчыне, Навагрудчыне. Рассяленне зуброў па ўсёй Налібоцкай пушчы, альбо, Літоўскай, як называлі яе з часоў Вялікага Княства Літоўскага, зусім не дзіва. Бацькоўскія гены і інстынкт цягне жывёлаў да мясцін, дзе калісьці існавалі продкі. А доказаў таму, што налібоцкія нетры былі заселены зубрамі, хапае ў выглядзе гістарычных фактаў. У тым ліку гэта адлюстравана ў легендарнай паэме «Песня пра зубра» нашага вядомага паэта-земляка Міколы Гусоўскага. Ён дакладна абмаляваў родную прыроду і паляванне на зуброў у часы сярэднявечча.

За гэты час валожынскія зубры нярэдка траплялі ў розныя, часам недарэчныя сітуацыі, і многія моманты зубрынай адысеі запомніліся валожынцам надоўга. Аднойчы раніцай жыхары вескі Дарагунь патэлефанавалі ў лясгас і з абурэннем у голасе паведамілі, што некалькі вечароў запар на ўсходнія агароды наведваюцца зубры, каб паласавацца бульбай, капустай, буракамі. Усе спробы адагнаць іх, нават з сабакамі і стрэламі ў паветра са стрэльбаў, поспеху не прынеслі. Мяжою цярпення вяскоўцаў стала з'едзенае сена: на месцы, дзе стаялі стажкі, прыкрытыя снегам, засталіся толькі чорныя плямы. Не абаранілі ад прышэльцаў нават жэрдкі агароджы. У жыхара вёскі Козлікі Алёйзы Мазалеўскага за ноч статак зуброў знішчыў амаль гектар азімых. Не столькі з'елі, колькі вытапталі, абураўся гаспадар. Давялося яму нанова рыхтаваць поле і перасейваць збажыну.

Былі выпадкі, калі ў ваколіцах урочышча Цякава аўтааматары не маглі праехаць углыб пушчы ці вярнуцца адтуль, бо лясныя волаты стаялі на дарозе і не рэагавалі ні на аўтамабілі, ні на чалавечыя галасы і пагрозы. Аўтаўладальнікам даводзілася гадзінамі чакаць з-за зайздроснай упартасці жывёлаў, а нехта нават варочаўся назад, адкладваючы паездку ў лес.

Два гады таму невялікі зубрыны статак аблюбаваў ваколіцы вёскі Белакорац. Жывёлы пасвіліся па лясных дзялянках, выходзілі на ўскраіну пушчы, а доўгімі зімовымі начамі «гастралявалі» ў вёсцы. Улічваючы вопыт дарагунцаў і шкадуючы зуброў, жыхары вёскі Белакорац выкладвалі падкормку ўздоўж платоў. У статку была смелая зубрыха, якая магла падыходзіць да самага ганка, нават адпачываць ля яго, не звяртаючы ўвагі на пагрозы. Аднойчы на падворку крайняй хаты ўвечары пачуўся брэх сабакі. Паводзіны вартаўніка на падворку нагадвалі нейкую сутычку. Спярша сабака, заліваючыся брэхам, кагосьці атакаваў, потым наадварот, ад некага ўцякаў да ганка. Выходзіць з хаты гаспадар не асмельваўся, бо за вокнамі нават платы трашчалі. Пазней, калі ўсё сціхла, зірнуў з сенцаў і, убачыўшы павалены плот, зразумеў, ад каго бараніўся хатні вартаўнік.

А вось адзін з выпадкаў каля зубрынага гадавальніка, які ледзь не прывёў да бяды. Статак у паўтара дзясятка рознаўзроставых жывёлін спакойна ласкаваўся ля кармушак. Наведвальнікі ўважліва слухалі расповед гіда-паляўніцтвазнаўца і з непрыхаванай цікавасцю назіралі за жывёламі. У гэты час аднекуль прыбегла невялікая лайка і пачала апантана, паляўнічаму, аблайваць лясных волатаў. У першае імгненне статак ляніва павярнуўся ў бок «моські», агледзеўся, потым, як па камандзе, шырокім фронтам кінуўся на парушальніка спакою. Не чакаўшы такога павароту падзей, лайка адбегла ўглыб лесу, але нават яна не ўяўляла ў тое імгненне, што гэткі манеўр прывядзе статак у злосць і ён кінецца наўздагон. Спачатку ўсе з захапленнем назіралі за нахабствам сабакі, потым за няроўным паядынкам. Але, убачыўшы, што хутканогая лайка, зрабіўшы кола па лесе, імкліва бяжыць у бок людзей, а следам за ёю — раз'юшаны статак, зразумелі: трэба ратавацца. У гэтай крытычнай сітуацыі вытрымана і мужна павёў сябе егер-зубравод: з распрасцёртымі рукамі ён выскачыў насустрач зубрам і скамандаваў гаспадару сабакі злавіць і схаваць свайго сябра. Смелыя дзеянні егера прадухілілі непрадказальныя наступствы.

Дагэтуль не забываецца ў лясгасе адна з сумных падзей першых дзён знаходжання зуброў на валожынскай зямлі, калі егеру Юрыю Рудовічу давялося выходжваць зубраня, пакінутае нядбайнай маткай-зубрыхай. Ніхто не мог прадбачыць, што ў зубрыхі з першага дня не стане малака і яе немаўля будзе асуджана на галодную смерць. Спробы падтрымаць жыццяздольнасць зубраняці, нават у хатніх умовах, нічога не далі…

У першы год шэсць з дзесяці зубрых-самак абзавяліся нашчадкамі. Колькі радасці і ўзрушэнняў было ў егераў, але пры гэтым колькі хваляванняў і турбот. Калі з'яўлялася на свет новае зубраня, егеры па чарзе неслі дзяжурства ля вальера.

Не без падстаў сёння існуе меркаванне, што зубр у Валожынскай мікрапапуляцыі развіваецца стабільна. Пра гэта ўпарта сведчыць статыстыка: 1994 г. — 15 асобін (завезена); 1999 г. — 36; 2004 г. — 46; 2009 г. — каля 80 галоў. Можна смела лічыць, што ў Беларусі з'явіўся яшчэ адзін вольны статак зуброў валожынскай мікрапапуляцыі. У свой час навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі казалі: «Тое, што зрабілі валожынцы, — своеасаблівы прарыў. Леснікі даказалі на практыцы, што ва ўмовах краіны зубр можа жыць у любым рэгіёне, а не толькі ў запаведніках і нацпарках. Але да жывёл і наогул да даручанай справы неабходна ставіцца з адказнасцю, прафесіяналізмам і любоўю».

Васіль ШАКУН,
інжынер лясной гаспадаркі.

Небяспека

ВЫПІЎ, ЗАКУРЫЎ, ЗАСНУЎ

…назаўсёды. Па гэтым сцэнарыі закончылася жыццё 73-гадовага мужчыны са Жлобіна і 45-гадовага — з Рэчыцы.

У першым выпадку свояк, ён жа сусед сталага чалавека, позна вечарам пачуў гук аўтаномнага апавяшчальніка, адчыніў дзверы ў дом і ўбачыў моцна задымлены пакой. Тым не менш, гэта не стала перашкодай, каб выцягнуць дзеда на вуліцу. На жаль, позна — той ужо паспеў задыхнуцца дымам. У другім выпадку мужчыну выратоўвалі супрацоўнікі МНС, але ж да бальніцы ён жывым не даехаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ БУДУЦЬ КАРМІЦЬ ПА-НОВАМУ

Плацдарм

Да канца года ў беларускай арміі будуць уведзеныя новыя агульнавайсковыя пайкі. Пра гэта паведаміў намеснік міністра абароны РБ, начальнік тылу ўзброеных сілаў генерал-маёр Аляксандр БАЛІГАТАЎ.

Набор прадуктаў, якімі забяспечваюцца салдаты тэрміновай службы, крыху зменены — як адзначыў намеснік міністра, «з улікам асаблівасцяў вучэбна-баявой падрыхтоўкі розных вайсковых кантынгентаў, уздзеяння на арганізм фактараў навакольнага асяроддзя, а таксама прынцыпаў збалансаванага харчавання». Напрыклад, замест прызначаных раней 100 грамаў хлеба ў пайку цяпер — булачка з пшанічнай мукі, замест 100 грамаў мяса — 80 грамаў каўбасных вырабаў, а тлушчы жывёльнага паходжання яшчэ пару гадоў таму былі заменены раслінным алеем. У пайку для суворыцаў павялічана колькасць малочных прадуктаў. Таксама ў новы агульнавайсковы паёк, які да канца гэтага года пасля ўзгаднення з пэўнымі дзяржаўнымі ўстановамі будзе ўведзены ў беларускай арміі, дадаткова трапяць 10 грамаў сыру, 20 грамаў смятаны, 1 курынае яйка ў дзень, 50 грамаў соку і 5 грамаў часнаку.

Варта адзначыць, што распрацаваны Міністэрствам абароны краіны абноўлены варыянт пайка праходзіць экспертызу і ўзгадненне ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры гігіены. «Былі прааналізаваныя таксама харчовыя пайкі, якія прынятыя ў іншых краінах — напрыклад, у Расійскай Федэрацыі, ва Украіне, — расказаў н**ачальнік харчавага ўпраўлення Міністэрства абароны палкоўнік Рыгор ГОЛУБ.** — Новы паёк для беларускай арміі фактычна не адрозніваецца ад нормаў нашых суседзяў, хіба што ў межах некалькіх грамаў».

Фота Вольгі ЛАСКІ.

Акрамя таго, паведаміў намеснік міністра абароны Аляксандр Балігатаў, на базе 50-й змешанай авіяцыйнай базы распачаты эксперымент па частковым выкарыстанні «шведскага стала». Хоць па сутнасці больш правільна назваць гэту форму харчавання комплексным абедам — салдаты могуць выбіраць адзін з некалькіх варыянтаў страў: закускі, першай і другой страў, напояў.

На сёння кошт аднаго дзённага агульнавайсковага пайка складае 6380 беларускіх рублёў. Але пры гэтым, запэўнівае начсарч, норма харчавання ўключае ў дастатковай колькасці і сокі, і свежую гародніну, і вітаміны, і мінералы. «Вядома, гэта не абсалютна ідэальны варыянт, — згаджаецца Рыгор Голуб, — але рацыён харчавання збалансаваны, плюс фізічная нагрузка, здаровы лад жыцця… Няўжо вайсковец пасля звальнення ў запас не вярнуўся дадому з меншай вагой, чым была ў яго тады, калі ён прызываўся».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

КОМИССИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ПО КОНКУРСНОМУ УПРАВЛЕНИЮ ОАО «ДЖЕМ-БАНК»

ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ЛОТОВ:

Лот № 1 — одноэтажное помещение в здании центрального материального склада на территории ОАО «Гормолзавод № 2» по адресу: пр-т Партизанский, 170 (общ. площадь 615,8 кв. м). Начальная цена — 283 500 000 белорусских рублей без НДС;

Лот № 2 — линия по розливу напитков в жестебанку и стеклобутылку. Начальная цена — 119 936 000 белорусских рублей без НДС;

Лот № 3 — ювелирное изделие из золота 585 пробы с фионитами (392 шт.) «Корона «Мисс Беларусь» (производство Гомельское ПО «Кристалл»). Общий вес изделия — 120,14 гр: вес камней — 77,62 гр, золота — 42,52 гр. Начальная цена — 7 521 000 белорусских рублей без НДС.

Размер задатка — 10 % от начальной цены лота с НДС и перечисляется на счет 6670000010070 в ОАО «ДЖЕМ-БАНК» код 731 УНП 100654364, порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 9 апреля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Осипенко, 2 (тел.: 219 24 03, 233 72 60, 233 76 61, факс 233 77 89).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 8 апреля 2009 года до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Осипенко, 2.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже объектов недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта	Технический паспорт	Год постройки	Площадь застройки м.кв.	Общая площадь здания, м.кв.	Начальная стоимость объектов, бел. руб.
	Район д. Королев Стан					
1	Коровник	600/с-43148	1960	2282	2094,2	805 000 000
	Район д. Городище					
2	Зерносушитель	600/с-43150	1970	752	695,1	805 000 000

Организатор аукциона и продавец ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тр. и МКАД, адм. здание, ком. 302.

Торги состоятся **14 апреля 2009 года в 10.30** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, адм. здание, 3 этаж, зал совещаний.

Для участия в аукционе необходимо перечислить задаток в размере 2 % от стоимости ЛОТА на расчетный счет 3012204960010 в ф-ле ОАО «Белагропромбанк»- МГД г. Минск, код 963, УНН 600438617, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район.

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **13 апреля 2009 г. до 14.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тр. и МКАД, адм. здание, 1 (первый) этаж, ком. 103.

Тел.: 237 93 93, 80297 700 463.

ЗАСО «ГАРАНТИЯ»

Бухгалтерский баланс за 2008 год

млн руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**62,0**	**Источники собственных средств — всего**	**2026,8**
Нематериальные активы	**37,1**	В том числе: уставный фонд	1725,0
Финансовые вложения — всего	**304,4**	резервный фонд	8,8
В том числе: инвестиции в дочерние Общества	—	добавочный фонд	27,7
инвестиции в другие организации	3,5	фонд накопления	240,4
облигации и другие долговые обязательства	300,9	фонд потребления	2,4
прочие финансовые вложения	—	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**21,5**	нераспределенная прибыль прошлых лет	20,2
Дебиторы — всего	**32,3**	нераспределенная прибыль отчетного года	2,3
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	0,5	**Страховые резервы и фонды — всего**	**828,4**
		В том числе: страховые резервы	825,8
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	2,6
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	гарантийные фонды	—
		Кредиторы — всего	**87,7**
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	31,8	В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	—
Прочие активы — всего	**2659,7**	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
В том числе: незавершенное строительство	1,6	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
материальные ценности и затраты	17,1	заемные средства	—
денежные средства	2641,0	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	87,7
собственные акции (доли)	—		
прочие активы	—		
Непокрытые убытки прошлых лет	—	**Прочие пассивы**	**174,1**
Непокрытые убытки отчетного года	—		
БАЛАНС	**3117,0**	**БАЛАНС**	**3117,0**

Достоверность баланса подтверждена независимым аудитором — индивидуальным предпринимателем Верезубовой Татьяной Анатольевной. Юридический адрес: 220019, г. Минск, ул. Сухаревская, 39-6. Лицензия на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0416028 от 26.02.2004 г. выдана Министерством финансов РБ со сроком действия по 25.02.2009 г. Свидетельство о государственной регистрации № 100479384 от 25.02.2000 г. выдано Администрацией Фрунзенского исполкома.

ОТЧЕТ о финансовых результатах ЗАСО «ГАРАНТИЯ» за 2008 год

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	—
Страховые выплаты	020	—
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	—
Отчисления в гарантийный фонд	040	—
Расходы на ведение дела	041	—
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	**050**	**—**
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	784,3
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-202,9
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	245,0
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	-46,9
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	—
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	—
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	6,2
Расходы на ведение дела	120	334,2
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	13,4
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	3,9
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	-41,4
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	1407,6
Операционные расходы	145	1114,2
Внереализационные доходы	150	47,9
Внереализационные расходы	155	223,3
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	2,3

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «ГАРАНТИЯ» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2009 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год.

УНП 400217363

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2009 г.

тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
АКТИВ			
1. Внеоборотные активы			
Основные средства	110	20577010	23369941
Нематериальные активы	120	11929	7001
Вложения во внеоборотные активы	140	1046528	2133866
Прочие внеоборотные активы	150	—	182758
Итого по разделу 1	190	21635467	25693566
2. Оборотные активы			
Запасы и затраты	210	19248196	14747503
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	1363128	1314324
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	—	—
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	10120830	11759778
Расчеты с учредителями	250	—	—
Денежные средства	260	1406141	355770
Финансовые вложения	270	507624	225379
Прочие оборотные активы	280	992137	1556296
Итого по разделу 2	290	33638056	29959050
БАЛАНС	**300**	**55273523**	**55652616**
ПАССИВ			
3.Капитал и резервы			
Уставный фонд	410	9000000	9000000
Резервный фонд	420	792503	762505
Добавочный фонд	430	8848678	11907598
Нераспределенная прибыль	450	7271707	7270011
Доходы будущих периодов	470	18738	22991
Итого по разделу 3	490	25931626	28963105
4. Долгосрочные обязательства			
Долгосрочные кредиты и займы	510	140413	102213
Прочие долгосрочные обязательства	520	—	1112118
Итого по разделу 4	590	140413	1214331
5. Краткосрочные обязательства			
Краткосрочные кредиты и займы	610	4282600	1919871
Кредиторская задолженность	620	24868917	23511726
Задолженность перед учредителями	630	49967	43583
Итого по разделу 5	690	29201484	25475180
БАЛАНС	**700**	**55273523**	**55652616**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	Коды строк	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	112764926	131116748
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	18744541	22932347
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	94020385	108184401
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	83483246	102229877
Валовая прибыль	040	10484753	5817150
Управленческие расходы	050	543702	647096
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	070	9993437	5307428
2. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	1697236	1422867
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	112551	169168
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	090	1584685	1253699
Операционные расходы	100	1437219	1226662
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	147466	27037
3.Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	564228	1421741
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	18293	113397
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	545935	1308344
Внереализационные расходы	150	736852	1057379
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-190917	250965
Прибыль (убыток)	200	9949986	5585430
Налог на прибыль	250	2560302	1598027
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	511564	278683
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	59417	161912
Чистая прибыль (убыток)	300	6818703	3546808

Количество акционеров – всего 1406, в т.ч. юридических лиц – 2, физических лиц – 1404.
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде – 840 млн. рублей.
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) – 2800 рублей.
Обеспеченность акции имуществом Общества – 96,5 тыс. руб.
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества – нет.
Просроченная дебиторская задолженность – 4,5 тыс. рублей.
Просроченная кредиторская задолженность – нет.
Среднесписочная численность работающих (человек) – 1253.
Основной вид деятельности – строительно-монтажные работы.

Данные отчетности подтверждены аудиторской организацией АООО «Аудитэл».

Генеральный директор **Гайкович И.А.**

Главный бухгалтер **Кулик В.Е.**

УНП 100364117

ШАНЦ ДЛЯ ЗЛОДЗЕЯ

Ці павінен ён быць? Па адказ на гэтае пытанне я накіравалася ў адзіную ў Беларусі лячэбна-выхаваўчую ўстанову для праблемных хлопчыкаў

Паўгода таму ў «Крывіцкае дзяржаўнае спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 3 закрытага тыпу» завезлі 25 няпоўнагадовых навасёлаў з псіхафізічнымі асаблівасцямі і з сардэчнымі захворваннямі з усіх абласцей Беларусі. На працягу папраўчага тэрміну (а па рашэнні суда яны павінны тут знаходзіцца не больш за 2 гады) тут ствараюцца ўсе ўмовы, каб хлопцы не толькі ўсвядомілі сваю памылку, засвоілі школьную праграму, але і прайшлі курс лячэння.

У яго ўкралі дзяцінства, а ён — алюміній...

Арцёма прывезлі ў гарадскі пасёлак Крывічы з Міёршчыны. Яму 17. Знешне — дзіця горкае, а вочы па-даросламу сур'ёзныя.

— А ўсё з-за яе, — некалькі разоў падчас размовы паўтарыў хлопец. — І красці з-за яе пайшоў, і сюды б не трапіў, каб не яна. Заўсёды хацела ад мяне пазбавіцца. І міліцыянерам сказала: «Забірайце хутчэй, мне такі сын не патрэбны».

Маці ніколі не цікавілася, чым жыве Арцём. Кампанія, п'янкі-гулянкі. Запоі маглі доўжыцца тыднямі. Хлопцу даводзілася клапаціцца не толькі пра сябе, але і пра малодшых сясцёр.

— Вось аднойчы я ў чарговы раз не вытрымаў. Кажу: «Мама, ну колькі можна піць». А яна ў гарачцы ўзняла лямант: «Сам за сабой глядзі, малако на вуснах яшчэ не абсохла, а ён старэйшых навучае».

Пасля гэтых слоў я ў разгубленасці выйшаў з дому і пакрочыў куды вочы глядзелі. Па дарозе сустрэў знаёмага. Ён і прапанаваў мне залезці ў мясцовую краму. Там некалі прыбіральшчыцай працавала яго маці. Яе звольнілі, а ключы засталіся. Я, не доўга думаючы, згадзіўся.

Грошы, скрадзеныя з касы, закапалі пад яблыняй. На наступны дзень у школу прыехала міліцыя. Услед за сябрам сваю віну прызнаў і я.

Кажуць, што на сваіх памылках вучацца, але гэта, напэўна, не пра героя майго артыкула. Ні папярэджанні, ні перажыты страх не спынілі яго перад чарговымі супрацьзаконнымі ўчынкамі. Двойчы знімы «камерсант» клікаў красці алюміній у аднавяскоўцаў. Двойчы і атрымліваў згоду.

— Чаму ты краў? — пытаюся.

— Не ведаю, — паціскае плячыма. — Напэўна, за кампанію.

Зараз Арцём лічыць дні да свайго 18-годдзя. Толькі тады яго адпусцяць дадому.

— Страшна вяртацца, але трэба выратоўваць сясцёр. Як яны там жывуць? — уздыхае хлопец.

Вылечыць жанчыну, якая п'е, забываючыся на дзяцей, амаль немагчыма. А Арцёму вырашылі даць шанц вярнуцца з путаў лёсу-злодзея — накіравалі ў ДСПТВ № 3.

Паводле слоў **дырэктара ЛВУ «Крывіцкае ДСПТВ № 3 закрытага тыпу» Аляксея САРОКІНА**, усе хлопцы, якія зараз тут знаходзяцца, з праблемных сем'яў.

— Гэта, як правіла, дзеці адзінокіх маці, якія злоўжываюць спіртным. Сярод выхаванцаў ёсць трое сацыяльных сірот: маці пазбаўленая бацькоўскіх правоў, а бацька сядзіць за кратамі.

Хлеб за 700 тысяч

Але не ўсе дзеці, як Арцём, расказваюць пра сваіх бацькоў жорсткую праўду.

11-гадовы Улад з Салігорска, напрыклад, сцвярджае, што ў яго самыя лепшыя маці і тата. І пры гэтым як у страшным сне ўзгадвае той тыдзень, які ён прасядзеў за кратамі ў прыёмніку-размеркавальніку, пакуль яго не адправілі на перавыхаванне ў спецыяльную ўстанову.

— Красці пачаў у 10 гадоў. Я быў самым малодшым у кампаніі. Старэйшыя кіравалі мной, як марыянеткай. Я, каб не страціць аўтарытэт, паслухмяна выконваў загады: выцягваў мабільнікі з кішэняў у сваіх аднагодкаў. Іх за 80 тысяч прадавалі таксістам, а на ўтаргаваныя грошы куплялі салодкае.

Ісці на повадзе хутка надакучыла. Улад вырашыў дзейнічаць самастойна.

— Калі вяртаўся са школы, спытаў у хлопца, якога сустрэў на вуліцы, ці ёсць у яго дома прыстаўка. Прапанаваў пагуляць разам.

Зараз Улад прызнаўся, што ён такім чынам вырашыў прабрацца ў чужы дом і што-небудзь скрасці.

Апошні раз украў у мясцовага пенсіянера грошы з пластыкавай карткі.

— Я гэтаму дзеду час ад часу дапамагаў пасля школы. Аднойчы ён мяне папрасіў купіць хлеба. А замест грошай даў картку.

Толькі пасля даверлівы дзядуля прыкмеціў, што хлеб яму абышоўся ў 700 тысяч рублёў, якія Улад пры дапамозе сябра зняў з карткі.

Хлопчык сцвярджае, што зразумеў сваю памылку і хоча дадому.

— Але большасць з выхаванцаў вяртацца дадому не гараць жаданнем, — гаворыць **начальнік аддзела ўнутраных спраў Мядзельскага раёна Аляксей БАЛЮК**. — Бо тут для іх створаны ўсе ўмовы. Пяціразовае харчаванне, сучаснае абсталяванне для заняткаў спортам, камп'ютары. Там, дома, яны такога не бачылі і, хутчэй за ўсё, не ўбачаць.

Аляксей САРОКІН: «Не так даўно нас пакінуў, адбыўшы свой «тэрмін», сірата з Друі. За той час, пакуль ён жыў у нас, пасябраваў з адным хлопчыкам. Яны вельмі доўга развітваліся. І я выпадкова пачуў, як сябар на развітанне сказаў: «Не крадзі больш». Наша задача, каб усе нашы выхаванцы ўсвядомілі сваю памылку і ні пад якой маркай не наступалі на свае ж граблі.

Бясплатны рэпетытар

Ды і вучоба тут праходзіць, паводле слоў дырэктара, ледзь не па індывідуальнай праграме. У класах у сярэднім па 4-5 вучняў. У 7 класе зараз наогул 1 хлопчык грызе граніт навукі. Чым не рэпетытарства? Толькі бясплатнае.

Акрамя агульнай сярэдняй адукацыі, старэйшыя хлопцы тут могуць атрымаць і спецыяльнасць агародніка, садавода, аўтаслесара.

— Плануем адкрыць набор і на такую спецыяльнасць, як майстар па вырабе рэчаў з гліны, — гаворыць **Аляксей Сарокін**. — Такім чынам, па заканчэнні «тэрміну» маладому чалавеку будзе значна прасцей знайсці сабе прымяненне, пазбегнуць лёгкай, але цёмнай дарогі.

Галоўная ж задача ўсяго педагагічнага калектыву — навучыць хлопцаў самастойна прымаць рашэнні, аналізаваць магчымыя ўчынкі перад тым, як зрабіць чарговы крок.

— Нашы вучні не зусім звычайныя, таму да іх патрэбны і нестандартны падыход, — гаворыць Аляксей Сарокін. — Выкладаю прадмет «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». Нядаўна праходзілі па праграме тэму «сумленне». Пытаюся ў 16-гадовага хлопчыка: «Ты стаіш у чарзе, перад чалавек пакінуў выпадкова кашалёк. Твае дзеянні?

ДАВЕДКА

У Беларусі ёсць яшчэ 3 вучэбна-выхаваўчыя ўстановы закрытага тыпу: спецшкола для хлопчыкаў 11-14 гадоў і спецыяльнае ПТВ для хлопчыкаў 14-18 гадоў у Магілёве, а таксама спецыяльнае ПТВ для дзяўчынак у Петрыкаве.

Аклікнеш яго?» Той, нядоўга думаючы, выпаліў: «Няхай не забывае». — «А магчыма, там апошнія грошы, яму няма за што жыць», — працягваю я наступленне. Задумаўся. Значыць, мы на правільным шляху. Памяняць светапогляд за адзін дзень немагчыма, але калі задацца такой мэтай, то за больш працяглы час — рэальна.

Турма — гэта так званае кляймо. На дзяцей і падлеткаў, сцвярджаюць псіхолагі, яго ні ў якім разе нельга ставіць. Ёсць такое паняцце як сацыяльнае чаканне: чалавек паводзіць сябе менавіта так, як ад яго чакаюць навакольныя. Калі яму ўвесь час паўтараць, што ён парася — чакайце, хутка зарохкае. Калі яго пасадзіць за краты і ставіцца як да злодзея, то хто гарантуе, што ён не пранясе гэта званне праз усё жыццё... Дык што правільна: змясціць няпоўнагадовага злодзея ў турму на 4-5 гадоў ці ўсё ж такі даць яму шанц выправіцца?

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.
Мядзельскі раён.

«ЧАМУ ДЗЕЦІ КРАДУЦЬ? — з такім пытаннем я звярнулася да некалькіх знаёмых псіхолагаў. І вось які калектыўны адказ атрымала.

1 прычына: клептаманія — псіхічнае захворванне, не паддаецца карэкцыі, але людзей з такім захворваннем вельмі мала;

2 прычына: недахоп грошай на элементарныя, жыццёва неабходныя рэчы, у тым ліку ежу;

3 прычына: прыцягненне ўвагі да сябе, крык душы, на які бацькі не звяртаюць увагі;

4 прычына: усвядомлены ці неўсвядомлены пратэст супраць нейкіх з'яў у сям'і, школе;

5 прычына: павышэнне асабістай самаацэнкі ў вачах сяброў.

Шкодная звычка — красці — можа праяўляцца як у дзяцей з добранадзейных сем'яў, так і з сем'яў групы рызыкі. Прычым хлопчыкаў сярод такіх дзяцей больш, чым дзяўчынак. Дзеці з нядобранадзейных сем'яў крадуць, як правіла, для таго, каб пракарміць сябе, малодшых братоў і сёстраў, па прымусе дарослых, баючыся пакарання. Дзеці, якія жывуць у сацыяльна спрыяльных сем'ях, крадуць, бо жадаюць прадэманстраваць аднагодкам сваю «дарослась», значнасць.

Калі ў дзіцяці не ўсё гладка дома (напрыклад, бацькі занятыя, ім нецікавыя яго праблемы ці бацькі злоўжываюць спіртным), то дзіця будзе шукаць суцяшэння па-за сям'ёй. Каб заваяваць папулярнасць і аўтарытэт у вачах таварышаў, такое дзіця пойдзе на многае. А тут ужо ўсё залежыць ад таго, у якую кампанію трапіць. Бо часта першыя крадзяжы здзяйсняюцца менавіта «за кампанію». Таму, як бачым, усё пачынаецца з сям'і. Бацькі, якімі б яны ні былі, павінны несці адказнасць за тых, каму падарылі жыццё. Памятайце народную мудрасць: «Добрым справам трэба вучыцца тры гады, а дурным — адной гадзіны дастаткова».

Дырэктар ЛВУ «Крывіцкае ДСПТВ № 3 закрытага тыпу» Аляксей Сарокін паказвае новыя трэнажоры.

ГРУЗ ПАКІНУЛІ, А КОНЕЙ ЗАБРАЛІ...

Чарговую вялікую партыю кантрабанды затрымалі на мяжы з Украінай вайскоўцы Пінскага пагранатрада. У лесе ля вёскі Лелікава Кобрынскага раёна стаялі дзве падводы з 44 тушамі цялят і 40 скрынямі швейнай фурнітуры. Аднаго каня ўладальнікі грузу паспелі выпрагчы, а другога — не, бо хутка ўцякалі пры набліжэнні нарада. Пасля таго, як груз быў упарадкаваны ў вызначаным законам парадку, два вайскоўцы пагналі каня з вазамі на пост «Гаравіца», гэта ў 30 кіламетрах ад месца здарэння. У лесе дарогу ім перагарадзілі незнаёмыя людзі і сталі патрабаваць маёмасць. Вусныя папярэджанні і тлумачэнні не дапамагалі, і адзін з вайскоўцаў зрабіў папераджальны стрэл у паветра. Але незнаёмец паспеў выпрагчы каня, з якім парушальнікі і кінуліся наўцёкі. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» кіраўнік прэс-службы Пінскага пагранатрада Міхаіл Бутгусаім, пошукі парушальнікаў вяліся ва ўмовах моцнага снегападу і дрэннай бачнасці. Па гарачых слядах затрымаць кантрабандыстаў не ўдалося. Расследаванне інцыдэнту вядзецца Кобрынскім РАУС разам з памежнікамі. Кантрабанда ацэнена ў 550 мільёнаў рублёў.

ПАЖАР НА БУДОЎЛІ

Пажар распачаўся на паддашку былога прафілакторыя Брэсцкага электралямпавага завода. У гэтым памяшканні будаўнікі ААТ «Палескжылбуд» вядуць рэканструкцыю, пасля завяршэння якой у карпусе пераедзе псіханеўралагічны інтэрнат для старых і інвалідаў. Былы прафілакторый знаходзіцца побач з вёскай Гулі Брэсцкага раёна. Шэсць пажарных разлікаў МНС, якія прыбылі па выкліку, справіліся з агнём прыкладна за паўгадзіны. Пацярпелых няма. Сур'ёзна пашкоджаны толькі драўляныя кроквы і дах будынка з металачарапіцы. Па адной з версій, прычынай пажару магло стаць неасцярожнае абыходжанне з агнём кагосьці з будаўнікоў. Для расследавання прычын здарэння створана спецыяльная камісія.

Яна СВЕТАВА.

ВОСЬ ГЭТА «ЎЛОЎ»!

Падчас праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці аднаго індывідуальнага прадпрымальніка ў Пінску было выяўлена, што ў краме па вул. Беркавіча ён гандлюе трыкатажам без дакументаў. У прадпрымальніка канфіскавалі 21326 адзінак вырабаў, якія пацягнулі на 1 836 695 000 рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Каварны чадны газ...

Вечарам 24 сакавіка ў памяшканні кацельні ЖКГ, якая знаходзіцца ў вёсцы Арабаўшчына Баранавіцкага раёна, загінулі пяць чалавек — чацвёра з гэтай вёскі і адзін з в. Болтычы.

Прыкмет гвалтоўнай смерці на мёртвых не было. Ёсць падазрэнне, што людзі загінулі ад чаднага газу, бо была сапсаваная аўтаматыка і вентыляцыя катла.

Нагадаю, што некалькі гадоў таму ў адным з дамоў па вул. Тэльмана ў Баранавічах ад чаднага газу загінула столькі ж чалавек з розных кватэр. Тады была забіта смеццем вентыляцыйная шахта, а газавая калонка гарэла без нагляду.

Міны побач

Падчас правядзення земляных работ на вул. Дуброўскай ў Брэсце рабочыя натрапілі на сховішча боепрыпасаў мінулай вайны. На свет божы сапёры даталі 30 гранат РГД-33, 24 мінамётныя міны, 3 гранаты Ф-1, 43 узрывальнікі, снарад, тратылавую шашку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Спадчына

«Скарбы роднай зямлі»

Кнігу пад такой назвай выдаў днямі доктар філалагічных навук, прафесар, аўтар нашай пастаяннай рубрыкі «Сіла слова» Аляксей Ненадавец.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«У распаўсюджаным уяўленні скарбы — гэта схаваныя каштоўнасці, знойдзеныя ці не, — піша ва ўступным слове аўтар. — Нездарма пошукі скарбаў сталі адным з найбольш захапляльных сюжэтаў сусветнай прыгодніцкай літаратуры. Але людзі, якім даводзілася мець справу з рэальнымі, а не тэарэтычна наяўнымі скарбамі, ведаюць, што скарбы са шматлікай колькасцю залатых манет, упрыгажэнняў, посуду — вялікая рэдкасць. Пераважна іх складаюць шырокаўжывальныя срэбныя ці медныя манеты».

Нашы продкі заўсёды вылучаліся абачлівасцю і імкнуліся па магчымасці адкласці нейкі «нз» (некранальны запас) на чорны дзень (на выпадак неўраджаю, голаду, пажару і г.д.) Скарбы хавалі заўсёды, сцвярджае Аляксей Ненадавец, але найчасцей — у час вайны, нашэсцяў, паўстанняў і... грашовых рэформаў. Прычым ролю ашчадных кас і банкаўскіх ячэек выконвалі зямля, камяні, дуплы дрэў.

Нягледзячы на тое, што найчасцей на Беларусі сустракаюцца менавіта манетныя скарбы, толькі імі спіс схаваных каштоўнасцяў не абмяжоўваецца. «Паводле народных паданняў, недзе ў беларускіх азёрах схавана залатая карэта самога Напалеона. Захаваліся легенды пра нарабаванае французамі дабро («...каштоўнасцяў было безліч, горы вялізныя, рэкі жамчужныя, усё гэта закапана ў вялікіх курганах, у толькі ім вядомых месцах»).

А хто не чуў пра «залаты запас» Радзівілаў? Пра фамільныя скарбы гэтага роду не адно стагоддзе ходзяць легенды. Прафесар Ненадавец сцвярджае, што гэта самы легендарны скарб на беларускай зямлі, які да нашага часу не знойдзены. Пад скарбам князёў Радзівілаў, схаваным падчас вайны з Напалеонам, у першую чаргу разумеюць статуі 12 апосталаў, якія быццам бы зроблены ў натуральны рост чалавека (з чыстага золата!) і ўпрыгожаны каштоўнымі камянямі. «Многія шукальнікі спрабавалі знайсці тое багацце, якое нібыта было, а можа, і сапраўды было закапана верным аканомам Радзівілаў перад наступленнем на Нясвіж рускай арміі. Толькі спробы гэтыя былі пакуль што няўдалымі». У кнізе апісваюцца розныя паданні і версіі пошуку і знаходжання нясвіжскага і напалеонаўскага скарбаў.

Акрамя рэальных каштоўнасцяў (маюцца на ўвазе як ужо адшуканыя скарбы, так і пакуль неадшуканыя, аднак пра існаванне якіх нам вядома дакладна), ёсць шматлікія фантастычныя, казачныя скарбы (папараць-кветка, зачараванае золата і іншыя дары варажбітак і нячыстай сілы). Гэтаму захапляльнаму аспекту беларускай нацыянальнай вуснапаэтычнай творчасці аўтар прысвяціў большую частку сваёй кнігі. Ён паспрабаваў разабрацца, дзе знаходзяцца вытокі старадаўніх легендаў і паданняў пра чароўныя скарбы, маюць яны рэальныя карані альбо з'яўляюцца вынікам багатай фантазіі нашых продкаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 3.



Белыя: Крb6, Фf7, Лh5, Сh8, Кg7 (5). **Чорныя:** Крd6, Лe3, Сc8, Кb4, Кb5, пп. d4, d5 (7). Мат за 3 хады (3 ачкі).

Заданне №4.

Белыя: Крb7, Фe1, Лe7, Лh4, пп. b3, e4 (6). **Чорныя:** Крh6, Сf3, пп. b4, c6, e6, g5, g6. h5 (8). Мат за 3 хады (3 ачкі).

Для тых, хто яшчэ не пазнаёміўся з першымі двума заданнямі, паўтараем іх умовы.

Заданне № 1. Белыя: Крc5, Фh1, Лg2, Лh3, Cd2, Kf7 (6). Чорныя: Крe4, Cd1, Кh2, п. e6 (4). Мат за 2 хады.

Заданне № 2. Белыя: Крa1, Фb4, Лa4, Лa5, Cb1, Кh7 (6). **Чорныя:** Крe5, Фd5, Лf8, пп. e6, e7 (5). Мат за 2 хады.

СЛАВУТЫЯ МАЙСТРЫ МІНУЛАГА

Імёны першых майстроў шахматнага эцюда Л. Кубеля, В. і М. Платавых, Г. Рынка, А. Троіцкага добра вядомыя ў свеце аматараў і прафесіяналаў шахмат. Дзякуючы ім пачалі праводзіцца міжнародныя конкурсы складання, якія, дапоўніўшы задачныя конкурсы, атрымалі вялікае пашырэнне.

Першая кніга, прысвечаная эцюдам, аўтарам якой з'яўляецца Г. Рынк, француз па паходжанні, але правёў значную частку свайго жыцця ў Іспаніі, выйшла ў свет у 1909 годзе. З гэтага моманту, як лічаць аматары кампазіцыі, пачалася залатая пара развіцця эцюднага майстэрства. У кнізе змешчана 150 твораў, і неўзабаве яна была перавыдадзена.

Айчынная літаратура па эцюднаму майстэрству бярэ свой пачатак у 1914 годзе. Напярэдадні першай сусветнай вайны з'явіўся цудоўна афармлены «Зборнік эцюдаў» братоў В. і М. Платавых, які ўключыў 153 кампазіцыі.

Прыводзім з гэтага зборніка эцюд М. Платава (1903 год).

Белыя: Крb3, Фh8, Кh4 (3). **Чорныя:** Крe4, Фf4 (2). Выйгрыш.

1. Фa8+ Крd3 2. Фa6+ Крd2 3. Фa2+ Крd3 4.Фc2+ Крd4 5. Фc4+ Крe5 6. Кg6+, калі 3. ... Крd1 4. Фc2+ Крe1 5. Кg2+ і белыя выйграюць.

Гэты эцюд цікавы не толькі зместам, але і формай — у ім толькі 5 фігур.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «ТРИКОТАЖТОРГ» ЗА 2008 г. (млн руб.)

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	5 534	5 583
амортизация	102	2 211	2 265
остаточная стоимость	110	3 323	3 318
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	2	2
амортизация	112	1	1
остаточная стоимость	120	1	1
Доходные вложения в материальные ценности:		-	-
Вложения во внеоборотные активы	140	-	-
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	190	3 324	3 319
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	1 428	2 084
в том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	121	144
готовая продукция и товары для реализации	215	1 303	1 935
расходы будущих периодов	218	4	5
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	10	20
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	1 218	1 477
в том числе:			
покупателей и заказчиков	241	1 137	1 366
поставщиков и подрядчиков	242	11	6
по налогам и сборам	243	66	101
по расчетам с персоналом	244		
разных дебиторов	245	4	4
Расчеты с учредителями	250		
Денежные средства	260	193	601
Финансовые вложения	270		20
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	2 849	4 202
БАЛАНС (190+290)	300	6 173	7 521

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	1 697	1 697
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	-
Резервный фонд	420	49	66
в том числе:			
резервы, образованные в соответствии с законодательством	421	17	24
резервы, образованные в соответствии с учредительными документами	422	32	42
Добавочный фонд	430	1 559	1 578
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	-
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	1 545	2 007
ИТОГО по разделу III	490	4 850	5 348
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Кредиторская задолженность	620	1 322	2 173
в том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	1 206	2 065
перед покупателями и заказчиками	622	4	10
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	32	45
по прочим расчетам с персоналом	624	-	-
по налогам и сборам	625	77	39
по социальному страхованию и обеспечению	626	2	12
по лизинговым платежам	627	-	-
перед прочими кредиторами	628	1	2
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	-	-
Резервы предстоящих расходов	640	1	-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	690	1 323	2 173
Баланс (490+590+690)	700	6 173	7 521
Из строки 620: краткосрочная кредиторская задолженность	702	1 322	2 173

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «ТРИКОТАЖТОРГ» ЗА 2008 г. (млн руб.)

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период предыдущего года
1	2	3	4
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	22 887	17 855
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	3 130	2 493
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	19 757	15 362
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	16 591	12 746
Валовая прибыль (020-021-030)	040	3 166	2 616
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	2 299	1 992
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	867	624
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	384	405
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	6	2
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	378	403
в том числе: проценты к получению	091	15	6
доходы от участия в создании (учредительстве) др. организаций	092	-	-
доходы от операций с активами	093	16	2
прочие операционные доходы	099	347	395
Операционные расходы	100	341	388
в том числе:			
проценты к уплате	101	-	-
расходы от операций с активами	102	7	6
прочие операционные расходы	109	334	382
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	37	15
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	7	9
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	6	4
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	1	5
Внереализационные расходы	150	-17	84
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	18	-79
Прибыль (убыток) (-/+070-/+120-/+160)	200	922	560
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	35	85
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	59	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (-/+200+210-220)	240	898	645
Налог на прибыль	250	202	130
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	78	78
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	-	-
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	642	352

Информация о дивидендах и акциях

5. Количество акционеров — всего — 125, в том числе юридических лиц — 1, физических лиц — 124.

6. Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	70,6	31,7
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	624	280,4
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	47,3	42,9
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	-	-
7. Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	94	12
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	-	-

8. Среднесписочная численность работающих (человек) 124

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг

оптовая торговля товарами народного потребления;
розничная торговля товарами народного потребления;
операции с недвижимым имуществом

Генеральный директор И.Э Кобза
Главный бухгалтер Т.В. Нараб УНП 100185103

Открытого акционерного общества «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

Бухгалтерский баланс за 2008 г.

АКТИВ	На конец отчетного года в млн руб.	ПАССИВ	На конец отчетного года в млн руб.
Основные средства:		Уставный фонд	83
первоначальная стоимость	3543	Добавочный фонд	2292
амортизация	1370	Непокрытый убыток	-217
остаточная стоимость	2173	Доходы будущих периодов	—
Нематериальные активы:		Прибыль (убыток) отчетного года	—
первоначальная стоимость	2	Краткосрочные кредиты и займы	—
амортизация	1	Кредиторская задолженность	170
остаточная стоимость	1		
Вложения во внеоборотные активы	2		
Запасы и затраты	98		
Налоги по приобретенным ценностям	19		
Дебиторская задолженность	29		
Денежные средства	6		
БАЛАНС	2328		2328

Отчет о прибылях и убытках с 1 января 2008 г. по 31 декабря 2008 г.

млн руб.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	1509	1272
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	261	218
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	1248	1054
СПРАВОЧНО: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	716	593
Валовая прибыль (020-021-030)	040	532	461
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060	537	441
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	-5	20
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	080	1	1
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081		
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	1	1
в том числе: проценты к получению	091		
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		
доходы от операций с активом	093		
прочие операционные доходы	099		1
Операционные расходы	100		1
в том числе: проценты к уплате	101		
расходы от операций с активами	102		
прочие операционные расходы	109		1
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	1	
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	56	29
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		1
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	56	28
Внереализационные расходы	150	17	16
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	39	12
Прибыль (убыток) (-/+070-/+120-/+160)	200	35	32
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	2	
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		
Прибыль (убыток) до налогообложения (+/-200+/-210+/-220)	240	37	32
Налог на прибыль	250	1	1
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	34	31
Прочие расходы и платежи из прибыли	270		
Чистая прибыль (убыток) (200-250-260-270)	300	0	0
СРАВОЧНО (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310		
Прибыль (убыток) на акцию	320		
Количество прибыльных организаций / сумма прибыли	330		
Количество убыточных организаций / сумма убытка	340		

Руководитель Бернада Е.А.
Главный бухгалтер Страузова Н.В. УНН 100097687

ЗАБРЕЗСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: Лот 1 — земельный участок в д. Алещенята, площадь участка 0,2500 га, начальная цена 2 600 000 белорусских рублей. Лот 2 — земельный участок в д. Малая Дайновка, площадь участка 0,1640 га, начальная цена 500 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Земельный участок в д. Алещенята расположен на берегу реки Западная Березина, рядом лес. Инженерная инфраструктура отсутствует. Земельный участок в д. Малая Дайновка расположен в лесном массиве, 8 км от райцентра.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3600614090202 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037356, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **24 апреля 2009** года в

777

«Кожны павінен здаць свой іспыт...»

Іранскі чараўнік Мехдзі прадказаў, калі мы выйдзем з крызісу

Нядаўна ў папулярнай праграме «Максімум» на НТБ вядучы Глеб П'яных абвясціў аб другім прышэсці на тэлеэкран «народнага лекара» Анатоля Кашпіроўскага. Ходзяць чуткі, што хутка ён зноў будзе лячыць людзей з экранаў тэлевізараў. Чараўнікі, ведзьмакі, экстрасэнсы, чарадзеі, лекары — яны, нягледзячы ні на якія крызісы, размнажаюцца, як грыбы пасля дажджу — не кашпіроўскім адзіным. Цуда-лекараў сёння стала больш, чым саміх хворых.

Тэлеканал ТНТ арганізаваў нават тэлеспаборніцтва «Бітва экстрасэнсаў», дзе кожны, хто валодае хоць нейкімі звышмагчымасцямі (глядзець скрозь сцены; знайсці іголку ў стозе сена) — можа выпрабаваць свае сілы. Правы на паказ гэтай праграмы купіў і Першы нацыянальны канал, тэлеканал «Лад», а кастынгі для папулярнага шоу праводзіліся нават у Мінску. Праўда, беспаспяхова. Паводле слоў рэжысёраў, беларускія «чараўнікі» пакуль толькі практыкуюцца ў майстэрстве, у той час як расійскія робяць цуды!

Пераможцам трэцяга сезона шоу стаў 34-гадовы іранец Мехдзі Эбрагімі Вафа. За Мехдзі прагаласавала больш за 45 000 прыхільнікаў «бітвы экстрасэнсаў». Для параўнання: адной з фіналістак удалося набраць усяго крыху больш за тысячу галасоў. «Я не прывык прайграваць, — кажа Мехдзі, — у нас, іранцаў, ёсць афарызм, які ў перакладзе гучыць так: «Персікі не здаюцца!» (іранцаў завуць яшчэ персамі) — і я перамог».

У адным з выпрабаванняў яму працягнулі канверт з запячатаным фотаздымкам загінулага спевака Мурата Насырава. Памятаеце яго знакаміты хіт: «Хлопчык хоча ў Тамбоў»?! І што б вы думалі? Мехдзі дакладна апісаў падзеі, якія адбыліся: маўляў, гэты чалавек выскачыў з балкона пятага паверха. Сведкі, якія знаходзіліся побач з экстрасэнсам, былі шакіраваныя. Да таго ж іранец, як высветлілася, нават не ведаў, хто такі Мурат Насыраў.

...Страцілі ўсякую надзею знайсці цела свайго патанулага ў возеры сына бацькі. Прыехалі на перадачу. Мехдзі, вывучыўшы фатаграфіі, крыжыкам паказаў месца і дакладную глыбіню — 8 метраў. Фантастыка! Але менавіта на гэтай глыбіні вадалазы і знайшлі патанулага чалавека.

Феномен, анамалія, казка? Чарадзейныя здольнасці іранскага прадказальніка выявіліся яшчэ ў дзяцінстве. Праўда, тады яго прагнозы выстаўлялі курам на смех.

— У мяне ўяўленні з 4 гадоў, — расказвае Мехдзі, — перад вачамі — розныя малюначкі. З часам, яны сталі праглядацца выразней, ясней. Неяк бацьку расказаў, што чакае аднаго з нашых сваякоў, а ён раззлаваўся і ўзяўся за папругу. Усё, пра што я казаў, спраўдзілася, але замест таго, каб дапамагаць людзям, я замкнуўся ў сабе і захоўваў маўчанне.

— Доўга?

— Да таго часу, як даведаўся, што такія ж здольнасці былі і ў майго дзядулі.

— Як яго звалі?

— Гейдар (*лаўза*). Я ўпершыню адказваю на гэтае пытанне. Мала таго, што яго імя магічнае, яшчэ я заўважыў, што калі пільна ўзірацца ў яго фотаздымак, адбываюцца цуды. Дзед Гейдар вылечваў нямоглых, на кім ставілі крыж лекары.

Мехдзі Эбрагімі Вафа таксама стварае ўражанне чараўніка з арабскіх казак 1001 ночы. Падобна Джыну, агорнутаму клубамі дыму, гатовы выканаць любое жаданне!

— Экстрасэнс павінен узяць чарадзейную палачку і ўсё будзе проста шыкоўна? — смяецца Мехдзі. — Я ў лоб пытаю: а вы што зрабілі для таго, каб адбыўся цуд?

Мехдзі, утульна ўладкаваўшыся ў скураным крэсле, вось ужо які раз чыркае запальніцай. Водар тытуню плаўна струменіцца з трубкі, якая, як ён сцвярджае, дапамагае яму не губляць канцэнтрацыю ў працы, а заадно — здымаць негатыўную энергію, назапашаную за дзень. Яго офіс размешчаны ў цэнтры Масквы. Ахвотных патрапіць на прыём — тысячы, але фізічна Мехдзі гатовы прыняць толькі адзінкі, не ператвараючы сваю дапамогу ў канвеерны бізнэс. Расцэнкі, вядома, не кожнаму па кішэні — 40 000 расійскіх рублёў за сеанс — але яны, па словах кліентаў, апраўданыя. Так, баскетбалістка маскоўскага ЦСКА Кацярына Лісіна, намучаўшыся з аперыраваным каленам, прыйшла прасіць дапамогі ў іранскага спецыяліста. Да здзіўлення знаёмых, Каця забылася аб сваёй праблеме пасля першага ж наведвання. «Ён проста прыклаў рукі да хворага калена, — успамінае Лісіна, — і я адчула гаючую энергію».

Па-руску ён кажа з ярка выяўленым акцэнтам, хоць пражыў тут больш за 14 гадоў. Скончыў Маскоўскі медыцынскі інстытут і атрымаў спецыяльнасць урача-стаматолага: піша вершы пра каханне, нядрэнна танчыць і з велізарным задавальненнем гуляе ў футбол. Падчас «Бітвы экстрасэнсаў» у яго нарадзіўся першынец.

— Дзяўчаты часта пытаюцца ў мяне: як выйсці замуж? — усміхаецца Мехдзі. — І пажадана за прынца. Сусед-сантэхнік ёй, бачыце, не па душы. Сваю Люду я ўбачыў у сне, а на прыступках інтэрната, падчас першай выпадковай сустрэчы, заявіў: ты будзеш маёй жонкай!

— Якое гэта адчуванне: ведаць, што цябе чакае за павароткам?

— Людзі бягуць да варажбітак, не разумеючы, што губяць свой жа лёс. Калі б мы ўсё ведалі аб будучыні, то страціўся б сэнс жыцця. Будучыня — гэта ты сам! Вер у сябе, і ўсё будзе — бо ты так хочаш! Вер у Бога, слухай сваё сэрца, і свет адкрые табе свае таямніцы! Вер у цуды! Кожны чалавек — Божы твор, а значыць, ён сам па сабе — цуд. У кожнага ёсць анёл-ахоўнік. Людзі іх проста не адчуваюць і не чуюць.

— Але вы ж прадказваеце будучыню?

— Я нічога не прадказваю — гэта вялікі грэх. Аднаму Богу вядома, што будзе, а я толькі папярэджваю: не ганяй на машыне, не пі за рулём... Не трэба быць прадракальнікам, каб рэальна ўявіць карціну будучыні: знікаюць рэдкія жывёлы і расліны, скарачаюцца прыродныя рэсурсы, забруджваецца паветра, навакольнае асяроддзе, усё менш і менш на прылаўках натуральных прадуктаў. Чалавек стаў чалавеку ворагам!

— Вось яшчэ крызіс пагрукаў у дзверы...

— Ну, выкажам здагадку, што крызіс мы перажывём, не варта так хвалявацца — праз паўгода ўсё зменіцца да лепшага. Так, сёння шмат незадаволеных, расце беспрацоўе, з-за нервовых стрэсаў развіваюцца хваробы. Трэба першапачаткова настроіць сябе на пазітыў. Без розніцы, якая праблема вас турбуе: сусветны крызіс або прыватная сямейная драма. Проста змяні пласцінку — памяняй праграму, ачысці думкі. Калі чалавека нешта моцна цікавіць або ён чагосьці горача жадае — абавязкова даможацца гэтага. Толькі мелодыя ўсярэдзіне павінна гучаць так — у мяне ўсё атрымаецца! Дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву з Расіяй вашаму народу ўдасца без страт пераадолець цяжкія часы. Куды горш будуць ісці справы ў Еўропе, а пра Амерыку я наогул маўчу...

— Праўда, што вы тры гады блукалі ў гарах?

— Я хацеў зразумець: хто я, што я бачу і адкуль гэтыя ўяўленні. Я медытаваў і маліўся з дня ў дзень. Сёння малюся за ўсіх людзей, якія прыходзяць да мяне, дапамагаю храмам, дапамагаю людзям, якія жывуць у нястачы — незалежна ад расы і веры.

— Ці верыце вы ў лёс?

— Кожны павінен здаць свой іспыт. Нездарма кажуць: калі Бог жадае кагосьці пакараць, то пазбаўляе розуму. Мозг дадзены кожнаму з нас, каб думаць.

...Мехдзі бярэ кубак са стала. Налівае туды ваду з чайнічка і працягвае мне: «Пі, гэта вада дае сілу?».

— Што гэта за вада? — пытаюся ў яго.

— Вада трох крыніц: святая вада з крыніцы ў Мецы (Саудаўская Аравія), крынічная вада і мінеральная (негазаваная). Калі чалавек выпʼе гэтую сумесь, то яго арганізм зараджаецца энергіяй — бо чалавек на 80 працэнтаў складаецца з вады. Але можна ўзяць звычайнай азёрнай ці рачной вады, змяшаць яе з водаправоднай пры кожным прыняцці ванны, туды ж уліць завараны настой рамонку, шалфею і абавязкова пакласці пачак марской солі. Затрымаўшы дыханне, нырацца ў ваду, прамаўляць сабе: «У мяне абавязкова ўсё будзе добра». І ўсе хваробы, як рукой зніме.

— Можна спытацца пра сваё асабістае, Мехдзі?

— Гледзячы пра што? — усміхаецца.

— У мяне ёсць адно жаданне, але, мяркуючы, па ўсім, маленькія магчымасці...

— Я ж казаў: калі моцна верыць і жадаць, усё атрымаецца. Магу параіць яшчэ працэдуру — змяшаную ваду наліце ў шклянку, вазьміце ў левую руку і на працягу некалькіх хвілін прамаўляеце ўголас сваё жаданне: «Я веру, я адчуваю, я ведаю: усе праблемы хутка мінуць»...

Вольга РАМАНЮК.

У апошнія дні сакавіка гаспадыні правяраюць насенне гарбузоў і падрыхтоўваюць яго да пасеву.

ГАРБУЗЫ

Гарбузы заўсёды былі культурай абавязковай на стале і лічыліся надзейнымі і непатрабавальнымі. Іх пасевам пачыналіся сельскагаспадарчыя работы, іх зборам яны і заканчваліся. Гарбузамі кармілі хатнюю жывёлу, з іх варылі смачныя духмяныя кашы, у працяглыя зімовыя вечары ласаваліся семкамі.

- Навукоўцы пры даследаванні зярнятак гарбуза і сланечніка, заўважылі, што ні ў адной расліне няма больш такога складу вітамінаў, амінакіслотаў і іншых рэчываў, якія так неабходны чалавеку.
- 100 грамаў сырых ачышчаных гарбузовых зярнятак, з'едзеных на пусты страўнік тры дні запар, цудоўна дапамагаюць дзецям пазбавіцца ад глістоў.
- Гарбузы выкарыстоўвалі пры захворваннях печані і нырак, а таксама пры падагры.
- Кожная гаспадыня ведала, што «гарбузы садзяць, калі поўня, каб былі поўныя».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Аб'ява на агароджы платнага пляжа: «Пляж працуе з 8.00 да 20.00. З 20.00 да 8.00 уздоўж пабярэжжа працуе акула».

☺

— Як вы ў сям'і адзначаеце дні нараджэння?

— Ды вельмі проста. Дзень нараджэння жонкі — у рэстаране, а мой — чырвоным алоўкам у календары.

☺

Супрацоўнік, які не п'е, — кашмар для працадаўцы. Яго нават выгнаць няма за што...

☺

— Плаціце падатак на раскошу!
— Ды якая ў мяне раскоша!
— Раскоша — жыць без цешчы!

☺

Прыехаў мужык з камандзіроўкі і адразу да шафы. Нікога. Пад ложак — нікога. Уздыхнуў і кажа:

— Ну вось! Нават выпіць няма з кім!

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.57	18.34	12.37
Віцебск —	5.46	18.24	12.38
Магілёў —	5.48	18.24	12.36
Гомель —	5.45	18.20	12.35
Брэст —	6.12	18.49	12.37
Гродна —	6.14	18.49	12.35

Месяц

Маладзік.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Хрысціны, Аляксандра, Нікіфара.*
К. *Ларысы, Маргарыты, Фелікса, Цімафея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Дзве даты

26 сакавіка

1801 год — нарадзіўся Канут Іванавіч Русецкі, беларускі мастак, педагог. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, у акадэміях мастацтваў у Парыжы і Рыме. Прадстаўнік класіцызму. Творчасць цесна звязана з мастацкім жыццём тагачаснай Беларусі. Пісаў партрэты, пейзажы. Сярод работ: «Італьянец, які ўсміхаецца», «Жныя», «Вербная нядзеля». Аўтар серыі пейзажаў Белавежскай пушчы і ваколіц Навагрудка і Ашмянаў.

1848 год — расійскі імператар Мікалай I выдаў маніфест «Расія, бастыён Еўропы, не паддаецца рэвалюцыйнаму ўплыву».

Цытата дня:

«Старасць — гэта дурная звычка, якую не паспяваюць набыць дзелавыя людзі».

Андрэ Маруа (1885—1967), французскі пісьменнік.

Шчыра і сардэчна віншуем дарагую **Марыю Цімафееўну КОРАНЬ** з в. Грабянец Чэрвеньскага раёна **з юбілеем**!

70

Зычым моцнага здароўя, сонечных ранкаў і зорных начэй, аптымізму. Заставайся заўсёды такой жа бадзёрай і добрай да людзей, жыві ў павазе, радасці і з добрай надзеяй.

Жадаем шчасця, здароўя без лекаў,
Дабра і спакою, і доўгага веку.
Няхай абмінаюць бяда і трывога,
Ды стомы не чуй ад жыццёвай дарогі.

Сястра Валянціна з сям'ёй і ўсе родныя.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 **№ 8 (297)**

Ядомая клумба

Многім дачнікам, якія маюць шэсць ці крышачку больш сотак, хочацца, каб вакол было ўсё прыгожа, каб тое, што расце на градках, цешыла не толькі страўнік, але і вока. Выйсце ў такім выпадку знайсці можна, абуладкаваўшы «ядомую» клумбу. І тады старанна падрыхтаваная і вырашчаная агародніна будзе прыносіць карысць і стваряць добры настой. Прапануюцца два варыянты такіх клумб.

Варыянт І. Пажадана стварыць клумбу так, каб яе было відаць з усіх бакоў. Як толькі растане снег, у цэнтры клумбы рана вясной пасеяць агурочную траву — **барага**. Гэта культура холадаўстойлівая, хутка расце, а маладзенькія лісцікі — пахнуць агурком. Яна прыдатная для салатаў, пакуль яшчэ няма сапраўдных агурочкаў. У сярэдзіне лета расліна зацвіце нябесна-блакітнымі кветкамі дзіўнай прыгажосці.

Ад цэнтра клумбы добра будзе, нібы праменчыкі, пасеяць рознакаляровыя салаты. Пры прараэджванні іх заўсёды будзе свежае зеляніва да стала, а калі адлегласць паміж суседнімі раслінамі стане 25—30 см, лепш выкарыстаць у ежу асобныя лісцікі. Салату можна падсеяць яшчэ і летам, каб як мага даўжэй захаваць дэкаратыўнасць клумбы. Асабліва эфектна выглядаюць чырвоныя салаты — **Лола Роса, Рэд Сэлд Боўл**, а таксама зялёныя — **Дубочак, Адэская кучаравая** і інш. Наступны рад ад цэнтра пасля барага можна заняць агароднінай **хрызантэмай**. Культура таксама холадаўстойлівая, маладыя раслінкі цалкам ідуць у ежу, са старых кустоў можна выкарыстаць лісцікі і маладзенькія парасткі. У хрызантэмы незвычайны водар і яна служыць цудоўнай дабаўкай да салатаў. Да сярэдзіны лета расліны расцвітуць яркімі жоўта-белымі рамонкамі, якія выдатна спалучаюцца з блакітнымі кветкамі барага.

Побач з хрызантэмай пажадана пасадзіць базілік. Праўда, яго давядзецца вырасціць расадай, таму што расліна баіцца замаразкаў. Лепш выкарыстоўваць гатункі з фіялетавай афарбоўкай лістоў, якія выдатна выглядаюць на фоне шэра-зялёных лістоў хрызантэмы. Базілік можна выкарыстаць для салатаў і пры прыгатаванні мясных страў. Тут жа можна пасеяць чабер, цёмна-зялёныя лісцікі і бэзава-ружовыя кветкі якога будуць таксама добра выглядаць з агароднінай хрызантэмай. Выкарыстоўваюць яго пры прыгатаванні мясных, рыбных і страў з агародніны, асабліва з фасоллю. Прычым, неабходна пакласці ў страву ўсяго адну-дзве галінкі, якія пры падачы на стол вымаюць. На ўвесь сезон дастаткова чатырох—пяці раслін, таму ў наступным сектары побач з хрызантэмай можна пасеяць духмяны **змеегалоўнік малдаўскі**. Гэта расліна холадаўстойлівая, сеюць яе ў канцы красавіка. Лісты змеегалоўніка маюць прыемны мятна-лімонны пах, іх можна дабаўляць у чай, кампот, варэнне, свежыя салаты, а таксама сушыць на зіму. Нарэшце, на клумбе можна пасеяць познеспелыя гатункі **морквы**, бацвінне якой стварае дэкаратыўнасць да самай уборкі. Побач з морквай добра будзе сябе адчуваць **шалфей** — мускатны альбо серабрысты. Яго серабрыстыя лісты служаць выдатным фонам для цёмна-зялёнай морквы, а пах шалфея адганяе маркоўную муху. Прыгожа выглядае на клумбе і **пятрушка**, асабліва кучаравая. Яе высяваюць непасрэдна ў грунт, і да самых замаразкаў культура не губляе сваёй дэкаратыўнасці. У якасці яркай плямы можна пасадзіць некалькі кусцікаў **настуркі**, яе маладыя лісцікі дабаўляюць у салаты. Побач размясціць **каляндулу** (наготкі). І хоць яе не ўжываюць у ежу, затое яна доўга цвіце і адганяе шкоднікаў ад суседніх раслін, да таго ж каляндула — незаменны лекар. А акаляць нашу клумбу будзе бардзюр са шматгадовай **шніт-цыбулі** розных гатункаў. Гэтыя расліны холадаўстойлівыя, зімуюць без укрыцця, і вясной яны адрастаюць вельмі рана, таму да 1 мая сакавітае зеляніва будзе дарэчы. Цвіце цыбуля розных гатункаў вельмі прыгожа, а пры спрыяльных умовах у жніўні можа зацвісці другі раз. У адрозненне ад многіх іншых відаў цыбулі, у гэтай лісты застаюцца зялёнымі да самых замаразкаў. Менавіта гэтыя віды цыбулі не патрабуюць амаль ніякага догляду. Неабходна іх праполваць, а праз тры—пяць гадоў дзяліць кусты.

Пасадзіце мурайю для прыгажосці і карысці

Мурайя — гэта шматгадовы вечназялёны куст, які адносіцца да сям'і цытрусавых. У сябе на радзіме, у вільготных тропіках Індыі, Індакітая, дасягае вышыні 4 м. Мурайя даволі рэдкая з'ява ў кветаводаў. У хатніх умовах разводзяць мурайю мяцельчатую. Гэты від дасягае вышыні 1,5 м, мае невялічкія цёмна-зялёныя бліскучыя лісты. Кветкі невялікія, беласнежныя, духмяныя, размешчаны па адной, радзей складаюць невялікія суквецці. Плод ягадападобны, чырвонага колеру, яго можна есці. Вялікая колькасць пладоў утвараецца пры штучным апыленні. Для гэтага пэндзлікам пылок з адной кветкі пераносяць на іншую. Бліскучыя круглыя плады-шарыкі яркачырвонага колеру надаюць расліне прыгожы выгляд на працягу больш чым паўгода.

Мурайя — даволі цеплалюбівая расліна, таму тэмпература там, дзе яна вырошчваецца, павінна быць каля 20 градусаў, зімой можа мірыцца з тэмпературай 17 градусаў. Пры ўтрыманні яе ў больш халодных умовах у расліны ападаюць бутоны, кветкі, завязі і лісты. Такое ж адбываецца ў зімовы перыяд пры нізкай вільготнасці паветра і недастатковым асвятленні, а таксама пры парушэнні рэжыму паліву (перасушванне ці лішак вільгаці). На працягу ўсяго года расліне патрэбна вільготнае паветра, таму пажадана штодзённа апырскваць яе цёплай вадой.

Дарослую расліну перасаджваюць кожны год вясной, у сумесь ліставой, дзярновай зямлі, перагною і пяску (2:2:1:1). Паліваюць па меры падсыхання верхняга слою глебы. Падкормліваць трэба на працягу ўсяго года. Зімой канцэнтрацыю ўгнаенняў, якія ўносяцца, змяншаюць удвая. Раз у месяц паліваюць слабым растворам мікраэлементаў.

Мурайю пажадана абразаць. Стрыжкай можна надаць любую форму. Вясной прышчыкаюць найбольш моцныя парасткі, каб даць магчымасць набраць сілу слабым галінкам. Размнажаецца і насеннем, і чаранкамі. Насенне ў глебу засыпаецца на глыбіню 1 см. Сеянцы рассаджваюць праз 2 месяцы па адным у невялікія вазончыкі. Чаранкі нарыхтоўваюць таксама вясной. Зрэз чаранка робяць пад пупышкай. Перад пасадкай усе лісты ўкарочваюць напалову, каб абмежаваць выпарэнне вільгаці. Пры пасадцы чаранкі заглыбляюць на 1,5 см у пясок або іншы субстрат. Затым накрываюць поліэтыленавым пакетам ці празрыстым слоікам. Праз 2 месяцы ўтвараюцца карані, а яшчэ праз 2 месяцы іх перасаджваюць у вазончыкі.

Мурайя славіцца не толькі дэкаратыўнымі якасцямі, але і біялагічна актыўнымі рэчывамі. Калі пажаваць ягаду, то адразу адчуваецца бадзёрасць і прыліў сіл. У пладах ёсць рэчывы, якія ўмацоўваюць сценкі крывяносных сасудаў. Адварам з лістоў лечаць горла (5 лісцікаў на 1 шклянку кіпеню), водар кветак актывізуе дыханне і паляпшае сон.

Наш чытач П.М. Аверчанкаў з Верхнядзвінска вырошчвае пакаёвую мурайю і хацеў бы мець стасункі з тым, хто таксама вырошчвае гэту расліну. Яго каардынаты ў вядучай рубрыкі.

Дачныя падказкі

- У халоднай глебе дрэнна працуюць мікраарганізмы, якія забяспечваюць расліны азотам, таму ранняй вясной карысныя падкормкі мінеральнымі ўгнаеннямі. Асабліва важна ў гэты час падкарміць веснавыя цыбульныя кветкі і кусты. Лепш выбіраць угнаенні, якія хутка растваряюцца, яны з талай вадой лёгка дасягаюць каранёў раслін. Напрыклад, можна ўзяць аміячную ці кальцыевую салетру альбо комплекснае ўгнаенне з мікраэлементамі.
- **Для прарошчвання бульбы яе раскладваюць у адзін слой, прычым так, каб уверх былі павернуты тыя бакі клубняў, на якіх больш за ўсё вочак.**

- На пясчаных глебах пасадкі бульбы трэба мульчыраваць. Пасля другога акучвання кусты абкладаюць травой, выпалатай разам з пустазеллем (без насення).
- **Чорныя парэчкі можна размнажаць у бутэльках. Для гэтага ў перыяд выспявання ягад з найбольш ураджайных гатункаў зразаюць парасткі, наразаюць іх на чаранкі даўжынёй 25—40 см і ставяць на ўкараненне ў цёмныя бутэлькі. Пасля ўтварэння добрай каранёвай сістэмы чаранкі высаджваюць у зямлю.**
- Яблыню і вішню ў садзе высаджваюць як мага далей адна ад другой. Карэнні гэтых раслін дзейнічаюць прыгнятальна адна на адну.
- **Цюльпаны добра выглядаюць у кампазіцыі з незабудкамі.**
- Аднагадовыя віды маку можна высяваць з растэрміноўкай, тады расліны будуць цвісці ўсё лета.
- **Лубін эфектна выглядае ў змешаных пасадках разам з касачамі, лілеямі, хостамі.**
- Каб дапамагчы садовым суніцам добра прыжыцца, можна зрабіць баўтушку з сумесі гліны і каравяку. Каравяк і гліну змешваюць у роўных частках, робяць сумесь смятанападобнай і ў яе акунаюць перад пасадкай карані суніц садовых. Асабліва карысна рабіць гэта на пясчаных глебах, якія дрэнна ўтрымліваюць вільгаць.
- **Календулу спецыялісты рэкамендуюць падсяваць да асноўнай агароднінай культуры ў якасці прафілактычнага сродку супраць каранёвых гніляў, фузарыёзных захворванняў і кляшчоў.**
- Супраць мучністай расы на агрэсце прымяняюць кальцыніраваную соду (50 г на 10 л) з дабаўленнем 50 г мыла. Можна прымяняць і каравяк, разведзены з вадой у суадносінах 1:3. Апрацоўку пры неабходнасці праводзяць праз тыдзень.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1616. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12